№ 4 (506) 2 лютага 2007

www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

ISSN 1819-1614

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Фонд выданьня газэты «Наша Ніва». Выходзіць штотыднёва, у пятніцы

**Як робяцца тыя выбары**

Анатомія элегантных перамог. Піша Юрась Бусел. **Старонка 4.**

**Нафта вярнулася да старых цэнаў**

Нафтавыя кампаніі прымусілі падзяліцца зь Беларусьсю прыбыткамі. **Старонка 10.**

**БНФ сказаў Мілінкевічу «Бывай»**

АГП і левыя тое зрабілі яшчэ раней. Мілінкевіч партыйным лідэрам: «Дыктатуру без адзінага лідэра ніхто яшчэ не перамагаў». **Старонка 11.**

**Беларускі дом ля Вострай брамы**

У аўторак у Вільні адчыніўся Беларускі дом правоў чалавека. **Старонка 12.**

**Чаго ня (ні) зробіш дзеля літаратуры**

Алесь Аркуш прапанаваў дзесяці паэткам зьняцца для часопісу «Калосьсе» аголенымі. **Старонка 19.**

**Гісторыя беларускіх грошай**

Роўна 300 гадоў таму была адбітая апошняя манэта Вялікага Княства Літоўскага. Гутарка са Зьмітром Гулецкім. **Старонка 34.**

**Газэтка дзеткам**

**Старонка 44.**

# У пекле Азіі



PHOTO.BYMEDIA.NET

Рэпартаж Аляксея Лявончыка з Аўганістану і Ірану. Старонка 27.


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# Грамніцы

Грамніцы — палавіна зіміцы. 2 лютага — каталіцкія, 15–га — праваслаўныя Грамніцы.

## Хельсынскаму камітэту вярнулі офіс

Беларускаму Хельсынскаму камітэту яшчэ на год падоўжылі дамову на арэнду памяшканьня на вуліцы Лібнэхта, 68. Гэта стала магчымым пасьля таго, як старшыня БХК Тацяна Працька ў сераду сустрэлася з прадстаўніком галоўнага гаспадарчага ўпраўленьня кіраўніцтва справаў прэзыдэнта Міхаілам Бяляевым. Раней БХК быў вымушаны пакінуць офісны будынак, цяпер чакаецца вяртаньне праваабаронцаў у старыя сьцены.

Аглядальнікі ставяць гэты крок у адзін шэраг з адступленьнем уладаў перад галадоўкамі пратэстантаў і каталікоў, забастоўкамі рабочых, якім не выплачвалі заробкі. Таксама адзначаецца, што Эўропа і ЗША выступілі з рэзкай крытыкай рашэньня пра высяленьне апошняй легальнай праваабарончай арганізацыі, якая дзейнічала на нацыянальным узроўні.

«Наша Ніва» такой ласкі ўладаў пакуль не дачакалася.

**Зьміцер Панкавец**

## У нумары

### люстра дзён

Як робяцца выбары ... 4
«Галасы ў Сухараве ніхто толкам не лічыў» ... 7
Зьміцер Бабіцкі: «На мне сыстэма дала збой» ... 8
Нафта для Беларусі вярнулася да старых цэнаў ... 10
Масква распачала цкаваньне Лукашэнкі ... 10
Партыя БНФ кажа Мілінкевічу «бывай» ... 11
Беларускі дом ля Вострай брамы ... 12
Вайтовіч заснаваў чарговы рух ... 12
«А паперадзе калёны, абняўшыся, ідуць Паўлічэнка і Бандарэнка» ... 13
Упершыню за пяць гадоў вырасла стаўка рэфінансаваньня ... 14
Сёлета заробкі расьці ня будуць ... 14
Аргкамітэт па адзначэньні Дня Волі ... 14
КДБ раскрыў татальную карупцыю ў гандлі лесам ... 14
Мілінкевіча палохаюць забаронай на выезд ... 14
Лукашэнка ўзнагародзіў кіраўніка банкаў «Райфайзэн» ... 14
Расейскія тэлеканалы паказалі кадры са «Звычайнага прэзыдэнта» ... 14
Расейцы пусьцяць нафту міма Беларусі ... 14
Цэны на жыльлё імкліва растуць ... 15
Хроніка ... 22

### камэнтары

Барыс Тумар. На здароўе ... 11
Віталь Тарас. Кветкі для правадыра ... 16
Павал Севярынец. Сабачае шчасьце ... 22

### аб усім патроху

Чаго ня (ні) зробіш дзеля літаратуры ... 19

### комікс

Бульбман і бульбаход ... 24

### мы самі

Дзякуй за ахвяраваньні ... 25

### культура

Радавы Лябёдушкін стаў дзяўчынай ... 39
Кнігі самай беларускамоўнай супрацоўніцы Нацбібліятэкі і самага габрэйскага беларускага пісьменьніка ... 39
Для тых, хто не прызнае афіцыйны погляд на гісторыю ... 39
Дні габрэйскай кнігі і фатаграфіі ... 40
Фэстываль праваслаўных сьпеваў ... 40

### газэтка дзеткам

Як Дзед Мароз новае сьвята прыдумаў ... 44

## ДЗЕ ВАРТА БЫЦЬ

### Дзень сьвятога Канстанціна

13 лютага ў Доме літаратара а 19:00 адбудзецца літаратурна-музычная імпрэза «Дзень сьвятога Валянціна». Арганізатарам вечарыны выступіла Партыя БНФ. Нагода для вечарыны трайная: выхад новага альбому Сержука Сокалава-Воюша «Песьні лісоўчыкаў», дзень нараджэньня Кастуся Каліноўскага (2 лютага), а таксама Дзень сьвятога Валянціна (14 лютага). Адсюль такая назва. Усе выступоўцы, тым ці іншым чынам, павінны ўзгадаць імя Кастуся Каліноўскага. На імпрэзе плянуецца ўдзел барда Зьмітра Бартосіка, пісьменьнікаў Уладзімера Арлова, паэта Анатоля Івашчанкі ды іншых творцаў. Уваход вольны.

**ЗП**

пытайцеся ў распаўсюднікаў новы нумар




ПАДПІСНЫ ІНДЭКС 00345

# Як робяцца выбары

Гісторыя аднаго ўчастку. Піша **Юрась Бусел**.

Быць назіральнікам на выбарах у Беларусі — цалкам няўдзячная справа. Першапачатковай мэтай такога палітычнага назіраньня ёсьць адсочваньне дэмакратычнага працэсу выбараў, недапушчэньне парушэньняў з боку чальцоў выбарчай камісіі ды магчымасьць ад самага пачатку (запячатваньне скрынак для галасаваньня) да самага канца (падлік галасоў) назіраць працэс выяўленьня волі народу. А насамрэч адбываецца наступнае: бавіш на ўчастку для галасаваньня цэлы дзень амаль безвынікова. Кажу «амаль», бо галоўным вынікам назіраньня за выбарамі ў Беларусі (а ў дадзеным выпадку — за так званымі выбарамі ў мясцовыя саветы дэпутатаў XXV скліканьня) ёсьць чарговая магчымасьць упэўніцца ў адсутнасьці інстытуту выбараў, а як наступства — дэмакратыі ў Беларусі.

## Аднадзённы прыступ мабільнасьці

Адразу хацелася б адзначыць, што ад самага пачатку назіраньне за выбарамі ў адпаведнасьці з прыстасаваным да патрэбаў сёньняшняй улады заканадаўствам губляе ўсялякі сэнс, бо ў Беларусі выбары адбываюцца не ў адзін дзень, як тое належыць, а расьцягваюцца ажно на шэсьць. Чыноўнікі сьцьвярджаюць, што інстытут датэрміновага галасаваньня існуе шмат у якіх дэмакратычных краінах. Ды толькі гэтыя «дасьведчаныя» асобы забываюць адзначыць, колькі грамадзян тае ці іншае краіны ў выніку галасуюць датэрмінова: звычайна гэта 1—2 адсоткі выбаршчыкаў, якія НАСАМРЭЧ нязьдольныя прыйсьці на выбарчы ўчастак у дзень галасаваньня і скарыстаць сваё грамадзянскае права.

Нават у таталітарным СССР, каб прагаласаваць датэрмінова, трэ’ было сабраць стос папераў і абгрунтаваць прычыну сваёй немагчымасьці прыйсьці на ўчастак непасрэдна ў дзень выбараў.

У Беларусі гэтая лічба вось ужо колькі год на самых розных выбарчых кампаніях вагаецца ад 20 да 40 адсоткаў па розных абласьцях краіны (і гэта паводле афіцыйных зьвестак!). Адкажыце сабе толькі на адно пытаньне: «Куды трацiна беларусаў заўсёды зьяжджае ў дзень выбараў, што яны ня маюць магчымасьці наведаць свой участак менавіта тады?» — і вы адразу зразумееце, што такое сёньня дэмакратыя па-беларуску.

Нават у сёньняшнім антыдэмакратычным Выбарчым кодэксе прапісана (арт.53): «Выбаршчык, удзельнік рэфэрэндуму, які **ня мае магчымасьці ў дзень выбараў**, рэфэрэндуму знаходзіцца па месцы жыхарства, **мае права** не раней за 5 дзён да выбараў, рэфэрэндуму **ва ўмовах, якія выключаюць кантроль за ягоным волевыяўленьнем**, запоўніць у памяшканьні ўчастковай камісіі бюлетэнь і апусьціць яго ў скрыню для галасаваньня **выбаршчыкаў**, удзельнікаў рэфэрэндуму, **якія будуць адсутнічаць у дзень выбараў**, рэфэрэндуму **па месцы жыхарства**».

Выходзіць, кожны раз у дзень выбараў каля двух-трох мільёнаў чалавек па ўсёй краіне зьяжджае зь месца свайго жыхарства. А як патлумачыць датэрміновае галасаваньне (у першы ж дзень «датэрміноўшчыны»!) цэлых вайсковых частак і фармаваньняў: хіба салдаты таксама ў дзень выбараў пакідаюць свае казармы і кудысь мігруюць? Неверагодны аднадзённы прыступ мабільнасьці...

## «Навошта вам гэта?»

На гэты раз мне «пашчасьціла» назіраць выяўленьне волі маіх суседзяў — жыхароў 6-га мікраёну гораду Маладэчна па Крынічнай выбарчай акрузе №18. Ад самага ранку актыўнасьць грамадзян была адносна невысокая. Гэта і зразумела: каму ж хочацца ў выходны дзень а 8-й раніцы валачыся на той участак?! Для мяне гэта сталася добрай магчымасьцю пагутарыць са старшынёй выбарчай камісіі і, як раілі старажылы назіральніцкае справы, «усталяваць зь ёю сяброўскія адносіны». Найперш мяне як назіральніка цікавіла: 1. Агульная колькасьць выбаршчыкаў на ўчастку. 2. Колькасьць бюлетэняў для галасаваньня, атрыманых камісіяй. 3. Колькасьць грамадзян, якія датэрмінова прагаласавалі на гэтым участку. 4. Колькасьць выбаршчыкаў, якія зьвярнуліся з просьбай прагаласаваць па месцы жыхарства.

Здавалася б, што таемнага ў адказах на тыя цалкам законныя пытаньні? Але адказы на іх былі прыкладна наступнымі: 1. «Гэтай лічбы я назваць не магу...» 2. «Колькасьць бюлетэняў *дастатковая*. Выдаю чальцам выбарчай камісіі *па меры неабходнасьці*...» 3. «А навошта вам? Гэтыя лічбы вы атрымаеце ў выніковым пратаколе...» 4. «Не магу назваць дакладна: гэтая лічба ўвесь час мяняецца...»

Вось так для мяне пачаліся гульні ў выбары ў той дзень. Дарэчы, пытаньне «А навошта вам гэта?» гучала кожны раз, як назіральнікі зьвярталіся да старшыні ці сакратара камісіі.

Паводле закону, назіральнік мае права (арт.13 ВКРБ) «атрымоўваць інфармацыю пра вынікі падліку галасоў і складаньні пратаколаў». На жаль, Выбарчы кодэкс не тлумачыць непасрэднай працэдуры «атрыманьня інфармацыі» назіральнікамі. Ды колькі дэмакратычныя сілы ня біліся (у тым ліку дэмакратычныя дэпутаты Нацыянальнага сходу Фралоў, Скрабец ды Парфяновіч), зьмяненьні ў Выбарчае заканадаўства ўнесеныя не былі.

І чарговы раз, цяпер са старонак незалежнае прэсы, пытаю: а што сакрэтнага ў той інфармацыі, якую просяць назваць назіральнікі? Калі ўсё адкрыта, дэмакратычна, законна і сумленна, чаму хаваецца інфармацыя?

## Мэтад «прастаўленьня палачак»

...На працягу дня галасаваньня былі заўважаныя парушэньні заканадаўства, але адносна невялікія: выбаршчыкі ўдвох заходзілі ў кабінкі для галасаваньня (звычайна мужык і жонка), але амаль кожны раз іх папярэджвалі чальцы камісіі; некалькі чалавек рабілі свой выбар не ў кабінках для галасаваньня; кандыдат ад улады (юрыст райвыканкаму, сп.Зубрыцкі) некалькі разоў зьяўляўся на ўчастку, што можа быць расцэнена як агітацыя ў дзень выбараў, асабліва ўлічваючы той факт, што ён не галасаваў па гэтай акрузе, бо не прапісаны там. Таксама цікавы той факт, што ў бюлетэнізоры (прыклад для тых, хто сам ня можа ўцяміць, дзе паставіць «галач-

**Працяг на старонцы 6.**




КАРЭН АКОПАЎ

Падлік галасоў у Сухараўскай акрузе.

Працяг са старонкі 4.

ку»), той самы знак («V») стаяў насупраць прозьвішча спадара Зубрыцкага. Адзінае, што заставалася назіральнікам рабіць 14 студзеня, гэта пісаць заявы і пратаколы (у першую чаргу на адмову старшыні камісіі даць дадзеныя па датэрміновым галасаваньні) ды бесьперапынна, на працягу 12 гадзін, лічыць колькасьць людзей, якія прагаласавалі на іх вачах.

Вось так і сядзелі назіральнікі, прастаўляючы на асобным аркушы паперы палачку за палачкай у радок кожны раз, як выбаршчык кіне запоўнены бюлетэнь у скрыню. «Глупства!» — скажаце вы. Але гэта адзіная магчымасьць для назіральнікаў падлічыць колькасьць тых, хто галасаваў у дзень выбараў 14 чысла і як вынік — датэрмінова. Хоць у прыватнай гутарцы старшыня камісіі ўсё ж такі выдала лічбу — 27,5%. Аднак нават пры такой лічбе, паводле падлікаў назіральнікаў (зыходзячы з мэтоды «прастаўленьня палачак»), лічба «датэрміноўшчыны» ў паўтара разы вышэйшая за названую.

Трэба таксама адзначыць, што разам зь незалежнымі назіральнікамі — пераважна даверанымі асобамі кандыдатаў у дэпутаты (у нашым выпадку дакладней гаварыць пра кандыдата ў адзіночным ліку, бо па ўсім Маладачанскім раёне, а гэта 40 акругаў, ці каля 110 тыс. выбаршчыкаў, балятавалася толькі адна прадстаўніца супольнасьці «За Маладэчна» і руху «За свабоду» Найдзіч Марына) — на некаторых участках у якасьці назіральнікаў знаходзіліся прадстаўнікі райвыканкаму. Але акрамя таго, як чыніць перашкоды незалежным назіральнікам, яны нічога не рабілі.

Былі выпадкі, калі некаторыя выбаршчыкі спрабавалі выйсьці зь бюлетэнем з участку, каб на першым паверсе паглядзець інфармацыю на стэндзе пра кандыдатаў у дэпутаты. (А што рабіць, калі ўсю інфармацыю пра кандыдатаў прыбралі ня толькі непасрэдна з участку для галасаваньня, але нават з другога паверху школы, дзе той месьціўся?..) Але ж пільныя чальцы камісіі не давалі такім палітычна неадукаваным грамадзянам вынесьці бюлетэнь з участку, хоць бы і на некалькі хвілінаў. Адзін раз за маладой дзяўчынай пабег міліцыянт і вярнуў яе да скрыні для галасаваньня... А з актавай залі даносіўся галасок маленькай дзяўчынкі, якая сьпявала вельмі вясёлую песеньку:

Моя армия самая сильная,
Моя армия самая смелая,
Моя армия самая добрая,
Моя армия самая-самая...

## Простая арытмэтыка часу

Наступіў час падліку галасоў (не перашкодзіла б і тут дадаць прыкмету «так званага» да слова «падліку»). Сталы, куды скідалі ўсе бюлетэні, адсунулі ад месца, дзе знаходзіліся назіральнікі, на 10 мэтраў, не дазваляючы назіральнікам набліжацца да чальцоў выбарчай камісіі: маўляў, перашкаджаеце працэсу падліку галасоў. Пры спробе зьняць частку працэсу падліку галасоў на відэакамэру мабільнага тэлефона назіральніца ад райвыканкаму паскардзілася старшыні камісіі на дзейнасьць «оппозиционных наблюдателей». Старшыня на працягу 20 хвілінаў пагражала выклікаць ахову, выставіць «неугодных» назіральнікаў за перашкоду падліку, тэлефанавала ў «вышэйшыя інстанцыі»: аргумэнтацыяй было тое, што ў выбарчым Кодэксе не напісана, што назіральнікам дазваляецца карыстацца відэа- і фотапрыстасаваньнямі. Але ж, паважаная спн.Кокаш, там не напісана і адваротнага.

Усе заўвагі на працягу падліку галасоў сыходзілі толькі ад старшыні выбарчай камісіі спн.Кокаш: больш ніхто з шараговых чальцоў камісіі не выказваў аніякага незадавальненьня дзеяньнямі назіральнікаў. На маё пытаньне: «Каму яшчэ, акрамя старшыні камісіі, я перашкаджаю падлічваць галасы?» чальцы выбарчай камісіі — усе дарослыя людзі, паважаныя настаўнікі — апусьцілі вочы долу... Пра тое, што ніхто не выказваў таксама і абурэньня наконт паводзінаў старшыні камісіі, думаю, гаварыць ня трэба. Дзякуй, як кажуць, і на гэтым.

Падлік галасоў зацягнуўся на чатыры гадзіны (з восьмай да пачатку на першую) зь невядомых прычынаў. За гэты час старшыня камісіі пасьпела прафіляктычна выклікаць міліцыянтаў (зайшоў нейкі паважны, афіцэрскага званьня дзядзька і спытаў, ці ўсё праходзіць спакойна і ці няма перашкодаў для «нармальнае працы»), разоў дзесяць правесьці тэлефонныя перамовы невядома з кім; увесь час па некалькі разоў пералічвалі бюлетэні, было чуваць пра нейкія несупадзеньні ў падліку... За той самы час прадстаўнік дэмакратычнае супольнасьці, які таксама быў назіральнікам, толькі на ўчастку ў Менску, пасьпеў: а) адбыць увесь час падліку галасоў на сваім участку ў Менску; б) атрымаць некалькі папярэджаньняў за «перашкоду працэсу падліку галасоў» (гэта пры жаданьні на свае ўласныя вочы а не з-за сьпінаў чальцоў камісіі, назіраць увесь «працэсс»); в) дачакацца афіцыйнага пратаколу; г) прыехаць за 80 кілямэтраў у Маладэчна, каб падтрымаць Марыну Найдзіч, ды д) паўгадзіны правесьці ў нашым горадзе.

Дарэчы, на пытаньне: «Чаму так доўга і марудна ідзе падлік галасоў, і ў чым прычына зацягваньня працэсу?» мы, назіральнікі, адказу не атрымалі. І гэта чарговы раз дае падставу думаць, што ня ўсё на гэтых выбарах, а ў прыватнасьці па гэтай акрузе, на гэтым участку было «чыста». Толькі на пачатку новага дня, ужо 15 студзеня а 00:10, пратакол быў вывешаны для ўсеагульнага карыстаньня, як тое мае быць у адпаведнасьці з заканадаўствам. А ў пратаколе лічбы кажуць самі за сябе: адразу відавочна, зь якіх лічбавых крыніцаў таму ці іншаму кандыдату можна было «зьліць» галасы (**гл. табліцу**).

Магчыма, і «зьліваць» нічога было не патрэбна: у запасе ж было пяць дзён «датэрміноўшчыны»! А ў прыведзенай табліцы асабліва выклікае зьдзіўленьне лічба «170» — несапраўдныя бюлетэні. Гэта пры тым, што ў сярэднім (паводле зьвестак, прыведзеных раённай выбарчай камісіяй) на 40 участках колькасьць несапраўдных бюлетэняў склала 60,1 штук. А розьніца паміж дэмакратычным

| Назоў і нумар акругі | Прозьвішча кандыдата | Колькасьць выбаршчыкаў, улучаных у сьпісы | Прынялі ўдзел у выбарах | Галасавалі | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | За | Супраць | Несапраўдныя |
| Крынічны №18 | Зубрыцкі С.У. | 2913 | 2197 | 871 | Супраць усіх 361 | 170 |
| | Найдзіч М.А. | | | 795 | | |

кандыдатам і кандыдатам ад улады склала 76 галасоў, ці (калі браць за базу колькасьць выбаршчыкаў, якія прынялі ўдзел у галасаваньні) — 3,4%. Вось і ўся арытмэтыка.

### А як у іх?..

Са мною на ўчастку ў якасьці незалежнага назіральніка знаходзілася жанчына, якой давялося прысутнічаць у якасьці замежнага назіральніка на прэзыдэнцкіх выбарах у Польшчы. Дык там назіральнікаў на кожным участку, бадай, болей, чым сябраў выбарчай камісіі. І стаяць назіральнікі непасрэдна каля стала для падліку галасоў і сочаць за кожным бюлетэнем. Ды пры гэтым усё афіцыйна здымаецца на відэа- і фатастужку. Калі ў кагосьці з прысутных узьнікае нейкі сумнеў у працэсе падліку галасоў, яму прапануюць самому пераглядзець стосы бюлетэняў. Ці ня гэта ёсьць дэмакратыяй? І гэтак адбываецца ня недзе за акіянам, а ў суседняй Польшчы...

Ды толькі гэта гісторыя зусім іншага ўчастку...

# «Галасы ў Сухараве ніхто толкам не лічыў»

Сьведчаць **Алесь Лагвінец** і **Карэн Акопаў**.

Незалежныя кандыдаты Алесь Лагвінец ды Карэн Акопаў балятаваліся ў 27-й Сухараўскай выбарчай акрузе. Іхнымі высілкамі было арганізаванае незалежнае назіраньне за выбарамі, якое ахапіла ўсе 11 выбарчых участкаў. Назіральнікі, сярод якіх быў і сп.Акопаў, адзначалі шматлікія парушэньні выбарчага заканадаўства. Вось толькі найбольш красамоўныя факты, зафіксаваныя падчас мясцовых выбараў у 27-й акрузе.

На пачатку кампаніі колькасьць афіцыйна зарэгістраваных выбарцаў складала 20 808 чалавек. Паводле выніковых пратаколаў гэтая лічба склала 23 228 чалавек. Паказальна, што «прырост» адбыўся за кошт тых участкаў, дзе ад сакавіка мінулага году практычна не адбывалася засяленьне новых дамоў.

Яшчэ ў лістападзе мінулага году сп. Лагвінец зьвяртаў увагу ЦВК, гарвыканкаму ды кіраўніка адміністрацыі Фрунзэнскага раёну на значна заніжаную колькасьць выбарцаў у Фрунзенскім раёне і асабліва ў Сухараўскай акрузе, аднак безвынікова.

Сп.Акопаў мяркуе, што маніпуляцыі зь няўлічанымі выбарцамі маглі шырока практыкавацца падчас апошніх прэзыдэнцкіх выбараў. Пра гэта ўскосна сьведчаць наступныя факты: на некаторых участках агульная колькасьць афіцыйна зарэгістраваных выбарцаў цалкам супадае з колькасьцю грамадзянаў, што прагаласавалі тут на апошніх прэзыдэнцкіх выбарах.

Датэрмінова прагаласавала 45% выбарцаў 27-й акругі (амаль кожны другі выбарца), на 1-м участку — 67 %.

Блытаніна зь лічбамі ў выніковых пратаколах, зафіксаваная назіральнікамі на 9-ці з 11-ці ўчасткаў. Па выніках тых жа пратаколаў, у Сухараўскай акрузе прынялі ўдзел 13166 чалавек, а выкарыстаных бюлетэняў налічылі 12 890 (што таксама адлюстравана ў пратаколах). Такім чынам, няўлічанымі апынуліся 271 голас выбарцаў дадзенай акругі.

На 1-м і 5-м участках чальцы камісіі вусна пры сьведках паведамлялі колькасьць афіцыйна зарэгістраваных выбарцаў. У пратаколах, падпісаных старшынём і чальцамі камісіі, гэтыя лічбы значна розьніліся. Напрыклад, на 5-м участку «вусная» лічба склала 2807 чалавек супраць 2270 «пратакольных» выбарцаў.

За Алеся Лагвінца, паводле афіцыйных зьвестак, прагаласавалі 654 чалавекі, пры тым, што за яго сабралі 951 подпіс.

Амаль на кожным участку колькасьць атрыманых бюлетэняў была меншай за колькасьць зарэгістраваных выбарцаў. На думку незалежных кандыдатаў, улады ад пачатку прагназавалі нізкую яўку грамадзянаў на выбары.

У мясцовым друку амаль не асьвятлялася тэма новай формы бюлетэняў, што, на думку К.Акопава, спрычынілася да зьяўленьня вялікай колькасьці несапраўдных і сапсаваных бюлетэняў.

14 студзеня на свой дзень народзінаў Алесь Лагвінец атрымаў ад калегі ў падарунак выбарчы бюлетэнь з «птушачкай» супраць свайго прозьвішча. Але на тым участку ў выніковым пратаколе зьнікненьне дакумэнту не адзначылі, і колькасьць выдадзеных бюлетэняў «супала» з колькасьцю выцягнутых са скрыні.

У часе гэтых выбараў А.Лагвінцу было вынесенае папярэджаньне за нібыта няправільную аплату выдаткаў на выраб агітацыйных матэрыялаў, хаця ён адмаўляе якія-кольвек парушэньні са свайго боку, бо размова ішла пра ўлёткі руху «За свабоду». За гэта яго маглі зьняць з выбараў. Калі адказнасьць за распаўсюд гэтых улётак узяў на сябе Акопаў, то зь яго запатрабавалі тлумачэньні, але папярэджаньне ня вынесьлі.

Старшыні ўсіх участкаў акругі са спасылкай на закон адмовіліся пісьмова паведаміць пра колькасьць атрыманых бюлетэняў, агульную колькасьць грамадзянаў, унесеных у сьпісы выбарцаў, а таксама лічбы датэрміновага галасаваньня. На 2-м выбарчым участку параілі зьвярнуцца ў вышэйшыя інстанцыі, спаслаўшыся на адсутнасьць такіх паўнамоцтваў. Пры гэтым незалежны кандыдат таксама кіраваўся законам — арт. 34 Канстытуцыі, які гарантуе права на атрыманьне інфармацыі, арт. 13 і 74 Выбарчага кодэксу, якія гарантуюць галоснасьць пры падрыхтоўцы і правядзеньні выбараў і права кандыдатаў у дэпутаты на атрыманьне неабходнай інфармацыі.

Нават нязначная прысутнасьць незалежных назіральнікаў моцна нэрвуе ўлады. Прыклад назіраньня ў 27-й акрузе сьведчыць, што недарэмна. К. Акопаў кажа: «Мала проста ўдзельнічаць у выбарах ды потым паказальна зьняцца». Па яго словах, галоўнай задачай незалежнага грамадзтва фактычна выяўляць сутнасьць улады, якая найбольш яскрава праяўляецца ў часе выбараў. А таму трэба працягваць працу да апошняга.

А. Лагвінец скіраваў у Цэнтарвыбаркам скаргу, аднак там яго перанакіравалі ў тэрытарыяльную ды акруговую камісіі, якія 15 студзеня не працавалі. Паводле закону, на прыём скаргі адводзіцца наступны па выбарах дзень. Цяпер ён рыхтуе адпаведны зварот у пракуратуру.

**Запісаў Сямён Печанко**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# Зьміцер Бабіцкі: На мне сыстэма дала збой

Паводле інфармацыі, якая прайшла адразу пасьля галасаваньня, на выбарах дэпутатаў у барысаўскі гарсавет перамогу атрымаў эканаміст Зьміцер Бабіцкі, але літаральна праз два дні высьветлілася, што па афіцыйных дадзеных на 22 галасы перамог яго канкурэнт. Зьміцер Бабіцкі робіць уражаньне эўрапейскага палітыка. У яго ёсьць праграма, зь якой ён сёлета насуперак усім злыбедам амаль атрымаў перамогу на мясцовых выбарах. Па адукацыі ён чыноўнік, пасьля перамогі дэмакратыі зьбіраецца разьвіваць свой родны Барысаў. Выглядае на тое, што на палітычнай сцэне зьяўляецца яшчэ адна яскравая асоба.

**«Наша Ніва»: Далёка ня ўсе нашы чытачы ведаюць, хто такі Зьміцер Бабіцкі.**

**Зьміцер Бабіцкі:** Я нарадзіўся ў Барысаве ў Старым горадзе. Добра памятаю драўляную хату, у якой жылі ўсе мае продкі з 1930-х гадоў. Потым мы пераехалі ў новы мікрараён. Там я вырас, вучыўся ў першай барысаўскай гімназіі. Пасьля школы паступіў у Эканамічны ўнівэрсытэт. Рыхтаваўся стаць дзяржаўным службоўцам.

Яшчэ падчас вучобы стаў удзельнічаць у грамадзкім жыцьці. Маёй першай акцыяй быў удзел зь сябрам у 1996 г. у камуністычным мітынгу ў Барысаве зь бел-чырвона-белым сьцягам; хадзілі доўга па праспэкце, людзі нас шчыра віталі. Потым прыбегла міліцыя, нашым затрыманьнем тады, здаецца, кіраваў камуніст Капульцэвіч, які цяпер у апазыцыі.

Падчас вучобы я выйграў стыпэндыю імя Сьцяпана Батуры і адзін курс навучаўся ў Варшаўскім унівэрсытэце. Адразу па сканчэньні ўнівэрсытэту паступіў у асьпірантуру на катэдру рэгіянальнага кіраваньня. Рыхтаваў дысэртацыю, прысьвечаную прыватызацыі грамадзкага транспарту. У навуцы мае прыярытэты — рэгіянальнае разьвіцьцё.

Удзельнічаў у напісаньні праграмы рэформаў «Эўрапейскі выбар Беларусі», поруч зь іншымі экспэртамі. Стварылі ў Барысаве і выдалі першую ў краіне стратэгію разьвіцьця рэгіёну. Апошнія тры гады я супрацоўнічаў з дасьледчым цэнтрам Інстытуту прадпрымальніцтва і мэнэджмэнту. Цяпер супрацоўніцтва зь ІПМ часова перарвалася.

**«НН»: Спакусы пайсьці працаваць па спэцыяльнасьці дзяржаўным чыноўнікам ніколі не было?**

**З.Б.:** Не. Калі праходзіў практыку падчас вучобы ў дзяржаўных установах, пабачыў, што гэтая сыстэма гнілая. Разам з тым мяне прыемна ўразіла, што нашы чыноўнікі абсалютна ўсё разумеюць. Няма такога, што ў органах улады сядзяць абмежаваныя людзі, яны нармальна ведаюць замежны досьвед, разумеюць, што ў нас няма самакіраваньня, што ў сыстэме падаткаабкладаньня й фінансаваньня бардак. Чыноўнікі вольна апэруюць падстававымі эканамічнымі катэгорыямі. Сыстэма пабудаваная так, што працаваць там здолее ня кожны.

**«НН»: Чаму ты вырашыў пайсьці сёлета на мясцовыя выбары?**

**ЗБ:** Таму што выбары — гэта момант актывізацыі грамадзтва, момант, калі перад грамадзтвам можна паставіць пытаньне: за каго вы? Людзі

разумеюць, што мясцовыя саветы нічога ня значаць, але была надзея, што будзе магчымасьць правесьці досыць якасную і эфэктыўную агітацыйную кампанію. Мы адназначна дасягнулі гэтай мэты. Апроч усяго, на мне сыстэма дала відавочны збой. Наша група вылучала шасьцёх чалавек, пяць зьняліся з выбараў, я застаўся. Мяне пакінулі, каб мы змаглі адсканаваць сытуацыю, адпрацаваць пэўныя схемы, зрабіць татальнае назіраньне на гэтым участку, пабачыць, што з гэтага можа канкрэтна атрымацца.

**«НН»: Як ты праводзіў сваю перадвыбарчую кампанію?**

**З.Б.:** У Барысаве было пяць сустрэчаў з выбарцамі. На першай сустрэчы ў школе прысутнічаў Мілінкевіч. Настаўнікі вельмі прыязна паставіліся да яго. Маёй канкурэнткай на абласной акрузе выступала былая кіраўнічка мясцовага БРСМ, на якую ў Барысаве ў кадравым пляне робіцца стаўка. Галоўным пунктам маёй агітацыі была праграма «ад дзьвярэй да дзьвярэй». Я і сябры маёй ініцыятыўнай групы абышлі больш за сем тысяч кватэраў. Каб мы не ішлі на выбары, то, магчыма, рэальная яўка магла б скласьці ня больш за 30 %. Многія былі ўражаныя, што кандыдат прыходзіў асабіста да іх у кватэру, і гэта быў стымул ісьці на выбары. Перад самымі выбарамі затрымалі і арыштавалі кіраўніка майго штабу Сержука Салаша. Улады палічылі, што, ліквідаваўшы галаву, цела будзе бязьдзейнае, але яны пралічыліся. Напэўна, мы былі адзінымі ў краіне, хто змог назіральнікамі закрыць цалкам усе ўчасткі для галасаваньня.

**«НН»: Першапачаткова прайшла інфармацыя, што ты перамог, але ўрэшце мандат аддалі прадстаўніку гарадзкой намэнклятуры. Што здарылася?**

**З.Б.:** І свайго абласнога суперніка, і раённага, з афіцыйных зьвестак, я перамагаў толькі на дзьвюх участках, якія акурат трапілі на маю раённую акругу. Назіральнікі, што былі дапушчаныя да падліку галасоў, адзначалі, што я меў амаль удвая большую перавагу над канкурэнтамі. Зьвёўшы ўсе пратаколы, я выйграю на раённай выбарчай акрузе ў дырэктара барысаўскага аўтапарку Шкрэдава на 37 галасоў. Мы ўручную зрабілі копіі пратаколаў, але старшыні камісіяў са зразумелых прычынаў адмовіліся афіцыйна запэўніць тыя пратаколы. Потым мы раскінулі па ўсіх навінавых агенцтвах інфармацыю пра перамогу. У панядзелак я стаў тэлефанаваць і прыяжджаць у раённую выбарчую камісію, але яна некуды зьнікла, не адказваў тэлефон, іх не было ў кабінэце. Усё гэта рабілася, каб я не пасьпеў атрымаць інфармацыю 15 студзеня і ня змог абскардзіць вынікі. Мне далі толькі дзьве лічбы: за Бабіцкага прагаласавала 36,8% выбарцаў, а за Шкрэдава 37,7%. У выніку я прайграю на 22 галасы.

**«НН»: Ці не сымбалічна, што тваім супернікам на выбарах быў начальнік аўтапарку? Ты ж таксама займаўся праблемай грамадзкага транспарту.**

**З.Б.:** Гэта супадзеньне. Мы не рабілі на гэтым нейкай палітычнай кампаніі. Канцэпцыі і лёзунгі маёй перадвыбарчай кампаніі былі скіраваныя на дзьве рэчы: на сацыяльныя аспэкты і на тое, што мы давалі людзям магчымасьць марыць. Была канцэпцыя мары, я казаў людзям, што я маю мару і вы майце мару. Нашы мары падобныя: мы хочам з вамі, каб у Барысаве быў унівэрсытэт, што нашым прадпрыемствам патрэбнае разьвіцьцё, што падаткі мусяць ісьці ня ў Менск, а заставацца ў Барысаве, каб наш горад перастаў займаць першае месца ў краіне па злачыннасьці. Мы хочам зрабіць адбудову старой часткі гораду, людзі ж сапраўды хочуць убачыць Стары горад ня дзе-небудзь у Кракаве, а тут — у Барысаве. І гэта спрацавала.

**«НН»: На якой мове праходзіла твая выбарчая кампанія?**

**З.Б.:** Усё было толькі на беларускай мове. Гэта было маім прынцыповым рашэньнем. Я лічу, што мой посьпех зьвязаны ў тым ліку і з тым, што я вёў кампанію па-беларуску.

**«НН»: Ці зьбіраесься налета балятавацца ў парлямэнт?**

**З.Б.:** Не. Не таму, што мы ня хочам, не таму, што мы лічым іх непатрэбнымі. Мы проста бачым, што людзі ня вераць выбарам. Калі на ўчастку ня будзе нармальнай дэмакратычнай альтэрнатывы, то яўка ніколі не перавысіць 50%. Таксама ёсьць верагоднасьць дыскрэдытацыі сябе ў тым сэнсе, што ты ўжо пяць разоў удзельнічаў у выбарах і заўсёды прайграваў. Людзям не давядзеш, што папраўдзе ты выйграў. У такім разе ты не палітычны лідэр, а — лузэр. У Барысаве ёсьць ужо некалькі такіх чалавек, якія не пераможуць і ў выпадку зьмены ўлады, бо даўно дыскрэдытавалі сябе такім чынам.

**«НН»: Чаму менавіта ў Барысаве ўтварылася такая баяздатная група дэмакратычных кандыдатаў?**

**З.Б.:** Я не люблю містыкі, але Барысаў, як падаецца, горад неспакойны. Горад, дзе людзі здатныя на моцныя пратэсты. Гэта гістарычна ў нас закладзена. Барысаўцы ўдзельнічалі ў Слуцкім збройным чыне, у 1933 г. у горадзе былі выступы, якія скончыліся зачысткамі. І цяпер тое самае: за апошні год у Барысаве людзі без усялякай палітыкі перакрылі чыгунку, а ў другой частцы гораду зрабілі несанкцыянаваны мітынг і патрабавалі адклікаць тамтэйшага дэпутата сельсавету. Гэта вялікая памылка намэнклятуры — так закручваць шрубкі, як гэта робіцца ў Барысаве.

**«НН»: Ці ўважаеш ты сябе цяпер больш за палітыка ці за эканаміста?**

**З.Б.:** Палітыкам я сябе не лічу. Пасьля гэтай кампаніі, можа быць, я буду лякальным лідэрам. Сёньня ў Беларусі на нацыянальным узроўні толькі тры палітыкі — Лукашэнка, Пазьняк і Мілінкевіч. Я толькі пачынаю станавіцца палітыкам.

**«НН»: Што ты як шараговы сябра Партыі БНФ думаеш пра нядаўнія заявы Фронту адносна Мілінкевіча?**

**З.Б.:** Адмоўна стаўлюся. Мілінкевіч на сёньняшні момант адзіны лідэр. Гэта спакойны, нармальны, флегматычны чалавек, які можа ўзначаліць і годна прадстаўляць краіну. Гэта як банэры на сайтах «Прэзыдэнт, якім Вы зможаце ганарыцца». Я не разумею, чаму цяпер ладзіцца Кангрэс. Не разумею, чаму я мушу здаць подпісы для ўдзелу ў Кангрэсе, калі на сваім участку за мяне афіцыйна прагаласавала 3000 чалавек. Хай яны пакажуць, колькі чалавек прагаласавала за іх.

**«НН»: У сьвеце эканомікі ты таксама далёка не апошні чалавек. Некалі прачытаў у СМІ, што ты ўдзельнічаў у прэстыжнай штогадовай сустрэчы амэрыканскіх эканамістаў. Трэба адзначыць, што Нобэляў у эканоміцы за апошнія гады атрымоўваюць выключна амэрыканцы.**

**З.Б.:** Лічыцца добрым густам там зьявіцца. На маёй перадвыбарчай улётцы быў мой здымак зь ляўрэатам Нобэлеўскай прэміі ў галіне эканомікі Робэртам Салоў. Бачыўся зь яшчэ адным ляўрэатам Нобэля Гары Бэкерам. Даводзілася перакідвацца зь імі некалькімі сказамі нават наконт сытуацыі ў Беларусі. Яны ў курсе гэтай сытуацыі.

**Гутарыў Зьміцер Панкавец**

**Зьміцер Бабіцкі**

нарадзіўся ў 1979 у Барысаве. Эканаміст. У 2002 скончыў факультэт мэнэджмэнту БДЭУ па спэцыяльнасьці «дзяржаўнае і муніцыпальнае кіраваньне». Сябар Партыі БНФ. Апошнія тры гады супрацоўнічаў з дасьледчым цэнтрам Інстытуту прыватызацыі і мэнэджмэнту.

# Нафта для Беларусі вярнулася да старых цэнаў

Расейскія нафтавікі абмежавалі свае звышпрыбыткі.

Канцэрн «Белнафтахім» падпісаў дамову аб пастаўках нафты ў Беларусь паводле новай цэнавай формулы, паведамілі інфармацыйныя агенцтвы.

З расейскага боку пагадненьне падпісалі «ЛУКОЙЛ», «ТНК», «Роснефть», «Русснефть». «Сургутнефтегаз» удзелу ў перамовах ня браў. Ён будзе пастаўляць нафту на аснове двухбаковых дамоўленасьцяў.

Новая формула прывязаная да сусьветных цэнаў на нафту з улікам скарачэньня выдаткаў на фрахт і транзыт. У выніку цана паставак нафты ў Беларусь будзе ніжэйшай за сусьветную на $125—130 і складзе на канец студзеня $235—240 за тону з уключэньнем у цану вывазной пошліны для Беларусі $53 з адной тоны.

Расея паставіць у Беларусь у 2007 г. каля 22 млн т нафты, пароўну на Мазырскі й Наваполацкі заводы.

Як адзначае расейская газэта «Коммерсант», цана нафты для Беларусі ў сьнежні складала $230 за тону, пасьля быў уведзены мыт $53 за тону.Цяпер жа выходзіць, што расейскія нафтавікі зноў будуць прадаваць нафту ў краіну за старую цану. Газэта задаецца пытаньнем, хто ж будзе плаціць тое мыта. Газэта мяркуе, што папросту нафтавыя кампаніі зьнізілі цану. Гэта ня дзіўна: яны папросту зьнізілі звышпрыбыткі. Цана паставак расейскай нафты ў Польшчу без уліку экспартных мытаў ($180 за тону) складае $172 за тону. У Беларусь жа нават па новай формуле нафтакампаніі будуць прадаваць нафту ў сярэднім за $187 за тону.

**СП**

# Масква распачала цкаваньне Лукашэнкі

Усе выходныя расейскія СМІ казалі, са спасылкай на словы Лукашэнкі, што той скасаваў нафтавыя пагадненьні з Расеяй. Прэс-службе беларускага кіраўніка прыйшлося заявіць, што яго «няправільна зразумелі». Выглядае, што новы дэвіз інфармацыйнай палітыкі Расеі да Лукашэнкі — «усё, што вы скажаце, можа быць выкарыстана супраць вас».

Заявы расейскіх СМІ, што Аляксандар Лукашэнка ануляваў пагадненьні па нафце, падпісаныя з Расеяй, не адпавядаюць сапраўднасьці. «Гэта — найсапраўднейшая правакацыя, скіраваная на дэстабілізацыю двухбаковых стасункаў», — заявіў кіраўнік прэсавай службы прэзыдэнта Павал Лёгкі.

Для вырабу дэзынфармацыі расейскія СМІ выкарысталі Лукашэнкавы імправізацыі з наваполацкай нарады па пытаньнях дывэрсіфікацыі крыніцаў паставак энэрганосьбітаў.

Там ён сказаў: «Дэлегацыя, якая вядзе зноў перамовы, атрымала ад мяне простыя ўказаньні: тыя кампаніі, якія будуць нам прапаноўваць гэткія кантракты па гэткіх цэнах завышаных — тут па прапампоўцы нафты ў Эўропу будуць абкладацца дадатковым мытам, каб мы маглі кампэнсаваць свае страты ад звышсусьветных цэнаў».

Цытата Лукашэнкі была скажоная журналістам ІТАР-ТАСС да супрацьлеглага сэнсу.

Аляксандар Лукашэнка прывык гаварыць шмат. Усё, што казалі ягоныя апанэнты, выкарыстоўвалася супраць іх — машынай дзяржаўных СМІ, судамі, Ярмошынай. Яму ж дазвалялася гаварыць усё. Пра ўсіх і ўсё. Беларусаў, замежнікаў. Пра сфальшаваныя выбары, пра незалежныя газэты, якія прадаюцца на кожным кроку. Гэткая манэра прамаўляць — неад’емны элемэнт, калі не аснова папулісцкага рэжыму. Эўрапейцы, ня звыклыя да такога стылю, адракліся кантактаў з Лукашэнкам, а заадно і зь Беларусьсю. Калі была поўная падтрымка Масквы, гэта мала турбавала беларускія ўлады.



WWW.SVABODA.ORG

**«Ніхто не павінен паразытаваць», — заявіў Пуцін на сустрэчы з Мэркель.**

Патрабуючы платы па рахунках «саюзнае дзяржавы», Масква ўжыла супраць А. Лукашэнкі прыёмы, якія 12 гадоў праходзілі апрабацыю на беларускім палітычным полі. Выглядае, што новы дэвіз інфармацыйнай палітыкі Расеі да Лукашэнкі — «усё, што вы скажаце, можа быць выкарыстана супраць вас».

**Мікола Бугай**

### Лукашэнка: Цкаваньне вядзецца па ўказцы Крамля

**Націск на Беларусь ажыцьцяўляецца па ўказаньні Крамля, заявіў Аляксандар Лукашэнка падчас сустрэчы зь лідэрам Кампартыі Расеі Генадзем Зюганавым. «Беларусь пачынаюць душыць, травіць, з нас проста зьдзекуюцца — вы бачыце, што сёньня адбываецца ў СМІ. Але яны гэта робяць па ўказцы з Крамля, гэта я дакладна ведаю, — падкрэсьліў прэзыдэнт. — Вось расейская дэмакратыя, і вось паводзіны расейскага кіраўніцтва».**

**Тым ня менш Лукашэнка падкрэсьліў, што ўсё гэта ня мае ніякіх адносінаў да расейскага народу: «Тут адыходу ад векавога гістарычнага курсу ў Беларусі ня будзе, асабліва пры мне. Мы заўсёды былі і будзем з расейскім народам. Вы хочаце нас называць фарпостам Расіі на захадзе — называйце, мы ад гэтага ніколі не адмаўляліся. Але гэта таксама каштуе нечага».**

**Паводле БелТА**


СЯРГЕЙ ГРЫЦ
Ужо год таму некаторыя паглядалі на Мілінкевіча коса.

# Партыя БНФ кажа Мілінкевічу «бывай»

На Сойме Партыі БНФ, які адбыўся 20 студзеня, была разгледжаная прапанова вынесьці падзяку Аляксандру Мілінкевічу за супрацу падчас выбараў. Управа Партыі БНФ на чарговым паседжаньні ўзялася за рэалізацыю гэтай прапановы. Сэнс у тым, што Партыя БНФ прызнае заслугі спадара Мілінкевіча ў пэрыяд зіма-вясна'2006, але лічыць, што зараз, калі няма кароткатэрміновай кампаніі, ёй варта працаваць самастойна.

Партыя БНФ не адмаўляецца ад супрацы са спадаром Мілінкевічам, — кажа намесьнік старшыні ПБНФ Юрась Хадыка, — яна адмаўляецца ад адвольных, бескантрольных паводзінаў Мілінкевіча й яго каманды, якія не рэглямэнтаваныя ніякімі дамовамі. Мы не адмаўляем вялікай ролі Мілінкевіча падчас выбараў прэзыдэнта, але тое, што ён пачаў рабіць пасьля — перацягваць фронтаўцаў у свой рух — вялікая небясьпека для нашай партыі».

**Прэс-служба ПБНФ**

# Мілінкевіч: Дыктатуру без адзінага лідэра ніхто яшчэ не перамагаў

Лідэр Аб'яднаных дэмакратычных сілаў заявіў у пятніцу, што ён «вельмі шкадуе» пра рашэньне Сойму Партыі БНФ адмовіцца ад супрацы.

«Заяву Сойму Партыі БНФ пра пераход да самастойнае працы я лічу памылковым крокам. Кіраўніцтва партыі заняло няправільную пазыцыю — і ў пераходзе да ратацыйнага прынцыпу кіраваньня дэмакратычнымі сіламі, і ў дыстанцыяваньні ад працы ў адзіным штабе, — заявіў А. Мілінкевіч. — Да таго ж, цэнтральнае кіраўніцтва партыі адштурхоўвае рэгіянальныя арганізацыі. У рэгіёнах — я іх аб'ехаў у часе мясцовых выбараў — людзі ня толькі з Партыі БНФ, але і з Аб'яднанай грамадзянскай партыі, Партыі камуністаў казалі, што мусова захаваць еднасьць і каардынацыю дзеяньня. Сваёй заявай цэнтральнае кіраўніцтва іх адштурхоўвае. Ратацыйны прынцып кіраваньня апазыцыяй нерэальны. Калі б у нас была дэмакратыя, я ня меў бы нічога супраць такога прынцыпу. Але мы жывём ва ўмовах дыктатуры. А дыктатуру без адзінага лідэра яшчэ ніхто не перамагаў. Няважна, хто стаў бы лідэрам: Мілінкевіч, Вячорка, Лябедзька, Калякін або хтосьці іншы. Галоўнае, каб гэта быў адзін чалавек, адна фігура. Пераход да ратацыйнага прынцыпу кіраваньня Дэмакратычнымі сіламі зноў размые апазыцыю».

**Паводле БелаПАН**

КАМЭНТАР

# На здароўе

Партыя БНФ сказала Мілінкевічу «дзякуй». АГП і левыя тое зрабілі яшчэ раней. Цяжка зразумець партыі, якія вырашылі адмовіць у лідэрстве адзінаму свайму палітыку, што мае рэйтынг, безь ніякіх яўных ня тое што прычынаў, а нават нагодаў для адкліканьня даверу. Адмовіць усяго праз год пасьля выбраньня. Такая праца па раскрутцы — і пад ногі. Ужо ж бы Кангрэсу дачакаліся для прыліку, урэшце.

Доўгі час здавалася, што хоць БНФ захавае дысцыпліну. Бо то ўсё ж БНФ. Больш чым партыя. Рух. Які дагэтуль столькі робіць для культуры. Ня дзеля ўлады, дзеля Адраджэньня. Sic transit gloria mundi.

Майстры паддывановых камбінацый аказаліся мацнейшымі. Ратацыйны прынцып трыюмфуе. Тварам незалежнага грамадзтва будуць па чарзе кіраўніца Партыі жанчынаў (як яе там... Алена?.. Аліна?..) і адной (ці ўсё ж другой?) з сацыял-дэмакратычных грамадаў.

Працяг на старонцы 12.

# Беларускі дом ля Вострай Брамы

У аўторак у Вільні адчыніўся Беларускі дом правоў чалавека.


ДЗЯНІС РАМАНЮК

Гэта зусім побач з Вострай Брамай, скуль усе дарогі вядуць на Беларусь. БДПЧ — гэта будынак. Але гэта таксама асацыяцыя няўрадавых арганізацыяў. Галоўная задача Беларускага дому — даць прытулак дзейнасьці беларускіх праваабарончых і культурных арганізацыяў, якім не даюць спакою на айчыне.

Заснавальнікі Беларускага дому правоў чалавека — прыватныя асобы. Сярод іх Алесь Бяляцкі, Уладзімер Някляеў, Жанна Літвіна, Барыс Звозкаў, Аляксандар Жучкоў, Сяргей Дубавец, старшыня нарвэскага Фонду «Дом правоў чалавека ў Нарвэгіі» Марыя Дале.

Грошы на арэнду Беларускаму дому далі нарвэскія фонды «Дом правоў чалавека» і «Права слова», Нацыянальны фонд падтрымкі дэмакратыі ЗША, Швэдзкі хэльсынскі камітэт, а таксама ўрады Нідэрляндаў і Чэскай Рэспублікі.

Супрацоўніца нарвэскага фонду «Дом правоў чалавека» Анэ Бондэ, адказная за беларускі праект, кажа: «Мы падтрымліваем заснаваньне гэтага Дому правоў чалавека, бо разумеем, як цяжка жывецца беларускім арганізацыям. Зараз ім стане лягчэй працаваць».

Прытулак для беларускай дзейнасьці ў Вільні сапраўды патрэбны. Такія праваабарончыя дамы існуюць у Нарвэгіі, Расеі, Босьніі і Герцагавіне, Угандзе, Азэрбайджане, Турцыі.

Ідэя праекту ішла да сваёй рэалізацыі сем гадоў. Канчатковы штуршок ёй даў леташні візыт А.Мілінкевіча ў Нарвэгію і ягоныя сустрэчы з кіраўнікамі нашай суседкі, якую аддзяляе ад Беларусі толькі Балтыя і мора.

**МБ**

# Вайтовіч заснаваў чарговы рух

17 студзеня ў Маскве адбылася ўстаноўчая канфэрэнцыя, на якой было прынятае рашэньне аб стварэньні Міжнароднага грамадзкага руху «Супрацоўніцтва і прагрэс». Старшынём быў абраны былы сьпікер савету рэспублікі, акадэмік Аляксандар Вайтовіч. Сярод заснавальнікаў руху таксама Мікалай Мякека, які парываўся сабраць подпісы ў прэзыдэнты ў 2002 годзе, а таксама прэзыдэнт Міжнароднай асацыяцыі абароны правоў чалавека Валер Дунаеў.


WWW.LIVEJOURNAL.COM

**Аляксандар Вайтовіч зь Мікалаем Мякекам (зьлева) і Валерам Дунаевым.**

Галоўная мэта руху — «пашырэньне палітычнага, сацыяльна-эканамічнага і культурнага супрацоўніцтва паміж Беларусьсю і Расеяй». Вайтовіч паабяцаў, што бліжэйшым часам аддзяленьні руху маюць зьявіцца ў суседніх краінах, прынамсі, у Літве, на базе выкладчыкаў і студэнтаў ЭГУ.

Рух Вайтовіча падтрымаў расейскі палітоляг Андрэй Суздальцаў, які займаецца беларускімі дасьледаваньнямі. Той самы, які нядаўна заклікаў ажыцьцявіць паказальныя дэпартацыі беларусаў з Расеі.

**Зьміцер Панкавец**

# На здароўе

**Працяг са старонкі 11.**

Мусіць, ёсьць нейкія прычыны. Нейкая камбінацыя за гэтым крыецца. Нейкія памылкі і слабасьці Мілінкевіча таксама. Толькі людзі гэтага ня ведаюць і ня цямяць. Людзі б зразумелі дэмакратычны цэнтралізм. Абралі лідэра — трымайцеся. Не спрацаваў — пераабралі. Другога трымаемся. А так — шляхта, магнатэрыя. Свае інтарэсы. На нафтагазавыя выклікі нуль адказу, затое ў працэдурных пытаньнях докі.

Мілінкевіч таксама харош. Дзевяць месяцаў выношваў рух ды так і не нарадзіў.

Моладзь вакол яго, пратаганісты Плошчы — пакуль ніхто зь іх не запомніўся.

Аднак людзі інстынктыўна шукаюць яснасьці. Яны будуць схільныя захаваць у гэтай сытуацыі падтрымку Мілінкевічу і тым, хто вакол яго. Так што хто яшчэ каму мусіць «дзякуй» казаць, пры цудоўным рэйтынгу нашых апазыцыйных партыяў. Хіба што раптоўны выхад Казуліна з турмы зноў падзеліць сымпатыі. Ці — Сідорскі, калі аддзеліцца ад Лукашэнкі. Але гэта быў бы ўжо іншы акт марлезонскага балету.

**Барыс Тумар**

## Вячорка тлумачыць стаўленьне БНФ да Мілінкевіча

«Сп.Мілінкевіч адрасаваў Сойму Партыі БНФ ліст з прапановай уліцца ў ягоную фракцыю на будучым Кангрэсе дэмакратычных сілаў. Але яшчэ ў лістападзе Сойм Партыі БНФ прыняў пастанову, паводле якой сябры БНФ увойдуць у фракцыю БНФ, гэтаксама як сябры іншых партыяў і згуртаваньняў сфармуюць свае фракцыі. На аснове прадстаўніцтва фракцыяў фармуецца Палітычная рада, і было б недапушчальна, каб у ёй не была прадстаўленая Партыя БНФ.

Сп.А.Мілінкевіч прыступіў да стварэньня ўласнай палітычнай структуры. Гэтае рашэньне падарвала ягоны статус як надпартыйнага лідэра. Група А.Мілінкевіча дагэтуль не прапанавала меркаваным партнэрам ані канцэпцыю арганізацыйнага ўладкаваньня, ані стратэгію такога кшталту руху. Аднак мы гатовыя каардынаваць нашую палітыку з групай А.Мілінкевіча ў рабочым парадку».

**Паводле заявы В.Вячоркі**

# «А паперадзе калёны, абняўшыся, ідуць, Паўлічэнка і Бандарэнка»

Каардынатар «Хартыі'97» Зьміцер Бандарэнка заклікаў улады і апазыцыю адзначыць 25 Сакавіка разам. Ён прапануе абвесьціць 25 Сакавіка дзяржаўным сьвятам — Днём волі і яднаньня — і адзначыць яго супольнай акцый уладаў і апазыцыі ў абарону незалежнасьці пад лёзунгам «За Свабоду! За Беларусь!». Лябедзька: «Прапанова крэатыўная, але казачная».

«25 сакавіка 2007 г. павінна стаць дзяржаўным святам — Днём Яднаньня і Прымірэньня ўсіх беларусаў. Цяпер ня час падзяляць беларусаў на «сваіх» і «чужых», — напісаў Зьміцер Бандарэнка на сайце charter97.org. — Само жыцьцё прымушае беларусаў яднацца. Без удзелу праэўрапейскіх і дэмакратычных сілаў у кіраваньні краінай ня ўдасца захаваць нават той невялікі жыцьцёвы ўзровень людзей, які мы сёньня маем. Тое, што агучвае сёньня беларускі ўрад па рашэньні энэргетычнай праблемы, — гэта праграмныя палажэньні беларускіх дэмакратычных партый. Мы не павінны адмаўляцца ад каштоўнасьцяў дэмакратыі і правоў чалавека. У сьвяткаванні павінны ўзяць удзел кіраўніцтва краіны і лідэры апазыцыі, старшыня Рады БНР спадарыня Івонка Сурвілла, кіраўнікі Праваслаўнай і Каталіцкай цэркваў, іншых канфэсій, вядомыя грамадзкія і культурныя дзеячы. Улада ў сваю чаргу павінна зрабіць крокі насустрач: акрамя абвяшчэньня 25 Сакавіка дзяржаўным сьвятам, павінны быць вызваленыя ўсе палітычныя вязьні і зробленая заява кіраўніцтва краіны пра пачатак адкрытага дыялёгу з апазыцыяй. А дэвізам агульнанацыянальнай акцыі прымірэння і яднання 25 сакавіка 2007 г. могуць стаць словы — «За Свабоду! За Беларусь!» — напісаў ён.

Што думаюць пра магчымасьць правядзеньня такой акцыі прадстаўнікі апазыцыйных палітычных партыяў, прадстаўнікі ўладаў, дзеячы культуры?

Заклікі Бандарэнкі не знайшлі станоўчага водгуку ў дэпутата-лукашэнкаўца **Сяргея Касьцяна**: «Паміж беларусамі не было ніякай вайны, таму ня можа быць ніякага дня прымірэньня і яднаньня. Тым больш з такой апазыцыяй, якую мы маем у Беларусі. Вядома, апазыцыя патрэбная ў грамадзтве, але патрэбная такая апазыцыя, якая б ня езьдзіла на Захад і не патрабавала ніякіх санкцыяў супраць афіцыйнага Менску. Няхай апазыцыя таксама працуе дзеля таго, каб краіна квітнела і разьвівалася. Ня трэба ніякі шум, і мітынгі ўладам не патрэбныя, людзі і так бачаць, што яны робяць для дабра краіны».

Партыя БНФ, у сваю чаргу, прыняла рашэньне склікаць аргкамітэт сьвяткаваньня Дня Волі. «25 Сакавіка мусіць стаць галоўным днём вясны-2007, — сьцьвярджае **Вінцук Вячорка**. — 25 Сакавіка мусіць стаць нагодай для агучваньня нашых падыходаў да будучыні Беларусі. Сёньня ёсьць тупік у разьвіцьці беларускай эканомікі, тупік у разьвіцьці беларускай дзяржаўнасьці. І выйсьце з усяго гэтага — тэрміновыя дэмакратычныя рэформы. Яны дазволяць нам вярнуцца ў Эўропу, атрымліваць сур'ёзную дапамогу з боку Эўрапейскага Зьвязу і Злучаных Штатаў Амэрыкі. Як сьцьвярджае ўлада, незалежнасьць ёсьць каштоўнасьцю й для яе. Такім чынам улада атрымлівае магчымасьць засьведчыць, што на глебе Незалежнасьці яна можа яднацца з дэмакратычнымі сіламі».

Пісьменьнік **Уладзімер Арлоў** у сваю чаргу думае, што яднаньне беларускага народу і так штогод адбываецца на Дзень Волі: «25 Сакавіка ўжо неаднаразова быў своеасаблівым днём «яднаньня» беларускага народу. Я кажу, калі прадстаўнікі праваахоўных органаў зьбівалі тых, хто прыходзіў адзначыць гэты дзень на плошчы Менску і іншых гарадоў. Людзі розных палітычных перакананьняў у гэты дзень ужо даўно зьбіраюцца ў адных і тых месцах. Я некалі ўжо казаў, што 25 Сакавіка сталі адзначаць як прадстаўнікі уладаў, так і незалежнага грамадзтва. Той жа міліцыі на Дзень Волі выдаюць адмысловаю сьвяточную экіпіроўку. Што да сёлетняга сьвяткаваньня, то я ня бачу сымптомаў, каб яно склалася не па традыцыі апошніх гадоў. Што да пэрспэктывы, то я ўпэўнены, што 25 Сакавіка стане дзяржаўным сьвятам».

Музыка гуртоў Н.Р.М. і «Гарацкія» **Піт Паўлаў** наконт сумеснага ўдзелу ў канцэрце 25 Сакавіка разам з праўладнымі музыкамі: «Галоўнае, каб з намі была папярэдняя дамоўленасьць, каб былі абмеркаваныя ўсе крокі па ўдзеле. Калі такога ня будзе, то мы відавочна ня будзем удзельнічаць. Патэнцыйна ж мы ня супраць».

Старшыня Аб'яднанай грамадзянскай партыі **Анатоль Лябедзька** лічыць, што сама па сабе ідэя досыць цікавая, але маларэалістычная: «Ідэя крэатыўная. Перад вачыма ў мяне адразу прабягаюць наступныя кадры яднаньня на Сьвіслачы. Першай хваляй ідуць Лукашэнка з Шэйманам, другой — Мілінкевіч, Калякін, Лябедзька, а паперадзе ўсёй гэтай калёны ідуць, абняўшыся, Дзьмітры Паўлічэнка і Зьміцер Бандарэнка. Карціна амаль казачная, але ня вельмі рэалістычная. Сёньня я слаба ўяўляю такое разьвіцьцё падзеяў, бо мы добра ведаем, што прадстаўляе зь сябе гэтая ўлада. Аднак падобныя мэсыджы і надалей павінны сыходзіць з нашага боку».

**Зьміцер Панкавец**

# Упершыню за пяць гадоў вырасла стаўка рэфінансаваньня

Нацбанк з 1 лютага ўзьняў яе да 11% гадавых. «Павелічэньне стаўкі на адзін працэнтны пункт, — гаворыцца ў прэс-рэлізе Нацбанку, — скіравана на павышэньне даходнасьці ашчаджэньняў у нацыянальнай валюце і далейшае стымуляваньне росту ўкладаў насельніцтва і прадпрыемстваў у банках».

Эканаміст Зьміцер Бабіцкі ў такое тлумачэньне ня схільны верыць. На ягоную думку, гэта проста прыкмета таго, што Беларусь чакае інфляцыя. «Павышэньне нязначнае, але яно прывядзе да павышэньня стаўкі крэдытаў у камэрцыйных банках, цесна завязаных на стаўцы рэфінансаваньня».

Стаўка рэфінансаваньня вызначаецца для камэрцыйных банкаў: гэта працэнт, пад які банкі маюць права браць крэдыты ў галоўнай фінансавай установы краіны, а потым прадаваць крэдыты насельніцтву.

Цягам некалькіх гадоў стаўка рэфінансаваньня зьніжалася, што было прыкметай умацаваньня рубля.

21 лютага 2000 г. яна складала 175% гадавых, 22 траўня 2000 г . — 100%. Апошні раз стаўка рэфінансаваньня зьніжалася 29 лістапада: з 10,5% да 10,0%.

**Зьміцер Панкавец**

# Сёлета заробкі расьці ня будуць

Сярэдні заробак у Беларусі дасягнуў 311 даляраў, але далейшы яго рост ня мусіць перавышаць росту прадукцыйнасьці працы, заявіў намесьнік міністра эканомікі.

Тэмп росту зарплаты ў 2007 г. павінен быць супастаўны з ростам прадукцыйнасьці працы. Аб гэтым паведаміў намесьнік міністра эканомікі Андрэй Тур.

Ён адзначыў, што сярэдні ўзровень зарплаты ў сьнежні перавысіў заплянаваныя $300. У бюджэтнай сферы гэты паказчык дасягнуў $287 (прагноз — $265). Паводле слоў намесьніка міністра, у бягучым годзе «такая задача рэзкага прыросту зарплаты не стаіць».

**МБ; інф. БелТА**

# Аргкамітэт па адзначэньні Дня Волі

Палітычная камісія Партыі БНФ прыняла рашэньне склікаць аргкамітэт сьвяткаваньня Дня незалежнасьці 25 Сакавіка. Паводле словаў лідэра партыі Вінцука Вячоркі, аргкамітэт мусіць быць з прадстаўніцтвам палітычных партыяў, няўрадавых арганізацыяў і інтэлігенцыі. «25 Сакавіка мусіць стаць галоўным днём вясны-2007, — гаворыць В.Вячорка. — Як сьцьвярджае ўлада, незалежнасьць ёсьць каштоўнасьцю й для яе. Такім чынам улада атрымлівае магчымасьць засьведчыць, што на глебе Незалежнасьці яна можа яднацца з дэмакратычнымі сіламі».

**МБ**

# Мілінкевіча палохаюць забаронай на выезд

Аляксандар Мілінкевіч абавязаны сплаціць 4 млн 650 тыс. рублёў штрафу, дадзенага судом Кастрычніцкага раёну Менску нібы за «наўмыснае незаконнае перасячэньне мяжы». З копіяй судовай пастановы А.Мілінкевіч атрымаў папярэджанне аб абавязковай выплаце да 10 лютага.

У адваротным выпадку яму пагражае забарона на выезд. Нагадаем: аднойчы памежнікі замест пашпарта палітыка паставілі штамп у пашпарт яго сына, таксама Аляксандра. Агледзеліся, калі палітык вяртаўся. Прычым Мілінкевіч сам паказаў памежнікам памылку.

**МБ**

## Лукашэнка ўзнагародзіў кіраўніка банкаў «Райфайзэн»

Гербэрт Стэпіч, кіраўнік групы банкаў «Райфайзэн», уганараваны ордэнам Дружбы народаў, бо «Райфайзэн», як паведаміў А.Лукашэнка, «уклаў нямала сродкаў, сіл і ведаў у развіцьцё банкаўскай сыстэмы Беларусі». «Пріорбанк», кантраляваны «Райфайзэнам», найлепшы ў тэхналягічным пляне банк краіны.

У сьнежні кіраўнік Нацбанку дэкляраваў: у банкаўскую сфэру ў бліжэйшыя гады прыйдзе замежны капітал.

**МБ**

## Расейцы пусьцяць нафту міма Беларусі

Расейская «Транснефть» распрацавала плян пабудову нафтаправоду ў абыход Беларусі. Ён можа прайсьці па маршруце Унеча—Вялікія Лукі—Прыморск (порт на Балтыйскім моры ў Ленінградзкай вобласьці). Унеча – гэта горад на мяжы Расеі зь Беларусьсю, праз які ідзе нафтаправод «Дружба».

Дакумэнты адправілі ва ўрад. Цяпер Міністэрства прамысловасьці й энэргетыкі Расеі разглядае мэтазгоднасьць рэалізацыі гэтага праекту. Новая магістраль працягласьцю тысяча кілямэтраў мае застрахаваць ад рызыкаў беларускага транзыту.

Але на думку аналітыка кампаніі Advanced Research Міхаіла Бакулева, цяпер Транснафце не па кішэні будаўніцтва такой трубы.

## Расейскія каналы паказала кадры «Плошчы» і «Звычайнага прэзыдэнта»

Расейскі Першы ў нядзелю ў выпуску навін выкарыстаў кадры з фільмаў Ю.Хашчавацкага «Плошча» і «Звычайны прэзыдэнт». АНТ навіны Першага не транслюе. Бачылі яго ўладальнікі спадарожнікавых антэнаў.

**МБ**

# КДБ раскрыў татальную карупцыю ў гандлі лесам

Леташняй вясной КДБ Беларусі скупа паведаміў, што правёў апэрацыю па спыненьні дзейнасьці асобаў, што займаліся рэалізацыяй на экспарт піламатэрыялаў са скрадзенага ў краіне лесу. Апэрацыя гэтая насамрэч ня мела шчэ аналягаў. 19 красавіка адначасова былі праведзеныя ператрусы ў дваццацёх фірмах Менску, Менскай, Магілёўскай і Берасьцейскіх абласьцях.

Цягам ператрусаў вынайшлі ня толькі падманныя дакумэнты, але й зброю. Па гарачых сьлядох паведамлялася, што пятая частка ўсяго беларускага экспарту піламатэрыялаў рэалізоўвалася праз «левыя» схемы.

На сёньня ў сьледчым ізалятары КДБ сядзяць 15 фігурантаў тае справы. У махінацыі аказаліся ўблытаныя 40 фірмаў, улучна з замежнымі.

Схема крадзяжу пачыналася з вылучэньня дзялянкі пад высячэньне. На паперы вылучалася адна колькасьць лесу, а напраўдзе — болей. Далей зьяўляўся нідзе ня ўлічаны матэрыял, за які разьлічваліся гатовымі грашмі, каб у тартакоў сыходзілася бухгальтэрыя. З папярэдніх зьвестак, схема працавала гадоў дзесяць.

**МБ; Белорусский партизан**

# Цэны на жыльлё імкліва растуць

У Менску квадратны мэтар сярэдняй аднапакаёўкі каштуе ўжо пад 1400 даляраў.

Паўсюль па краіне беларусы аддаюць перавагу аднапакаёўкам. Гэта тлумачыцца як падаражаньнем камунальных паслугаў, так і нараджэньнем будучага сярэдняга слою. Сваёй кватэры прагне наймалодшае пакаленьне — занадта маладое, каб замахвацца на двух- і трохпакаёўкі, але якое мае свой бізнэс або зарабляе досыць добра, каб кватэры купляць, а не прастойваць у чэргах разам з членамі БРСМ.

## Нямецкі досьвед

Адной з прычынаў росту цэнаў на жыльлё, як на першасным, так і на другасным рынках, зьяўляецца актыўнае разьвіцьцё сыстэмы жыльлёвага крэдытаваньня. Паводле зьвестак Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва, у Менску знаходзяцца на ўліку 170 тысячаў сем'яў, што маюць патрэбу ў засяленьні. Па выніках мінулага году кватэрамі былі забясьпечаныя каля 12 тысячаў сем'яў, зь якіх палову складаюць сем'і, што атрымалі жыльлё ў парадку чаргі.

Калі будаўніцтва сацыяльнага жыльля будзе працягвацца такімі тэмпамі, то чарга на атрыманьне ільготнай кватэры расьцягнецца на 30 гадоў. У міністэрстве адным са спосабаў вырашэньня праблемы бачаць выкарыстаньне вопыту Нямеччыны, дзе будаўніцтвам жыльля займаюцца камэрцыйныя прадпрыемствы. Дзяржава нават стварае гэтым фірмам ільготныя ўмовы. Таму ў Нямеччыне даўно не існуе праблемаў з жыльлём.

У хуткім часе ў парлямэнт мусіць патрапіць законапраект, які прадугледжвае стварэньне сыстэмы будаўнічых ашчаджэньняў. Калі закон будзе ўхвалены, пэўная катэгорыя грамадзянаў зможа адкладаць грошы на адмысловым банкаўскім рахунку і потым атрымаць ільготны крэдыт на жыльлё.

## Аптымізм міністра

На сёньня цана аднаго «сацыяльнага» квадратнага мэтру ў Беларусі складае каля 400 даляраў пры сярэднім заробку 270 даляраў.

Міністар архітэктуры і будаўніцтва Аляксандар Селязьнёў упэўнены, што падаражаньне расейскага газу істотна не адаб'ецца на цэнах жыльля. Са словаў міністра, дзякуючы новай цане цэмэнту, цэны ўздымуцца на 5—6%.

Незалежныя назіральнікі лічаць ацэнкі ўраду занадта аптымістычнымі. Дый няма такога ў сьвеце, каб чалавек 30 гадоў стаяў у чарзе на сацыяльную кватэру. Само паняцьце сацыяльнага жытла тады траціць сэнс.

## Вымушаная папулярнасьць аднапакаёвак

Эканамічная аглядальніца газэты «Белорусы и рынок» Елізавета Булацкая адзначае паказальную тэндэнцыю росту попыту на малагабарытнае жытло на другасным рынку. І ў першую чаргу гэта характэрна для рэгіёнаў, дзе сярэднія заробкі істотна адрозьніваюцца ад сталічных. Жыхарам райцэнтраў робіцца ўсё менш выгадна пражываць у шматпакаёўках. І калі рост цэнаў на камунальныя паслугі будзе працягвацца, попыт на малагабарытнае жыльлё ўзрасьце.

Экспэрт адзначае розьніцу ў гнуткасьці цэнаў на сталічнае і правінцыйнае жыльлё: у абодвух выпадках дынаміка росту амаль супадае, аднак цэны ў сталіцы больш чуйныя да зьменаў. Зьвяртае ўвагу на сябе і тое, што кватэры ў якой Лідзе ці Салігорску каштуюць амаль аднолькава, як і ў абласным Магілёве. Аднапакаёўку ў гэтых гарадах можна набыць ад 20 тысячаў даляраў, самая дарагая чатырохпакаёвая кватэра абыдзецца ў 42—45 тысячаў. Сярод буйных гарадоў вылучаецца Бабруйск, у якім пасьля пакупніцкага буму 2005 году цэны на кватэры амаль спыніліся і прыемна адрозьніваюцца ад іншых гарадоў.

## Украінскі фэномэн

Паводле дасьледаваньня кампаніі Global Property Guide, летась сярод 40 найбольш разьвітых і стабільных краінаў сьвету найхутчэй цэны на жытло расьлі ў Эстоніі зь яе дынамічнай эканомікай і актыўным грамадзтвам. Тут гэты паказчык складае 54%. Але калі б у сьпіс уключылі Ўкраіну, яна са сваімі 66% стала б безумоўным сусьветным лідэрам. Самая танная нерамантаваная кіеўская аднапакаёўка на другасным рынку каштуе 52 тысячы даляраў. Прычынай такога ёсьць імклівы рост іпатэчнага крэдытаваньня, міграцыя, рост прыбыткаў і спэкулятыўны попыт на жыльлё. Сярэдні кошт аднаго «квадрату» дасягае 2600 даляраў.

Для параўнаньня — у традыцыйна дарагой Маскве гэты паказчык складае каля 4200 даляраў.

У нашых заходніх суседзяў-палякаў кватэрная ліхаманка сьцішылася, і рост цэнаў летась быў ніжэйшы супраць нямецкага — 2,2%.

Доўгі час не растуць цэны на жыльлё ў далёкай Японіі, а растрывожаны вайсковым становішчам Ізраіль перажывае 4%-ае зьніжэньне кошту жытла.

**Сямён Печанко**



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Цэны на жытло растуць хутчэй за будынкі.**

# Кветкі для правадыра

Пра пераход Беларусі на эўра, візыт Мальцава ў Іран і іншыя тэмы тыдня піша **Віталь Тарас**.

## Эўра і Галакост

Пры канцы студзеня Арганізацыя Аб'яднаных Нацыяў прызнала адмаўленьне Галакосту — масавага вынішчэньня габрэяў гітлераўцамі падчас Другой сусьветнай вайны — злачынствам. Рэзалюцыя ў гэтым пытаньні, прапанаваная ЗША, была прынятая ўсеагульным ухваленьнем без галасаваньня. Супраць яе выступіў толькі Іран, дзе месяц таму адбылася «навуковая канфэрэнцыя» па Галакосьце. На яе зьехаліся з усяго сьвету тыя, хто лічаць колькасьць ахвяраў вайны «завышанай».

Дарэчы, Міжнародны дзень Галакосту 27 студзеня ўпершыню сталі адзначаць толькі ў 2005 г. У гэты дзень у 1945 г. савецкія салдаты вызвалілі канцлягер Асьвенцым.

Гэтую дату, таксама як і рашэньне ААН, беларускія СМІ амаль не заўважылі. Зразумела, дзяржаўная і недзяржаўная прэса былі больш занятыя сэнсацыйнымі выказваньнямі Лукашэнкі пра тое, што адзінай валютай у Беларусі можа стаць эўра, і што Беларусь, як ніводная іншая дзяржава, заслугоўвае на тое, каб быць далучанай да Эўразьвязу. Гэтыя выказваньні кіраўніка дзяржавы выглядалі гэтак сама натуральна, як і ягоны партрэт на першай старонцы «Нашай Нівы».

Праўда, інтэрвію кіраўніка нямецкай газэце «Вэльт», дадзенае крыху раней, павінна было крыху супакоіць ягоных старых прыхільнікаў, паколькі Лукашэнка чарговы раз патлумачыў, як ён разумее эўрапейскую дэмакратыю і чаму ён так баіцца журналістаў.

Аднак, калі скарыстацца састарэлым у нашыя дні мэтадам параўнаньня словаў палітыкаў з практыкай, то варта ўспомніць напачатку пра візыт міністра абароны Беларусі Мальцава ў Іран.

Хаця вынікі гэтага візыту былі ахутаныя амаль суцэльнай сакрэтнасьцю, можна ўспомніць, што падчас ранейшых кантактаў беларускага кіраўніцтва з іранскім гаворка, у прыватнасьці, тычылася вайскова-тэхнічнага супрацоўніцтва. Пра пастаўкі канкрэтных відаў узбраеньняў Ірану нідзе афіцыйна не гаворыцца. Але, калі верыць высновам амэрыканскага Кангрэсу, які працягнуў нядаўна дзеяньне Акту аб дэмакрытыі ў Беларусі, роля Менску як пасярэдніка ў пастаўках расейскай зброі — скажам, у Ірак, азіяцкія ды афрыканскія краіны ў апошнія гады была надзвычай важнай.

І калі паглядзець праз гэтую прызму на апошнія падзеі ў сьвеце — на чарговыя выпрабаваньні Іранам балістычных ракетаў, зробленых на падставе расейскіх аналягаў… Дык вось, калі паглядзець на ўсё гэта ў сукупнасьці, можна зрабіць выснову, што пазыцыя афіцыйнага Менску і Масквы ў падмурковых пытаньнях сучаснае міжнароднае палітыкі разыходзіцца значна меней (калі ўвогуле разыходзіцца), чым падыходы да будаўніцтва так званае «саюзнае дзяржавы» ды ўнутраных пытаньняў.

## Дайце «тайм-аўт»

Як слушна заўважыў адзін зь вядомых аўтараў расейскіх «Известий», калі б Крэмль захацеў зьнішчыць аўтарытарны рэжым у Беларусі — ён бы яго зьнішчыў, а не абмежаваўся б паўмерамі, якія нанесьлі ў выніку страты рэпутацыі Расеі на міжнароднай арэне. Страты іміджу, але ня сутнасьці цяперашняга пуцінскага рэжыму, які мала чым адрозьніваецца ад Лукашэнкавага.

Таму радасьць з нагоды апошніх «праэўрапейскіх» выказваньняў Лукашэнкі выглядае крыху дачаснай. Як і прыезд кіраўніка ПАРЭ Рэнэ ван дэр Ліндэна ў Менск. Дзякаваць Богу, гэтым разам кіраўнік Беларусі ўратаваў твар эўрапейскага чыноўніка, не сустрэўшыся зь ім, і тым самым не стварыўшы дадатковых ілюзіяў у часткі палітычнага істэблішмэнту на Захадзе.

Размова вядзецца, як і раней, пра цывілізацыйны выбар — ці зьбіраецца Беларусь распачаць рух на Захад, падзяляючы, у прынцыпе, асноўныя эўрапейскія каштоўнасьці (а пра іх нагадала нядаўна ПАРЭ, якая апраўдала, хоць і са спазьненьнем, дацкіх журналістаў, што надрукавалі карыкатуры на прарока Мухамэда); ці яна зьбіраецца застацца ўсходняй дэспатыяй накшталт Туркмэністану. Толькі бяз газу.

Так, апошні нафтагазавы канфлікт моцна ўстрывожыў кіраўніка Беларусі. Ён упершыню сутыкнуўся з тым непрыемным фактам, што ня ўсё залежыць толькі ад ягонай волі на тэрыторыі ягонай жа дзяржавы. Кран ад энерганосьбітаў застаецца ў Расеі, і ў яе волі прыкруціць яго, адкруціць і прымусіць плаціць за нафту й газ па сусьветных цэнах. Таму цяпер у Менску ліхаманкава шукаюцца спосабы ня столькі знайсьці альтэрнатыву расейскім энергапастаўкам (бо ідэя замены нафты з Расеі на расейскую ж нафту, толькі запампаваную ў тэрміналы Вэнтспілса, выглядае, мякка кажучы, экзатычнай), колькі давесьці Маскве, наколькі ёй патрэбны саюз з Лукашэнкам, які процістаіць NATO.

Калі камусьці ў дзеяньнях «Газпрому» і расейскага ўраду бачыцца выключна й толькі перавод эканамічных адносінаў паміж дзьвюма дзяржавамі на «рынкавыя рэйкі», дык Лукашэнка абсалютна слушна бачыць у гэтых дзеяньнях замах на свае ўладныя паўнамоцтвы, на абсалютную ўладу на сваёй тэрыторыі.

Характэрна, што ў інтэрвію «Вэльт» ён не абяцае Захаду паступіцца

**Працяг на старонцы 18.**




**Міністар Радзькоў (у цэнтры) і рэктар Стражаў(у цэнтры): вучыце, дзеці, кітайскую. Хутка будзеце вывучаць на ёй гісторыю Беларусі.**

# Кветкі для правадыра

Працяг са старонкі 16.

чымсьці. Ён проста патрабуе ад фраў Мэркель ды іншых эўрапейскіх лідэраў спрыяньня ў інвэстыцыях у беларускую эканоміку, скасаваньня «дзікунскай» забароны на ўезд беларускіх чыноўнікаў у Эўропу, а таксама абароны ад імпэрскіх памкненьняў Масквы. То бок, прапануецца дапамагчы яму паводле прынцыпу: «Вораг вашага ворага — ваш сябра». Але пры гэтым «вораг» у Маскве застаецца не стратэгічным, у адрозьненьне ад ЗША, скажам, але тактычным, часовым. Менавіта таму ў размовах пра саюзную дзяржаву ды інтэграцыю прапанавана зрабіць «тайм-аўт», а не паставіць на іх крыж.

## Дзякуй за перамогу над фашызмам!

У заяве прадстаўнікоў беларускай інтэлігенцыі (якую таксама абышла ўвагай большасьць СМІ) слушна гаворыцца пра тое, што псэўдапатрыятызм «Лініі Сталіна» ня мае дачыненьня да сапраўднага патрыятызму й незалежнасьці дзяржавы. Але трэба ўлічыць, што тэма рэабілітацыі сталінізму актуальная цяпер ня толькі для Беларусі.

Прыхільнікі генэралісімуса Сталіна ёсьць нават у Ізраілі. Яны нават выходзяць з партрэтамі правадыра на дэманстрацыі 9 траўня. Размова йдзе пра пэнсіянэраў — вэтэранаў Вялікай айчыннай вайны, якіх сёньня ў Ізраілі, відаць, ня менш, чым іх засталося ў рэспубліках былога СССР. На канале Бі-Бі-Сі летась прайшоў дакумэнтальны фільм, прысьвечаны малавядомым старонкам партызанскай вайны ў Беларусі. Героямі фільма сталі габрэі, якія ўдзельнічалі ў супраціве гітлераўскае акупацыі (габрэйскія атрады дзе-нідзе кантралявалі цэлыя раёны). Там ёсьць кадры, дзе былыя партызаны — госьці з Ізраілю, п'юць за загіблых сяброў, а потым пачынаюць хваліць сёньняшнюю ўладу ў Беларусі і пэрсанальна Аляксандра Лукашэнку за тое, што так добра пры ім жывецца вэтэранам вайны. Якіх дзяржава памятае і шануе.

Адзін мой знаёмы, які нарадзіўся й вырас у Беларусі, а цяпер жыве часам у Ізраілі, часам у адной эўрапейскай краіне, распавёў цікавую гісторыю. Некалі ў Ізраіль зь Беларусі эміграваў разам з жонкай канструктар савецкай ракетнай тэхнікі. (Імя яго, па просьбе майго знаёмага, называць ня буду.) Ён атрымліваў там даволі салідную пэнсію, а па яго сьмерці яе стала атрымліваць ягоная ўдава.

Здарылася так, што Ірак, падчас нападу на яго ЗША і саюзьнікаў, пачаў абстрэльваць ізраільскую тэрыторыю савецкімі ракетамі «Скад», да стварэньня прататыпаў якіх і спрычыніўся ў мінулым згаданы канструктар. Дык вось, ягоная ўдава напісала ліст ў высокія ізраільскія інстанцыі, дзе ўказала на высокую эфэктыўнасьць «скадаў» ды запатрабавала, улічваючы заслугі ейнага мужа ў стварэньні ракетнай зброі, павысіць ёй дзяржаўную пэнсію.

Гэтая гісторыя здаецца неймавернай. Але яшчэ больш неймаверным падаецца той факт, што многія з тых, хто справядліва бачыць у Ахмадынэжадзе злога ворага Ізраілю, гатовага зьнішчыць усё ягонае насельніцтва ў ядравым полымі, ня хочуць зважаць на падтрымку палітыкі Ірану з боку афіцыйнага Менску.

## У госьці да помніка

У Ізраілі пільна адсочваюць праявы антысэмітызму ў Заходняй Эўропе, напрыклад, у Польшчы. І стараюцца не заўважаць іх праяваў у Беларусі.

Магчыма, іх заварожваюць рытуальныя словы пра тое, што Беларусь унесла вырашальны ўклад у Перамогу ды вызваленьне Эўропы ад фашызму. Пра тое, якой цаной далася тая перамога, і якія страты прынесьлі Беларусі сталінскія рэпрэсіі — ніхто ня хоча згадваць. Таксама як і пра той факт, чаму савецкія габрэі ў масавым парадку эмігравалі з БССР.

Адкрытай прапаганды антысэмітызму ў сёньняшняй Беларусі няма, але і за адмаўленьне Галакосту не караюць. Кнігі на гэтую тэму можна лёгка набыць у адкрытым продажы. Тым больш нікога не караюць за адмаўленьне сталінскіх злачынстваў.

У Расіі яшчэ пакуль вагаюцца, ці варта аднаўляць помнік Дзяржынскаму на Лубянцы, а ў Менску копія таго помніка ўжо даўно стаіць у Вайсковай акадэміі. Стаіць і бюст Сталіна на відным месцы пад Заслаўем.

Рада Эўропы некалі паспрабавала паставіць знак роўнасьці паміж фашысцкай сымболікай і савецкай, але пад націскам Расеі адмовілася ад гэтага намеру. Магчыма, адмовіцца ад гэтай ідэі і парлямэнт Эстоніі, які ўжо запаволіў выкананьне закону аб пераносе вайсковых пахаваньняў з-за скандалу, узьнятага ў Расеі вакол помніка савецкага «Воіна-вызваліцеля» ў Таліне. І няма чаго зьдзіўляцца, што ў праграму візыту старшыні ПАРЭ было ўлучанае наведаньне «Лініі Сталіна». Праўда, пакуль не атрымалася. Можна сабе ўявіць карціну — Рэнэ ван дэр Ліндэн ускладае кветкі да помніка вызваліцелю Эўропы. Хаця, напэўна, гэта не апошні візыт падобнага рангу, і мы яшчэ не такое зможам пабачыць на свае вочы.

Размовы аб тым, што паміж словамі аб жаданьні інтэгравацца ў эўрапейскую эканоміку і рэальнымі дзеяньнямі ўладаў Беларусі ёсьць дыстанцыя вялікага памеру, пасьпелі ўсім надакучыць.

Тым ня менш, сёньня мы назіраем рэнэсанс дэмагогіі на прасторах Эўропы. Дэмагогія, як і дэмакратыя, між іншым, таксама адзін са здабыткаў сучаснай цывілізацыі, які дастаўся нам у спадчыну ад Старажытнай Грэцыі. І дзейнічае дэмагогія, як бачым, надзейна. Варта было кіраўніку дзяржавы паабяцаць, што ён некалі раскажа пра ўвесь нэгатыў ў дачыненьні да расейскага кіраўніцтва, які апошнія гады хаваў ад грамадзтва, варта было яму намякнуць, што некалі Беларусь будзе карыстацца адзінай валютай — эўра, як з усіх бакоў грымнуў радасны хор: «Асана!»

Вельмі хочацца верыць. Толькі не ў сябе, а ў некага, хто вырашыць усе нашыя праблемы, а галоўнае — раз і назаўсёды пазбавіць патрэбы думаць.

# Чаго ня (ні) зробіш дзеля літаратуры

Аркуш прапанаваў дзесяці паэткам зьняцца аголенымі.

Старшыня Таварыства вольных літаратараў Алесь Аркуш у сваім «Жывым журнале» ў Інтэрнэце зьмясьціў прапанову надрукаваць у часопісе «Калосьсе» ню-фотагалерэю 10 паэтак.

«Ясная справа, што Раісу Баравікову фатаграфаваць ня трэба. Маладзейшых. Бо мусім неяк шукаць новыя шляхі папулярызацыі беларускай паэзіі. Балазе «Наша Ніва» абвесьціла 2007 год годам паэзіі, — кажа Аркуш. — Думаю, што многія пагодзяцца. Ясная справа, мы не «Плэйбой» і ганарараў не заплацім, але ж будуць іншыя выгоды. Вядомасьць, прамоцыя. І іх вершы побач надрукуем. Лірычныя, пра каханьне».

У папярэдні сьпіс Алеся Аркуша трапілі Вольга Гапеева, Тацяна Нядбай, Наста Кудасава. Іншыя кандыдатуры будуць разглядацца.

**Зьміцер Панкавец**

Прапанова Алеся Аркуша выклікала жывую рэакцыю мужчынскай аўдыторыі і крытыку фэміністак: 1146 прачытаньняў і 57 камэнтароў на сайце nn.by за тыдзень. Падаем некаторыя зь іх.

**Mr.Octopus напісаў(ла) Студзень 24, 2007 у 23:40**

А яшчэ трэба выдаць такі каляндар, накшталт «Пірэлі», з аголенымі паэткамі. Каля кожнага фота — вершык. І спасылку на яе інтэрнэт-дзёньнік, калі мае.

**вольга гапеева напісаў(ла) Студзень 25, 2007 у 0:26**

Давайце лепш для папулярызацыі мужчынскай паэзіі разьмесьцім аголеныя целы нашых паэтаў — Хадановіча і маладзейшых :), каб ня сумна было жанчынам.

**Helios напісаў(ла) Студзень 25, 2007 у 8:05**

Нейкі натуральны ідыятызм! Паэзія паэзіяй, а разбэшчанасьць разбэшчанасьцю. Паэзію папулярызаваць трэба не «плэйбоем», а інтэлектам.

**Mr.Octopus напісаў(ла) Студзень 25, 2007 у 9:52**

Helios: у мяне так і паўстае перад вачыма карціна: заходзіць сп.Helios у музэй «Мэтраполітэн» у Нью-Ёрку, ідзе праз залю з Рубэнсам і думае: «Ну і разьбешчанасьць!» Дык разаб'ем кувалдай Вэнэру Мілоскую! Што яна цыцкі выставіла? А паэтак — у паранджу ды замуж! Вершы каб пісалі чыста інцелектуальныя — пра пцічак, мову і родную старонку гаротную. І пра долю жаночую. За інтэлектуальную неразьбешчаную Беларусь!

**Сікавы Бурбулік напісаў(ла) Студзень 25, 2007 у 10:48**

Аркушу і самому трэба зьняцца ў такім самым выглядзе. На кожнай старонцы календара буйным плянам — паэтка, а малым — Аркуш у розных позах. Што ні аркуш — то новы Аркуш!

**Алена Гапава напісаў(ла) Студзень 25, 2007 у 19:49**

Хачу далучыцца да прапановы Вольгі Гапеевай і Бурбуліка і разьвіць іх далей: вазіць распранутага Аркуша ня толькі па школах, але, калі стане цёпла, і па вуліцах. Я абсалютна ўпэўнена, што гэта ўздыме цікавасьць да паэзіі.


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Алесь Аркуш.**

**Алесь Аркуш напісаў(ла) Студзень 26, 2007 у 11:24**

Мая прапанова не была такая радыкальная — аголеныя паэткі. Вялося пра прыгожыя, эстэтычныя, эратычныя здымкі. Бо тыя, якія друкуюцца ў сучасных літчасопісах — як з камсамольскіх білетаў. На маім блогу я прапанаваў скласьці сьпіс 10 самых прыгожых паэтак. Каб затым правесьці фотасэсіі. А такія прамотары як Марыйка Мартысевіч перататварылі гэтую прапанову ў скандал.

**žeŭžyk напісаў(ла) Студзень 26, 2007 у 12:31**

Fajny kreatyŭ. Dziakuj Arkušu. Hetki intelektualny enerdžajzer. Jašče nikoha nie nadrukavali, a ŭsie ŭžo ŭjavili. I aburylisia svajmu ŭjaŭleńniu. Paprakać Arkuša možna tolki za «ŭviadzieńnie ŭ spakusu» :*)

**Michal Zaleski напісаў(ла) Студзень 26, 2007 у 21:04**

Прыгажосьць словаў, прыгажосьць душы, прыгажосьць цела. Па ўсім відаць, чаму тут целаў саромеюцца і зь целаў сьмяюцца.

**Алена Гапава напісаў(ла) Студзень 27, 2007 у 4:18**

АА, Міхалу Залескаму і іншым: тут ня цела саромеюцца. Тут працістаяць ператварэньню жаночага цела ў тавар. Хочаце прадаць вершы з дапамогай цела — прадавайце свае. Распранайцеся і рэклямуйце.

# Эканомія беларускімі сродкамі



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Беларусы паступова прызвычайваюцца да эканоміі. У гарадзкіх кватэрах даўно ня дзіва лічыльнікі вады. Новыя цэны на газ відавочна падштурхнуць да пошукаў лічыльнікаў спажываньня газу. Цяпер нават улады зразумелі, што без эканоміі не абысьціся. Балазе беларускія прадпрыемствы ўжо колькі год вырабляюць лічыльнікі на розныя патрэбы.

Лічыльнікі вады выпускаюць у Менску. Завод «Электроніка» выпускае кватэрныя электронныя лічыльнікі халоднай і гарачай вады. ААТ «МВАВТ» ды прадпрыемства «Армас» прапаноўваюць лічыльнікі спажываньня вады і цяпла.

Лічыльнікі электраэнэргіі вырабляюць Берасьцейскі электрамэханічны завод і Віцебскі завод электравымяральных прыбораў.

Лічыльнікі газу прапаноўваюць Менскі завод імя Вавілава і той самы Берасьцейскі электрамэханічны.

З прадукцыяй можна азнаёміцца на віртуальным кірмашы (http://minprom.gov.by/yarm.

**Сямён Печанко**

# 725 суайчыньнікаў жывуць ужо другое стагодзьдзе

Хаця правільней казаць — беларусак: сто гадоў пражылі 637 жанчын, мужчын жа — усяго 88. Найстарэйшая беларуска жыве ў Менску. Гэта Ганна Барысевіч, ёй 118 гадоў. На год пазьней за яе, у 1889-м, нарадзілася жыхарка Маладэчна Ганна Рагель, а ў 1890-м — Стэфаніда Брычкоўская зь вёскі Радагошча на Наваградчыне.

Больш за ўсё доўгажыхароў у Гарадзенскай вобласьці — 182 чалавекі ў веку за 100 гадоў. У Менскай вобласьці — 143 доўгажыхары. У Берасьцейскай — 104. У Віцебскай — 103. У Гомельскай — 76. У Магілёўскай — 65. У Менску — 52 чалавекі.

**Паводле БелТА**

# Аўтобус праехаў 2 км на аўтапілоце

Здарэньне адбылося пад Горадняй, на дарозе паміж Путрышкамі і Верцялішкамі. У кіроўцы прыгараднага маршруту здарыўся інсульт. Некіраваны аўтобус пратараніў тры легкавікі. Пасажыры ўварваліся ў кабіну і спынілі аўтобус. На шчасьце, ніхто не загінуў.

**СП**




# Першы глянцавы часопіс для «пані» па-ўкраінску

Выйшаў пілётны нумар першага ўкраінскамоўнага глянцавага жаночага штотыднёвіка. Часопіс прысьвечаны парадам, рэцэптам, модзе і прыгажосьці. Выданьне на 52 старонкі будзе выходзіць штотыдня. Цана —1,5 грыўны (600 рублёў). «Пані» складзе канкурэнцыю часопісам «Лиза» і «Полина».

**АК**

# Аўстралія Мірнаму не пакарылася

У фінальным матчы парнага разраду Адкрытага чэмпіянату Аўстраліі па тэнісе Макс Мірны (**на фота зь Вікторыяй Азаранкай**) і швэд Ёнас Б’ёркман у суботу саступілі найлепшай пары турніру і сьвету амэрыканцам-блізьнятам Бобу і Майку Браянам — 5:7, 5:7. Гульня скончылася, калі ў Менску яшчэ не разьвіднела — розьніца з Мэльбурнам складае дзевяць гадзінаў. Перад гэтым завяршыўся жаночы фінал. Сэрэна Ўільямс упэўнена перамагла прадстаўнічку Расеі зь беларускімі каранямі Марыю Шарапаву — 6:1, 6:2. Амэрыканка стала трохразовай чэмпіёнкай Australian Open.

А праз два тыдні беларус і швэд сыдуцца ў паядынку адзін супраць другога. 9—11 лютага ў Менску пройдзе матч Кубку Дэвіса Беларусь — Швэцыя.

**АГ**


REUTERS

# Афіцыянту, які наліваў Літвіненку чай, засталося жыць пяць гадоў



Набэрта Андрадэ, 67-гадовы афіцыянт (**на фота**), які абслугоўваў у лёнданскім бары былога палкоўніка ФСБ Аляксандра Літвіненку, што памёр ад атручаньня паленіем, пражыве ня больш за пяць гадоў. Пра гэта паведамляе газэта Sun. «Лекары кажуць, што мне засталося жыць пяць гадоў, можа, шэсьць. Мае шанцы захварэць на рак узьляцелі. Калі яны забілі Літвіненку, яны забілі й мяне. Розьніца ў тым, што мая сьмерць будзе даўжэйшай», — сказаў бармэн.

**АК**

# Дырэктар Сусьветнага банку ходзіць у дзіравых шкарпэтках

Пол Вулфавіц знаходзіўся ў Турцыі два дні. Гэта быў ягоны першы візыт у гэтую краіну пасьля ўступленьня на пасаду дырэктара Сусьветнага банку ў чэрвені 2005 г. Вулфавіц быў асабліва вядомы сярод амэрыканскіх нэакансэрватараў сваімі «ястрабінымі» поглядамі і падтрымкай ўварваньня ЗША ў Ірак.

Падчас свайго візыту Вулфавіц спаткаўся з усімі найбольш значнымі турэцкімі палітыкамі, а таксама наветаў мячэць Сэліміе у Эдзірнэ. Візыт у сьвятыню скончыўся, аднак, немалым канфузам – высьветлілася, што вартаўнік сусьветных грошаў ходзіць у… дзіравых шкарпэтках. Вулфавіц быў вымушаны зьняць чаравікі, бо ў мячэць нельга ўваходзіць у абутку.

Канфуз Вулфавіца шырокім рэхам адгукнуўся ў турэцкіх СМІ, якія даволі зьедліва камэнтавалі дзіравыя шкарпэткі дырэктара Сусьветнага банку.

Гэта была не адзіная памылка Вулфавіца. На другі дзень візыту ён пайшоў на рынак, дзе яму на вочы трапіліся дзьве срэбныя бранзалеткі. Калі ж прыйшоў час заплаціць за іх 150 эўра, высьветлілася, што Вулфавіц ня мае пры сабе гэтулькі грошай. Зь непрыемнай сытуацыі яго выратаваў ахоўнік, які пазычыў шэфу патрэбную суму.

**Вольга Данішэвіч; Gazeta.pl**

# Windows Vista — ці варта мяняць «Вокны»?

Уначы з панядзелка на аўторак новая апэрацыйная сыстэма Windows Vista трапіла на паліцы крамаў.

На думку Гейтса, галоўная адметнасьць навінкі — мультымэдыйныя рашэньні. Vista спросьціць захоўваньне фота, музыкі, фільмаў — кампутар мае быць хатнім забаўляльным цэнтрам.

Vista дасьць волю бацькам па кантролі за дзецьмі. У ёй можна блякаваць інтэрнэтстаронкі, праграмы, гульні, вызначаць гадзіны, калі дзіця можа карыстацца кампутарам, а калі кемлівы дзіцёнак улезе ў Інтэрнэт, бацькі атрымаюць ад Vista поўную справаздачу яго віртуальных вандровак. Максымальная цана сыстэмы — 399 даляраў. Vista даступная ў 19 мовах, але да канца году іх будзе 99, сярод іх абяцалі беларускую.

**ВД**

## ПАВЕДАМЛЯЕ РАДЫЁ «ПАЛЁНІЯ»

### Эўразьвяз чакае Украіну

Больш за палову жыхароў шасьці краінаў Эўразьвязу выказалася за далучэньне Украіны да Эўразьвязу. Арганізацыя дасьледаваньня грамадзкай думкі «Opinion» правяла апытаньні ў Польшчы, Нямеччыне, Гішпаніі, Францыі, Італіі, Вялікай Брытаніі, а таксама Украіне. Найбольш прыхільнікаў далучэньня Украіны да ЭЗ аказалася ў Польшчы. Палякі хочуць гэтага нават больш, чым самі ўкраінцы. «За» выказалася 73% палякаў і 55% украінцаў. Кіеў таксама можа разьлічваць на Гішпанію ды Францыю — там пашырэньня Эўразьвязу на Украіну жадаюць больш за палову апытаных. Горай у Вялікай Брытаніі й Нямеччыне, дзе «за» выказалася 47 і 44% адпаведна. Аналягічныя дасьледаваньні рабіліся ў канцы 2005 г., тады колькасьць прыхільнікаў уваходу Украіны ў Эўразьвяз склала ў сярэднім 51%, або на 4 пункты менш, чым цяпер.

### «Сапраўднае імя»

«Сапраўднае імя» — так называецца акцыя, якую распачалі баранавіцкія сябры незарэгістраванай арганізацыі «Малады Фронт». Яе мэтай зьяўляецца зьмена савецкіх назваў гарадзкіх вуліц на гістарычныя беларускія. Паводле іх словаў, у той час, калі бальшавіцкія рэпрэсіі закранулі амаль кожную сям'ю ў Беларусі, імёны савецкіх катаў дагэтуль увекавечаныя ў назвах вуліц і плошчаў. «Людзі павінны ведаць і памятаць імёны сапраўдных герояў і вялікіх дзеячоў Беларусі».

**Паводле сайту: www.polskieradio.pl/zagranica/by**




WWW.SVABODA.ORG

**На Эканамічным форуме ў Давосе ўкраінскі прэм'ер Віктар Януковіч пераконваў сусьветны бізнэс у стабільнасьці эўрапейскага выбару Украіны.**



**Павал Севярынец** — у 1998 — 2004 г. лідэр незарэгістраванага «Маладога фронту». Асуджаны за арганізацыю акцыяў пратэсту пасьля рэфэрэндуму 2004 году. Цяпер у высылцы ў Малым Сітне, на поўначы Полаччыны.

ПАВАЛ СЕВЯРЫНЕЦ

# Сабачае шчасьце

Вось ужо некалькі тыдняў наведнікаў сіценскага інтэрнату сустракае шматгалосы віск ды скавытаньне з-пад ганку. Якраз на сьвяты ў дашчанай скрынцы з прыступкамі ашчанілася дварняжка Мільда.

Нягледзячы на бадзяжны выгляд, рост 30 сантымэтраў і вагу кіляў пяць, Мільда — псіна баявая. Службовая. Рабочы Сяргей, які вартуе на лесапавале тралёвачныя трактары, бэнзын ды вагончык зь лесьніковым снадзівам, заўжды бярэ Мільду з сабою. Доўгімі зімовымі вечарамі, калі гаспадар глушыць «максімку» або адсыпаецца, задача Мільды — гаўкаць пры набліжэньні чужых ці начальства, а раніцай — будзіць Сяргея да прыезду вахтоўкі. На Каляды, убачыўшы ў сваёй *карацупы* добрае бруха, вартаўнік кінуў яе ў вёсцы.

У маразы Мільдавы шчанюкі наўрад ці б выжылі, але дзякуючы эўрапейскай зіме бадзёра пішчаць. Цяпер Мільду, якую раней пінком адганялі ад форткі, ласкава кормяць і «хімікі», і майстрыца, і вясковыя рабочыя. Цешацца ўсе — трэба меркаваць, да тае пары, пакуль з-пад ганку ня вылезуць чатыры ці пяць новых дварняжак.

Увогуле, сабакаў у Сітне больш, чым кароваў ды сьвіньняў, разам узятых. Апроч свойскіх, пераважна аўчарак, па вёсцы гойсаюць колькі дзясяткаў дзікіх — калматых, пярэстых, вялікіх ды маленькіх, невядома якое пароды. Шыльды «Асьцярожна: злы сабака!» тут ня маюць сэнсу: злы сабака ў двары — гэта само сабою (хаця вартаваць у большасьці хатаў няма чаго). Ані ў бацькавай Унорыцы на Дняпры, ані ў матчыным Лунінцы столькі сабакаў ня бачыў.

Увечары *дзікія сабакі Сітна* ператвараюцца ў сапраўдных валадароў вёскі. Некаторыя гаспадары спускаюць сваіх азьвярэлых братоў меншых з ланцугоў — і ў выніку ў сельсавет штотыдня трызвоняць напалоханыя або пакусаныя жыхары.

Абмяжоўваюць колькасьць сіценскае зграі хіба начныя ваўчыныя рэйды ў моцныя маразы — бывае, рэжуць нават аўчарак на падворках.

Харчуецца ўся папуляцыя на вясковых сьметніках, ад чаго памыйныя кучы

## ХРОНІКА

### Адліга

Крымінальная справа ў дачыненьні да актывіста незарэгістраванай моладзевай арганізацыі «Малады Фронт» **Сержука Гумінскага** зачыненая праз адсутнасьць доказаў. Пра гэта яму паведамілі ў аршанскай міліцыі.

12 студзеня яму прад'явілі афіцыйнае абвінавачаньне паводле арт. 314 «Псаваньне дзяржаўнай маёмасьці» нібыта за выкананьне графіці ў горадзе. Перад мясцовымі выбарамі малады чалавек быў зьбіты супрацоўнікамі міліцыі і адсядзеў трое сутак арышту.

### Свабода друку

У Нясьвіжы мясцовае аддзяленьне «Менаблсаюздруку» адмовілася прадаваць у сваіх кіёсках **недзяржаўную рэгіянальную газэту «Нясьвіжскі час»**.

У гэтым годзе выданьне ўжо адмовіліся рэалізоўваць гандлёвае прадпрыемства «Нясьвіжскі гархарчпрамгандаль» і крама «Новае месца». З гэтай прычыны наклад газэты зьнізіўся з 2100 асобнікаў да 1700. Праз шапікі «Саюздруку» рэалізоўвалася 250 асобнікаў газэты.

### Алесь Каліта

Старшыню Рады моладзі БНФ **Алеся Каліту** зьнялі зь цягніку, на якім ён накіроўваўся ў Вільню. На памежнай станцыі Гудагай памежнікі канфіскавалі ў яго партатыўны кампутар і флэш-карту.

Свае дзеяньні памежнікі патлумачылі ўказаньнямі правяраць грамадзянаў памежнымі войскамі з мэтаю выяўленьня матэрыяльных носьбітаў са шкоднай для беларускага грамадзтва інфармацыяй.

### Цягнуць з рэгістрацыяй

Міністэрства юстыцыі Беларусі патрабуе дадатковыя дакумэнты па ўстаноўчай канфэрэнцыі Саюзу левых партыяў (СЛП), што адбылася ў Чарнігаве 17 студзеня. Адпаведны ліст за подпісам кіраўніка ўпраўленьня грамадзкіх аб'яднаньняў і палітычных партыяў Міністэрства юстыцыі **Алега Сьліжэўскага** прыйшоў у офіс Партыі камуністаў Беларускай (ПКБ). Мінюст запытаў рэгістрацыйныя пратаколы дэлегатаў канфэрэнцыі, пратаколы кіруючых органаў партыяў, што ўваходзяць у СЛП, аб прыняцьці рашэньняў па стварэньні Саюза, пратакол аб стварэньні аргкамітэту і «іншыя тэхнічныя дакумэнты».

**26 студзеня**

### Статкевіч адведаў бацьку

Лідэру сацыял-дэмакратаў **Мікалаю Статкевічу**, які адбывае «хімію» ў Пухавіцкім раёне Менскай вобласьці, упершыню за паўгоду дазволілі наведаць хворага бацьку ў Баранавічах. Палітыка не выпускалі з інтэрнату на навагоднія сьвяты. 26 студзеня позна ўвечары Статкевічу дазволілі пайсьці ў адпачынак да панядзелка.

### Не пусьцілі

**Кшыштаф Путра** меўся наведаць Гародню і сустрэцца з актывістамі апальнага Саюзу палякаў. Аднак на мяжы без тлумачэньня прычынаў яго павярнулі назад.

### Заступіліся

Упраўленьне справамі прэзідэнта паведаміла **РГА «Беларускі Хельсінскі Камітэт» (БХК)** пра скасаваньне бестэрміновай дамовы арэнды офісу Камітэту і запатрабавала вызваліць памяшканьне. Страта юрыдычнага адрасу недзяржаўнай арганізацыяй можа прывесьці да яе ліквідацыі як юрыдычнай асобы. БХК ня мае запазычанасьці па аплаце арэнднай платы і ў адпаведнасьці з законам мае пераважнае права на падаўжэньне або перазаключэньне дамовы арэнды таго самага памяшканьня. У адмысловай заяве Міжнародная Хельсінская Фэдэрацыя назвала нежаданьне арэндадаўцы падоўжыць дамову «палітычна матываваным» і заклікала ўлады падоўжыць арэнду.

### Не рэкамэндуюць гаварыць па-беларуску

Бацька палітвязьня **Вячаслаў Дашкевіч** паведаміў, што супрацоўнікі калёніі папярэджвалі **Зьмітра**, каб ён не размаўляў у часе спатканьня па-беларуску. У адваротным вы-

набываюць надзвычай маляўнічы выгляд. Найвялікшае ў вёсцы *сабачае шчасьце* разьмяшчаецца якраз за нашым інтэрнатам — апроч «хімікаў» ды рабочых, у яму ў 50 мэтрах ад бараку зносяць адкіды жыхары суседніх дамоў. У выніку, як ты ні закопвай пакункі са сьмецьцем, за ноч сабакі растрыбушаць усё да апошняга шматка. Уяўленьне такое, быццам тут выбухнула бомба, начыненая памыямі, пакінула глыбокую варонку, а ўдарная хваля разьнесла бляшанкі, цэляфан, паперкі ды невядомую клятчатку.

Часам здаецца, што сабакам у Сітне жывецца лепш, чым людзям. Калі чуеш, як п’яныя вяскоўцы брэшуць на сваіх дзяцей, бачыш, зь якой сабачай прагай малыя зь «ненадзейных» сем’яў кідаюцца на тую пячэніну ці цукерчыну, або як школьнікі сігаюць за плот ад вялізнага барбоса, спушчанага з ланцугу — думаеш, што сабакам тут якраз пашанцавала.

Задаволена павіскваюць Мільдавы шчанюкі, аб’ект усеагульнае ўвагі ды клопату. Мітусяцца вакол людзі. Глядзіш на такую рэдкую ў гэтых краёх чалавечую ласку, пяшчоту, ціхую радасьць — і згадваеш, што вось гэты вясковец, які, пацмокваючы, падкладае Мільдзе костку, нядаўна выгнаў на вуліцу сужыцельку зь дзіцём; кабеціна, у якой аж вочы сьвецяцца каля тых шчанюкоў, пазбаўленая бацькоўскіх правоў за хранічны алькагалізм; а мужык, што пачэсвае дварняжку за вухам, адбывае «хімію» за нявыплату аліментаў.

І ўсё-такі: гэта любоў.

…На Раство да мяне прыяжджалі пратэстанты-прадпрымальнікі зь Менску. Пачаставалі на вуліцы параю мандарынаў тых дзетак, убачылі, як зьбегліся астатнія, ды, пакінуўшы 50 тысячаў, папрасілі павіншаваць усіх малых у Малым Сітне. Мне кінулася ў вочы адно: і загадчыца сельпо, у якой закупаў цукеркі, печыва ды садавіну, і супрацоўніца дзіцячага садка, і настаўніца ў школе, якім адносіў ласункі з просьбай раздаць на Раство «ад эвангельскіх хрысьціянаў», і бацькі на елцы — апускалі вочы.

Значыць, няёмка. Сорамна.

Значыць, ёсьць надзея, што ня вытаптаныя, ня згаслыя канчаткова агменьчыкі сумленьня й спагады ўрэшце разгарацца. Што беларусы адчуюць любоў Божую, любоў да блізкага свайго, да братоў — і большых, і меншых… Што адшукаюць яны шлях да Вялікага Чалавечага Шчасьця. Шлях, якім ёсьць нацыянальнае абуджэньне.

*в.Малое Сітна*

І ўсё-такі: гэта любоў.

## ХРОНІКА

падку яны пагражалі перапыніць спатканьне. На спатканьні высьветлілася, што палітвязень атрымлівае далёка ня ўсе лісты, якія яму дасылаюць. Ягоныя бацькі таксама з 9 лістоў Зьмітра атрымалі толькі два.

**27 студзеня**

### Казулін зь сям’ёй

Гэта было першае доўгатэрміновае спатканьне палітзьняволенага зь сям’ёй з моманту зваленьненя. А. Казуліна наведалі жонка Ірына з дочкамі Вольгай і Юляй. Спатканьне доўжылася 3 дні.

**29 студзеня**

### Мілінкевіча палохаюць

Лідэр дэмакратычных сілаў Беларусі **Аляксандар Мілінкевіч** абавязаны да 10 лютага выплаціць 4 мільёны 650 тысяч рублёў штрафу, прысуджанага яму судом Кастрычніцкага раёну Менску нібыта за «наўмыснае незаконнае перасячэньне мяжы». Разам з копіяй судовай пастановы Аляксандар Мілінкевіч атрымаў папярэджаньне аб абавязковай выплаце да 10 лютага сумы штрафа. У адваротным выпадку яму пагражае забарона на выезд зь Беларусі. Суд адбываўся ў адсутнасьць Мілінкевіча, які даведаўся пра працэс, знаходзячыся з візытам у Літве, дзе сустракаўся з міністрам замежных справаў гэтай краіны.

### КХП-БНФ адмовілі

Вярхоўны суд адмовіў Сойму Кансэрватыўна-хрысьціянскай партыі — БНФ ва ўзбуджэньні крымінальнай справы па факце фальсыфікацыі прэзыдэнцкіх выбараў 19 сакавіка 2006 г.

Падставай для звароту ў Вярхоўны суд сталі словы Аляксандра Лукашэнкі на прэс-канфэрэнцыі з украінскімі журналістамі 23 лістапада 2006 года пра фальсыфікацыю выбараў. У адказе Вярхоўнага суду сказана, што разгляд заявы не знаходзіцца ў кампэтэнцыі Вярхоўнага суду Беларусі, паведаміў Ю.Беленькі. Паводле яго словаў, КХП-БНФ не мае намеру спыняцца на такім адказе: на чарзе запыт у Вярхоўны суд з просьбай растлумачыць, якія органы маюць права ўзбуджаць крымінальную справу па факце фальсыфікацыі выбараў.

**30 студзеня**

### Ня стой пад партрэтам

Жыхароў Сьветлагорску **Натальлю Бордак** і 17-гадовага **Арсеня Ягорчанку** затрымалі па падазрэньні ў вывешваньні партрэту палітвязьня **Казуліна**. Затрыманьне праводзілі міліцыянты **Яўген Кісьлякоў** і **Яўген Фей**. Нагодай для затрыманьня было тое, што Натальля і Арсень стаялі побач са сьцяною, на якой вісеў здымак Казуліна. Па словах затрыманых, міліцыянты правялі ў адсутнасьць панятых нагляд асабістых рэчаў, а Ягорчанку сяржант Кісьлякоў нібыта яшчэ й добра патоўк. У пастарунку затрыманыя правялі дзьве гадзіны, іх пыталіся, што яны рабілі каля партрэта Казуліна. Пацярпелыя зьвярнуліся ў раённую пракуратуру з просьбай праверыць правамернасьць дзеяньняў міліцыянтаў.

### «Гомельская праўда» абвяргае непраўдзівыя зьвесткі пра актывіста АГП

Абласная газэта **«Гомельская праўда»** пагадзілася без працэдуры судовага разьбіральніцтва апублікаваць абвяржэньне абразьлівых зьвестак у дачыненьні да старшыні Гомельскай гарадзкой арганізацыі Аб`яднанай грамадзянскай партыі **Андрэя Толчына**. Гэтыя зьвесткі былі надрукаваныя напрыканцы мінулага году ў артыкуле «А вы, друзья, как ни садитесь…» за аўтарствам нейкага **Пятра Кузьміна.** Андрэй Толчын зьвярнуўся ў суд Чыгуначнага раёну з пазовам да «Гомельскай праўды». **Судзьдзя Крупадзёраў** прапанаваў бакам ўрэгуляваць спрэчку мірным чынам. Як высьветлілася, аўтарам таго артыкулу апынулася прадстаўніца газэты **Алена Аленчанка.** Рэдакцыя газэты пагадзілася апублікаваць абвяржэньне ды прынесьці прабачэньне партыйнаму актывісту. Ад спагнаньня з «Гомельскай праўды» ды аўтара грашовай кампэнсацыі за маральную шкоду актывіст АГП адмовіўся.

**СП**

**Кароткі зьмест папярэдніх сэрый. Просты хлопец Бульбашэўскі вырашыў стаць першым беларускім супэрмэнам Бульбманам. З дапамогай мудрага парсюка Тараса ён распачаў падрыхтоўку...**




МАЛЯВАЎ ЛЯВОН ВОЛЬСКІ

# Дзякуй за ахвяраваньні

Міхаілу С., Мікалаю П., А.Б., В.Д., Ільясу Х., В.П., Тацяне В., А.К., В.К., Алене П., Э.Г., Анатолю К., Сяргею А., А.С., А.К., Міхаілу Ш., Юр’ю М., Г.П., Максіму С., Васілю Б., Раісе К., Сьвятлане Б., С.Б., Г.С., Віктару Д., Сьвятлане Р., Людміле Л., В.П., В.Г., Веры С., Уладзімеру Н., Яўгену Л., Тацяне К., Нэлі А., Сяргею З., Рэгіне В., Максіму Ш., Валянціну Л., Аляксандру П., Тацяне Ц., Марыі М., Віктару М., Вячаславу Р., С.Д., Сяргею Ц., Вандзе К., А.С., Ірыне Ц., С.К., Міхаілу Ж., Анатолю Ч., Сяргею М., Алегу А., Э.З., Галіне Р., Вользе А., Паўлу Л., Д.К., Сьвятлане Ц., У.К., Дар’і С., Івану Я., Сяргею П., В.Н., А.Р., Уладзімеру Ц., Анатолю К., Мікалаю Л., Я.А., С.С., А.Я., У.Р., Аляксандру П., А.А., Іне К., Антаніне Д., Вадзіму Ж., Ігару М., Альбэрту Е., Тацяне Я., Яўгену Р., Ігару П., М.У., Элеаноры С., Марыі Г., Уладзімеру Ш., Сяргею Т., Івану Р., Валер’ю З., Івану П., Георгію Ш., Мікалаю С., Ірыне З., Валер’ю С., Леаніду В., Натальлі Л., Л.П., Ірыне Г., Н.Б., Людміле І., Вользе Б., Жаньне П., Леаніду Г., Ігару С., Валер’ю С., Аляксандру К., Стэфану Н., Адаму Ш., Алесю Дз., Ігару Г., Станіславу Б., Віталю Ч., Анатолю С., Барысу Я., П.Д., Натальлі М., Л.І., Аляксандру А., Тацяне Г., Зінаідзе К., З.А., Г.А., Зьмітру С., Фёдару П., Васілю Б., Ларысе Ф., Вадзіму Г., Уладзімеру Ч., Ганьне Т., Людміле М., Аляксандру К., Віктару С., М.Д., Рагнедзе А., Яўгену М., І.Н., Аляксандру П., К.П., В.Дж., Тацяне В., Жане П., Э.К., Сяргею К., Ліліі Б., А.М., Аляксандру Ч., Сяргею Л., Мікалаю С., М.Г., Алене Ц., А.Б., Але Г., А.М., В.В., З.Г., Уладзімеру Т., Ліліі К., Аляксандру К., Ільлі Ч., В.К., Ю.Ш., В.Г., Марыі Б., Вользе Я., Натальлі К., Андрэю М., Настасьсі Ж., Н.Ф., Ю.Ф., Тацяне В., Людміле І., Натальлі Г., Валер’ю Ш., Міхалу Б., А.І., Аляксандру Е., Уладзімеру К., Віталю Б., Ганьне Ф., Алегу Ч., Ксеніі Д., Н.А., Зьмітру В., Паўлу Е., Ганьне Р., М.Н., А.Г., Ігару М., М.Б., І.В., Я.Б., Андрэю П., Уладзімеру С., Раісе К., Сяргею П., Дзянісу Ш., Паўлу П., І.Л., Уладзімеру Ж., Рэгіне К., Натальлі Ц., Н.Р., А.К., Аляксандру Р., Сяргею Ф., А.Л., Ірыне Г., А.А., Т.В., Сьвятлане Б., Лідзіі І., А.М., В.Г., Л.Н., Юр’ю Я., А.Ф., Тацяне Б., Уладзімеру С., Андрэю Л., Алісю П., Н.Б., Віктару П., Алегу С., А.Р., Надзеі С., Алене М., Тамары Ц., Маргарыце Х., Анатолю Я., Генадзю Л., Міколу П., Валянціну В., Ігару С., Аляксандру Н., А.Р., Крысьціне В., С.К., Тамары С., Валер’ю В., Паўлу К., В.К., Зьмітру М., В.Я., Розе Г., Зьмітру К., Лідзіі К., Т.П., Сяргею К., Ксеніі Ф., Мікалаю К., Юр’ю М., А.Р., Ільлі П., Алене М., Т.Г., П.Б., А.С., Паўлу Н., Віктару Ж., С.М., Мікалаю Дз., Я.Л., А.С., Віталю З., Дз.С., Аляксандру Б., Івану Ж., Надзеі І., В.З., Ніне К., Т.К., Мікалаю К., Рагнедзе А., Яўгену М., І.Н., Аляксандру П., К.П., В.П., Тацяне В., Жане П., Э.К., Сяргею К., Ліліі Б., А.М., Аляксандру Ч., Сяргею Л., Мікалаю С., М.Г., Алене Ц., А.Б., Але Г., А.М., В.В., З.Г., Уладзімеру Т., Ліліі К., Аляксандру К., Ільлі Ч., В.К., Ю.Ш., В.Г., Марыі Б., Вользе Я., Натальлі К., Андрэю М., Настасьсі Ж., Н.Ф., Ю.Ф., Тацяне В., Людміле І., Натальлі Г., Валер’ю Ш., Міхалу Б., А.І., Аляксандру Е., Уладзімеру К., Віталю Б., Ганьне Ф., Алегу Ч., Ксеніі Д., Н.А., Зьмітру В., Паўлу Е., Ганьне Р., М.Н., А.Г., Ігару М., М.Б., І.В., Я.Б., Андрэю П. зь Менску.

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521

МГД ААТ «Белінвестбанк», вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка: **3015 212 000 012** Асабовы рахунак:

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| Ахвяраваньне | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

Касір

Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521

МГД ААТ «Белінвестбанк», вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка: **3015 212 000 012** Асабовы рахунак:

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| Ахвяраваньне | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

КВІТАНЦЫЯ

Касір М.П.

## Каб штотыдзень атрымліваць газэту,

**дасылайце адрасы і прыватныя ахвяраваньні.**

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32 (МТС), (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@tut.by, паштовы адрас: а/с 537, 220050 Менск.

2) Просім кожную сям’ю чытачоў **пералічваць на рахунак** газэты ахвяраваньне з разьліку 8000 рублёў на месяц. Гэтага хопіць на выхад і дастаўку газэты. **У бланку банкаўскага паведамленьня ці паштовага пераказу дакладна і разборліва пазначайце адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад’езду.** Тыя, хто перакажа 24000 рублёў за раз, забясьпечаць выхад «НН» на 3 месяцы. Хто перакажа 48000 рублёў адразу, гарантуе публікацыю «НН» на паўгоду.

# Павольная дывэрсія супраць беларускіх вытворцаў

Расея абвесьціла, што імпарт беларускіх прадуктаў будзе магчымы толькі ад тых прадпрыемстваў, што атрымаюць нейкі расейскі сэртыфікат (сэртыфікат ISO 9001 для іх няважны). Што гэта азначае? Тое, што гэтыя прадпрыемствы апынуцца на кручку ў Расеі, і збанкруціць іх альбо давесьці да крытычнага стану (напрыклад, каб прыбраць да рук) — справа тэхнічная.

Чаму Лукашэнка не прадпрымае адпаведных захадаў да расейскіх прадуктаў? Крамы заваленыя расейскімі пяльменямі, кілбасамі, кансэрвамі, напоямі, слодычамі, але гэта зусім не прыкмета іх добрай якасьці і папулярнасьці ў спажыўца (хто купляў — ведае, што ў большасьці выпадкаў гаворка пра нізкасартовыя харчы). Прычына ў тым, што для расейскіх тавараў (ня толькі харчовых) у нас створаныя больш ільготныя эканамічныя ўмовы, чым для беларускіх!

Напрыклад, для расейскіх тавараў (як для імпартных) скасаваны максымальны ўзровень раздробнай гандлёвай надбаўкі, у той час як на беларускія тавары ён устаноўлены ў памеры 30% (перавышаць нельга), а на малочныя вырабы і то меней. Гэта значыць, простаму камэрсанту выгадней працаваць з расейскімі таварамі — на іх асноўны навар, а беларускія ён трымае хіба па разнарадцы з выканкаму (рэкамэндуюць мець пэўную долю «айчыннага»). Прадаў расейскі сырок — зарабіў 50% (а захоча — 70%!), прадаў беларускі — да 30% (болей — штраф).

Далей: паўсюль у Беларусі, акрамя Менску, у раздробавым гандлі на імпартныя тавары «трэціх краін» (не расейскія і не беларускія) дзейнічае мясцовае мыта ў памеры 15% (гэта вялізны падатак са звароту, параўнальна большы за ПДВ і нават за мыта!). На расейскія ж тавары ён усталяваны ў памеры 5% (як і на «айчынныя»).

Дык выходзіць, для расейскіх тавараў на раздроб (пра аптовы гандаль асобная гаворка!) дзейнічае, калі для іх выгадна, — крытэр «імпартны», а калі нявыгадна — крытэр «айчынны».

Гэта павольная дывэрсія супраць нашых вытворцаў, якія да таго ж, у адрозьненьне ад расейскіх канкурэнтаў, цягнуць вялізны сацыяльны цяжар ды традыцыйна дбаюць пра якасьць, што кладзецца ў сабекошт. Ужо й казаць лішне пра адрозны ў разы кошт энерганосьбітаў для расейскага вытворцы і для нашага.

**Вадзім Карцаў, Менск**

## Адрас КХП-БНФ

**Шаноўная рэдакцыя газэты «Наша Ніва», віншую вас са стагодзьдзем газэты і з Новым 2007 годам.** Няхай сонейка заўсёды сьвеціць у вашыя вокны і, канечне, жадаю вам шмат новых чытачоў. Калі ласка, падкажыце каардынаты Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі БНФ. Дзякуй! Жыве Беларусь! Жыве «Наша Ніва»!

**Георгі Пракаповіч, Менск**

Адрас Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі БНФ такі: пр.Скарыны, 133, кв. 147. Тэл. +375-29-670-24-92. Сайт партыі www.pbnf.org.

## Хачу пакаяцца

**Нельга прамаўчаць, калі настаў векавы юбілей «Нашай Нівы»!** Віншую, віншую, віншую!!! Жадаю ўсяго самага найлепшага, хай вашыя вялікія творчыя посьпехі будуць яшчэ большыя, хай вечна выходзіць газэта «Наша Ніва» і жыве Беларусь!

Хачу расказаць, як я прыйшла да «НН». У 1992 г. маёй дачцэ, студэнтцы лінгвістычнага ўнівэрсытэту, выкладчыкі параілі выпісаць «НН». Так у нашай сям'і зьявілася гэтая газэта. Мы неяк адразу палюбілі яе, зразумелі, што яна навучыць нас адчуваць сябе беларусамі, спазнаць гісторыю Беларусі, даведацца пра знакамітых беларусаў ва ўсім сьвеце. З таго часу і не разлучаемся з «НН».

А тут яшчэ менавіта ў 1992 г. прыдбала двухтомнік Алега Лойкі, земляка свайго на Слонімшчыне, якога ў гэтым годзе Алесь Пашкевіч з нагоды юбілею назваў доктарам беларускасьці. Бываюць жа такія супадзеньні: «НН» і Алег Лойка — дзьве вялікія крыніцы беларускасьці — у адным годзе зьявіліся ў маёй хаце.

А праз некалькі гадоў у нашу раённую больніцу прыехаў працаваць лекар Алег Серанкоў, сын майго аднакурсьніка, які таксама выпісваў «Нашу Ніву». Зьдзівіла тое, што Алег добра ведаў і любіў размаўляць на беларускай мове, хаця яго маці была расейскай нацыі. Я нават аб гэтым артыкул паслала ў «НН» пад назвай «Ня толькі матчына мова, але і бацькава». Мы пасябравалі, як кажуць, сем'ямі, дзякуючы «НН», якую і мы, і Серанковы выпісваем да сёньняшняга дня.

Серанковы жывуць цяпер у Гомелі, і ў іхняй сям'і чацьвёра дзетак — Чэсік, Кацярынка і двайняткі Янінка і Бажэнка. Мінулым летам яны ўсёй сям'ёй прыяжджалі да мяне ў госьці ў Крупкі. Вядома ж, бацькі вучаць сваіх дзетак размаўляць на беларускай мове. Калі я іх бачыла, то старэйшы, Чэсік, ужо някепска размаўляў па-беларуску, Кацярынка, ёй тады было два з паловай гады, ужо на пытаньне бацькі «Якое ў нас чароўнае слова?» адказвала: «Чароўнае слова — калі ласка». Маленькія Янінка і Бажэнка, ім было тады па аднаму году і чатырох месяцах, яшчэ толькі пачыналі гаварыць, але я ўпэўнена, што будуць добра ведаць мову нашу.

Сваю ўнучку Таісачку, якой толькі споўнілася 3 гады, таксама вучу размаўляць на беларускай мове і чытаю ёй кніжкі беларускія.

Хачу яшчэ расказаць пра тое, як я правінілася перад мовай нашай беларускай. У 1962 г. паступіла ў менскі мэдыцынскі інстытут, ну і, вядома ж, толькі па-расейску размаўляла. А тут прыходзіць да студэнтаў-першакурсьнікаў карэспандэнтка «Чырвонай змены» і размаўляе з намі на беларускай мове, дык мы ёй такі «разнос» зрабілі за гэта. А я дык такое сказала, што цяпер нават хочацца праз зямлю праваліцца, калі ўспомню той сказ: «Кому он нужен теперь, этот белорусский язык?» Тады ж я нават ганарылася сабою за гэта.

І толькі праз 30 гадоў я пачала вывучаць беларускую мову (трохі ўжо ведаю), вывучаць гісторыю сваёй Беларусі, таму што ёсьць у нас «Наша Ніва».

Яшчэ раз віншую зь юбілеем і пасылаю найсардэчнейшыя пажаданьні!

**Антаніна Казырыцкая, Крупкі**

## Прачытаўшы артыкул Сяргея Брадавога,

**«Сакрэт нашых бацькоў» («НН», №1) я быў як узрадаваны, так і засмучаны.**

Узрадаваны таму, што знайшоўся чалавек, які расплюшчвае вочы на адвечныя праблемы вясковага жыцьця. Такая інфармацыя вельмі важная асабліва для моладзі, якая ўжо й ня ведае, якім «раем» быў Савецкі Саюз.

Смуткую ж, бо апісанае брыдоцце захавалася на вёсцы амаль у некранутым стане дзякуючы недальнабачнай палітыцы дзяржавы. Люмпэнізацыя вёскі адбываецца настолькі імкліва, што цяжка ўявіць яе вынікі і наступствы нават у недалёкай будучыні. Тым больш, што ўсё меней тых «дзядоў, якія выкупілі коней, змаглі ўзяць зямлі ўдосталь у 90-я гады мінулага стагодзьдзя».

Людзі старэйшага пакаленьня проста абавязаныя занатоўваць свае ўспаміны любымі спосабамі, дасылаць у рэдакцыі незалежных выданьняў, захоўваць у асабістых архівах.

Дарэчы, трылёгія Васіля Якавенкі «Пакутны век», прэзэнтацыя якой адбылася 17 студзеня ў Доме літаратара, акурат і сьведчыць аб вялікім значэньні памяці народнай.

**Эльяш Банель, Менск**

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас:**
**а/с 537, 220050 Менск.**
**e-mail: nn@nn.by.**
**Факс: (017) 284-73-29**

# У пекле Азіі

Герат — Саракс — Машхад. Рэпартаж нашага суродзіча з Аўганістану і Ірану. Піша **Аляксей Лявончык**.

У гэтай частцы сьвету праблема ў тым, што трансгранічных спалучэньняў вельмі мала. З Захедану ў Іране можна ў Пакістан патрапіць па чыгуначнай галінцы наўпрост, з пакістанскага Лахору ў Індыйскі Амрытсар таксама. Але гэта выключэньні. Звычайна даводзіцца даяжджаць да мяжы. Перакрочваць яе пешкі, потым наймаць новую таксоўку і плаціць па-новаму. У мяне калісьці была мара праехаць транзытам з Ганконгу да Стамбулу, але гэта будзе блуканьне па джунглях. Нават між Тайляндам ды сумежнымі гаспадарствамі няма злучаючай чыгункі. Чаго ўжо там пра нейкую Бірму гаварыць, дзе ўрад, кажуць, перасунуў сталіцу з прыбярэжнага Рангуну на 400 кілямэтраў углыбкі кантыненту, паслухаўшы астролягаў.

* * *

Дзень распачаўся неяк бесталкова — сонца засьцілі глухія хмары. Кабул стаіць сярод амаль што гор, не ніжэйшых за 500 мэтраў, і лётнішча моцна залежыць ад добрага надвор'я. Таму ехаў я туды зь вельмі дрэнным настроем.

Ад самага пачатку падалося, што мае чаканьні зьдзейсьніліся: народ стаяў ля брамы, якую загароджваў вартаўнік у нязграбнай кепцы, адпіхваючы ўсіх назад. Я прабіўся наперад, але ці ад стомы, ці ад нейкага хваравітага ўзрушэньня проста ня мог нічога запытацца. Вартаўнік выглядаў ніяк ня лепей за натоўп.

— Ну хаця пусьціце ў залю пагрэцца, — енчыў адзін хлопец. І сапраўды, мы стаялі па самыя калені ў нейкай сьнежна-бруднай твані.

— Няма месца, такі загад.

Зьявіўся крыху пасьля прадстаўнік «Кам Эйр», другое па вялічыні авіякампаніі Аўганістану, проста сказаў: «Чакайце». Прадстаўнікі ААН праходзілі моўчкі побач ды зьнікалі ў сьнегавой смузе за лётнішчам. Магчыма, для іх дзейнічалі нейкія іншыя правілы. Замежнікі таксама праходзілі без праблем. Кіснуць заставаліся выключна мясцовыя.

У залі, у якую мы прарваліся амаль



PHOTO.BYMEDIA.NET

што з боем, было некалькі расейцаў. Як я зразумеў зь іхных размоваў, яны ляцелі проста на Кандахар. Ня тое каб сярод іх былі нейкія такія адчайнікі, але дзеўчына ў шэрым шаліку выглядала неяк незвычайна. Нейкі такі агеньчык у вачох. Хммм. А вось хлопцы былі зусім звычайныя. Пад сорак год, тоўстыя скуранкі, быццам бы пакамечаныя шэрыя твары з трохдзённай шчэцьцю, і зусім непрыдатныя для звычайнай зімовай кандагарскай слаты боты. У аўганскіх гарадох існуе выбар між пылам, за якім праз сто мэтраў нічога ня бачна, улетку, і балотам на вуліцах узімку — асабліва калі ўлічыць, што ходнікі там усе парушаныя, а на рагах у бедных кварталах народ звычайна ладкуе сьметнікі. Мауляў, лягчэй муніцыпальным прыбіральшчыкам будзе, калі ўсё на рагу J. А тыя бытта ляцелі на шпацыр па ходніках Парыжу. Міжвольна мне прыгадаліся мае блуканьні па пагорках Баміяну, на якія я наважыўся ў простых летніх сандалетах.

Да мяне падышоў нейкі стары ды запытаўся, ці можна патэлефанаваць. Я адказаў, што не — нумар не мясцовы. Гэта я яму спрабаваў патлумачыць нешта. А той у адказ узьняў такі роў, зь якога вы-

**Працяг на старонцы 28.**

**Працяг са старонкі 27.**

нікала, што народ Аўганістану ніколі не аб'яднаецца, калі суайчыньнікі па першым патрабаваньні ня будуць даваць адзін аднаму слухаўкі. Тут, дарэчы, не прынята зусім даваць слухаўку незнаёмцам на вуліцах, аўганцы лічаць кожны грош ды вельмі хвалююца, каб ты ня зьбег зь іх тэлефонам. Мо былі выпадкі. Але калі ты прабавіш зь кімсьці літаральна некалькі хвілін у адным пакоі, ці машыне, ці лётніку — проста ў нейкай замкнёнай прасторы — то вы амаль што аўтаматычна лічыцеся сябрамі. Адмовіць чалавеку, які ляціць разам з табою дваццаць хвілін на адным шрубалёце, хай нават ты сядзіш сьпераду, а ён праз трыццаць крокаў ад цябе — неяк проста не прынята. Але для замежнікаў часьцяком робяць выключэньні.

Невялікае адхіленьне. Прагледаючы навіны з дому, я часьцяком задумваўся, а наколькі прымальна для нас адаптавацца да мусульманскае культуры, калі ў эўрапейскіх краінах шмат мусульман жыве проста анклявамі, непрытоена заклікаючы да зьнішчэньня хрысьціянскае культуры. У Аўганістане жанчыне небясьпечна вандраваць на ровары адной проста таму, што кіроўца машыны можа «незнарок» яе зьбіць. І ніводны паліцыянт не заўважыць такога кіроўцу.

Раніцай наступнага дня я ўжо ехаў да Тэгерана. Аўтобус каштаваў меней шасьці даляраў, цывільны такі, стары, але чысты. Нават выправіўся са спазьненьнем усяго на якія паўгадзіны.

Да мяжы ўсё ішло больш-менш. Гармідар, які панаваў вакол памежнікаў на аўганскім баку, быў цалкам прадказальны. Да кіданьня пашпартоў з аднаго кутка залі ў іншы я прызвычаіўся раней. Мытнікаў і ўвогуле можна было проста абысьці.

Памежнікі, як я і думаў, не чакалі, што тут зьявіцца нехта зь іншаземцаў, таму адзін зь іх амаль што хвіліну няўцямна пазіраў на вокладку майго сіненькага-сіненькага, потым кінуў яго свайму памочніку. Той таксама выкаціўся на яго:

— Вы откуда?

— It is written over there. From Belarus.

— Советского Союза человек?

Ну что тут было адказаць. Мне карцела ад яго адчапіцца як мага хутчэй. Апошні сказ у іх дасюль самы ўлюбёны. Таджыкістан для іх — асобная краіна, а вось Шураві як застаўся Шураві, так і ўсё. Беларусь і Украіна ва ўспрыманьні аўганцаў амаль не існуюць. Тыя, хто жылі ў Менску, Харкаве ці Кіеве — цэнтрах навучаньня й стажыровак, а потым натуралізаваўся, — ведаюць выключна расейскую мову, таму часьцяком скардзіліся мне на «наваяўлены нацыяналізм».

— Да, Советского Союза.

— И как вас к нам занесло?

— Инженер я.

— Дорогу от Кандагара построили?

Заўважу, працяглась тае шашы ну найменей 900 кілямэтраў.

— Почти что.

— А вот американцы ничего не строят. Возвращайтесь к нам.

— Постараюсь.

На гэтым размова памысна скончылася, і я выйшаў на паветра. Апошняю перашкодаю — зусім нязначнаю — быў мытнік. Ён зьбіраў падатак за выезд. З замежнікаў яны разоў у пяць большыя, чым зь мясцовых, і ніхто не разумее абгрунтаваньня таго даляра, што выцягвае з кішэні простага аўганца яго дзяржава, калі яму карціць некуды паляцець. Але ў гэты раз мытнік вырашыў ня браць зь мяне ніякіх падаткаў. Ха.

Іранскі КПК быў больш арганізаваным. Памежнікі сядзелі ў кабінках з кампутарамі. Софт быў цалкам лякалізаваны, на фарсі, але зусім не прыстасаваны для апрацоўкі замежных пашпартоў. Адзін зь іх круціў мой пашпарт у руках хвілін дзесяць, потым яны паклікалі мяне, адкуль я, ці тое новы аўганскі пашпарт. Я адказаў, што не, відавочна. Назвы краіны яны, пэўна, таксама ня бачылі ніколі.

Прапусьцілі хутка, пасьведчаньня аб здароўі таксама не запыталіся. Затое ўсе валізы аўганцаў трэсьлі па поўнай праграме, раскідаючы іх адну за другой. Небаракі павінны былі зьбіраць гэта ўсё сваімі рукамі. Мяне, як і тых аўганцаў, у каго быў самотны заплечнік, не чапалі.

Іранская паліцыя адразу дала мне зразумець, што я быў ужо ў Іране. У аўганцаў паліцыянты ўсе як на замову выглядаюць такімі маленькімі задохлікамі — дзьмухні, і ён адразу зьнікне. Да гэтага дадаць заўжды брудную форму, вусы няпэўнага колеру. Такі гарадавы Чэхава выйдзе. Іранцы ж былі больш падобныя да паліцыянцкай сілы нейкае заходняе дзяржавы.

За адмежавальнай рысай стаяла шмат хлопцаў, што, як крумкачы, кінуліся адразу на нас. Куды трэба даехаць, колькі вас чалавек, аўтобус тут яшчэ будзе стаяць і стаяць.

Аўтобуса чакалі на сьпёцы паўгадзіны, іранцы загадалі кіроўцу зьняць зь яго шыльды, абіўку рухавіка і найруплівейшым чынам дасьледавалі ўсе поласьці машыны. Сабак не было. Дзіўна: опіюм, калі яны так баяцца, было б лягчэй шукаць з сабакамі. Але, магчыма, тут таксама прысутнічаў фактар прыніжэньня.

Пачатак грамадзянскай вайны, разбурэньне Кабулу варожымі групоўкамі, падзел Кабулу, а потым захоп талібамі калісьці лібэртынскае сталіцы ды ператварэньне яе ў апору ісламскага фундамэнталізму выклікалі масавы зыход у Пакістан, бо мяжы не было як факту, ды ў Іран, бо мова вельмі падобная. Першасна стаўленьне іранцаў да тых, хто шукаў азылю, было дастаткова станоўчым, аднак пасьля паступова пагоршылася. Дзецям аўганцаў сталі адмаўляць у адукацыі, бацькі не маглі знайсьці працу акрамя сама нізкааплатнай, хаця я цалкам пэўны, што, як і ўсе эмігранты ў любой краіне, яны працавалі значна больш за мясцовых. Цяпер да аўганцаў — асабліва ў сьвятле росту вытворчасьці опіюму — ставяцца проста нэгатыўна. Як звычайна, яны першыя кандыдаты на ініцыятывы паліцыі ў гэтай краіне. Усё ж такі Амэрыка ды Нямеччына са сваім прыхаваным расізмам — гэта не выключэньні.

Празь дзьвесьце мэтраў ад памежнай рысы нас спынілі на КПП. Працэдура паўтарылася зноўку. Увесь багаж абшукваўся, усіх аўганцаў трэсьлі асабіста, нават самым безмалімонным чынам залазілі ў іх кішэні, рвалі падэшвы абутку, калі нешта падазравалі. Добра хоць, што жанчынаў не чапалі. Падчас талібану на ўсіх блёкпастах гасьцінца Джалалабад — Кабул для гэтай справы выкарыстоўвалі хлопчыкаў, якія днявалі ды начавалі разам з прыдарожнай вартай. Што там увечары адбывалася — магу сабе ўявіць.

Чатыры разы. Тут яшчэ распачаўся дождж. Дарога, якая напачатку выглядала вельмі цывільна ў параўнаньні з аўганскаю, паступова набыла выгляд нейкага сьметніка. Копы цэляфану на хмызьняку ўздоўж дарогі, пабіты брук, асфальт напалову з гразёй. Апошнім разам міліцыянты тармазнулі наш аўтобус ля нейкага сьметніка. Праз дажджавую смугу ўжо бачылася раздарожжа Саракс — Машхад. Адтуль пачынаецца чыгуначная галінка, што вядзе на Тэгеран праз Машхад. А Саракс... Саракс — гэта зусім іншы сьвет. Празь яго ня так і лёгка прайсьці, бо вядзе ён у «краіну, дзе няма злачыннасьці», і якая не існуе ў навінах. Туркмэністан настолькі шчыльна зачынены, што іранцы туды таксама рэдка трапляюць. Хаця мне, мабыць, у пэўнай ступені празь сябраваньне спадара Лукашэнкі з Туркмэнбашы, атрымаць візу было досыць лёгка.

Першы раз за паўгоду я пабачыў чыгунку.

**Працяг будзе.**

# Польскі выбар беларусаў

Чаму беларусы Астравецкага раёну дагэтуль не пагаджаюцца на беларускую мову ў касьцёлах? Піша **Натальля Мяшкова**.



СЯРГЕЙ ХАРЭЎСКІ

Калі падчас летніх канікулаў бацькі адвозілі нас зь сястрой на абавязковую пабыўку на радзіму бацькі, на Берасьцейшчыну, наша зьяўленьне дзед Браніслаў з усьмешкай сустракаў словамі: «Ну, што — палячкі прыехалі?!» Мы прыяжджалі з Астравецкага раёну Гарадзенскай вобласьці той самай БССР, і чаму нас называлі «палячкамі» — было зусім незразумела. Тым ня менш узьнікала прыемнае пачуцьце ўласнай адметнасьці, якое, зьявіўшыся аднойчы, зь цягам часу не зьнікала, а толькі ўмацоўвалася.

Акрамя відавочных «матэрыяльных» адрозьненьняў, такіх як, напрыклад, імёны, зусім не тыповыя для сацыялістычнай Беларусі — Яніна, Ванда, Юзэфа, Адольф, якія на Астравеччыне сустракаліся паўсюдна, — у паветры прысутнічала няўлоўнае адчуваньне «іншасьці». Галоўным яго сьведчаньнем была і застаецца перакананасьць многіх мясцовых жыхароў, асабліва тых, хто хоць як-небудзь помніў часы «пад Польшчай», што яны ня маюць ніякага дачыненьня да савецкай дзяржавы. Фразамі накшталт «Саветы прыйшлі», «Саветы прыдумалі» падкрэсьлівалася адлегласьць паміж «намі» і «прышлымі».

Часы зьмяніліся, імпэрыі СССР не існуе, але сьвядомасьць людзей сталага веку не атаясамлівае сябе зь незалежнай Беларусьсю. Больш таго, яны ў большасьці сваёй не вызначаюць сябе як беларусаў. Часта гэта справядліва ня толькі ў дачыненьні да людзей старэйшага пакаленьня. Магчыма, адна з прычынаў палягае ў тым, што непрымальны інстытут Саветаў нікуды ня зьнік і нават не перайначыўся. Але, несумненна, ёсьць іншыя прычыны, глыбей схаваныя.

Нейкім незразумелым чынам тут аказалася вельмі прывабнай ідэя прыналежнасьці да Польскай дзяржавы. Нягледзячы на тое, што жыцьцё пад польскімі ўладамі было ня менш, а, магчыма, і больш складаным, чым «пры Саветах».

На беларускіх землях спрадвеку жылі палякі, якія, як лічаць многія аўтарытэтныя дасьледчыкі, ёсьць нашчадкамі палянізаваных аўтахтонаў беларускіх і літоўскіх земляў. Але ў выніку польскай акупацыі ў 1921—1939 гг. на захадзе Беларусі ўтварыўся новы фэномэн сьвядомасьці. Этнічныя беларусы, якія ў паўсядзённым жыцьці размаўлялі і размаўляюць на беларускай мове, захоўваюць менавіта беларускія традыцыі, перакананыя ў тым, што яны палякі.

Нават у кнізе «Памяць» Астравецкага раёну ёсьць пацьвярджэньні таму, што зьяўленьне Чырвонай Арміі ў 1939 г. тут сустрэлі без энтузіязму. Супраціўленьня чырвонаармейцы амаль не сустракалі, узгадваецца толькі пра стварэньне перашкод на іх шляху. Так, напрыклад, у вёсцы Міхалішкі ў канцы верасьня начальнік мясцовай пажарнай каманды ўзарваў мост церазь Вялью і тым самым затрымаў амаль на двое сутак рух савецкага войска.

2 лістапада Заходняя Беларусь, у складзе якой была і Астравеччына, была ўлучаная ў склад БССР. На тэрыторыі новаўтворанага Астравецкага раёну жылі 37 397 чалавек. Паводле нацыянальнага складу яны падзяляліся наступным чынам: 24 367 беларусаў, 7 200 палякаў, 1 500 габрэяў, 4 300 літоўцаў, 30 расейцаў.

Дэклярацыя народнага сходу Заходняй Беларусі аб дзяржаўнай уладзе, прынятая 29 кастрычніка 1939 г., пераконвала, што «народы вялікага Саюзу Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік працягнулі руку брацкай дапамогі і назаўсёды вызвалілі працоўных Заходняй Беларусі з-пад ярма палітычнага, сацыяльнага і нацыянальнага прыгнёту. Упершыню народы Заходняй Беларусі атрымалі права распараджацца сваім лёсам».

Дапамогі «працоўных Савецкай Беларусі» доўга чакаць не прыйшлося. Аб ёй з гонарам расказваў у інтэрвію газэце «Праўда» 7 кастрычніка 1939 г. сакратар ЦК КП(б)Б Беларусі, чалец ваеннага савету Беларускага фронту тав.Панамарэнка: «Ужо паслана звыш за 100 газэтных супрацоўнікаў, каля 300 работнікаў народнай адукацыі, аховы здароўя, фінансаў і гандлю, 800 партыйных і камсамольскіх работнікаў. У бліжэйшы час на мейсцы накіроўваюцца яшчэ групы работнікаў».

Дысбалянс паміж ідэалягічнымі работнікамі і прадстаўнікамі сацыяльнай сфэры відавочны. «На просьбы мясцовага насельніцтва» на тэрыторыю Заходняй Беларусі таксама завозілася соль, сярнічкі, газа, тытунь. Але эканамічная падтрымка адыходзіла на другі плян — галоўнай мэтай было стварэньне спраў-

**Працяг на старонцы 36.**

**Натальля Мяшкова**

**нарадзілася ў Лідзе, у дзяцінстве гадавалася ў бабулі–дзядулі ў Альхоўцы (Астравецкі раён), скончыла школу ў Астраўцы, потым журфак у Менску. Працавала ў Астраўцы і Менску, выключна ў «праўдах». Вучыцца на «беларусістыцы» ў Вільні, у Эўрапейскім гуманітарным.**

# Рагнеда раённага падпарадкаваньня

Неюбілейныя развагі з нагоды 20-годзьдзя Заслаўскага запаведніку. Піша **Сяргей Харэўскі**.

*У 988 гаду Ўладзімір і ўсе кіеўцы — і баяры, і просты народ — прынялі хрысьціянства. Перад прыняцьцем хрысьціянства Ўладзімір прыйшоў да Рагнеды і сказаў ёй: «Я хачу ажаніцца з грэцкай царэўнай, хрысьціянкай. Ты цяпер вольна і можаш узяць у мужы сабе любога баярына. Рагнеда адказала: «Нягожа княгіні быць жонкаю простага баярына: я хрысьціянка даўно ўжо, і хачу быць заручніцай князя князёў Хрыста (знача, стацца мніхкай). Адпусьці мяне ў бацькаўскую маю беларускую зямлю». Уладзімір адпусьціў яе ў Бацькаўшчыну і Ізяславу аддаў усю беларускую зямлю. Ізяслаў доўга і шчасьліва княжыў у Беларусі і пабудаваў горад Ізяслаў, недалёка ад Менску (цяпер маленькае мястэчка і завуць яго Заслаўе).*

Вацлаў Ластоўскі, «Ізяслаў» [1916]

На працягу стагодзьдзяў Заслаўем валодалі нашчадкі Ізяслава Ўладзімеравіча, Яўнута Гедымінавіча, Яна Юравіча Глябовіча, Яна Сапегі, Антона Пшэзьдзецкага. Каму будзе належаць гэтае славутае мястэчка заўтра? Высьвятляецца, сёньня гэты ўнікальны куток пад Менскам амаль пазбыўся ўсіх сваіх статусаў і даўно перададзены з нацыянальнага ў раённае падпарадкаваньне! Адпаведна, сродкаў на папаўненьне музэйных фондаў, абсталяваньне новых экспазыцыяў, рэстаўрацыі будынкаў і дагляду за помнікамі археалёгіі больш няма. Перад раённым начальствам увесь час паўстае пытаньне, навошта тая пустка-«запаведнік», калі яе можна забудаваць? І пакрысе забудоўваюць...

У гэтым годзе Заслаўскі гісторыка-культурны музэй-запаведнік справіць сваё дваццацігодзьдзе. Зараз там працуе выстава жывапісу Віктара Маркаўца, прысьвечаная Заслаўю: яго краявіды, цэлая галерэя магнацкага роду Пшэзьдзецкіх, славутых мэцэнатаў Заслаўя.

Ад багацейшай на падзеі тамтэйшай гісторыі ацалела некалькі вялікіх помнікаў. Гэта, па-першае, «Замэчак» — круглае земляное ўмацаваньне гораду Рагнеды. Славутая княгіня прыняла тут хрысьціянства і заснавала на тутэйшай Чорнай гары манастыр. Па-другое, захавалася гарадзішча «Вал», дзе ў канцы XVI — пачатку XVII ст. была збудаваная рэзыдэнцыя мажнаўладцаў Глябовічаў і збор эвангелікаў-рэфарматаў. Трэці з буйных помнікаў Заслаўя — касьцёл Марыі, пабудаваны ў 1774 г. Да астатніх захаваных помнікаў належаць славутыя старажытныя курганы і... пляніроўка старога гораду, якая склалася яшчэ ў XI стагодзьдзі!

Далейшы лёс Заслаўскага запаведніку можа быць перадвырашаны валюнтарысцкім чынам. У зьвязку з радыкальнай зьменаю прыярытэтаў, галоўнай ўвагаю раённых уладаў, што адчулі «пульс часу», аточана цяпер адно «Лінія Сталіна», на якую марнуюць сродкі не шкадуючы. Тамака ж ляснулі й тыя нішчымныя сродкі, што маглі б быць скарыстаныя для ўратаваньня сапраўдных помнікаў. У выніку музэй-запаведнік ня мае цяпер аніякіх сродкаў, ні з дзяржаўнага, ні з раённага бюджэту. А музэй, апынулася, патрэбны адно ягоным супрацоўнікам-энтузіястам.

Гісторыя стварэньня запаведніка сягае між тым ажно ў 1967 г., калі гэтае легендарнае мястэчка атрымала ахоўны статус археалягічнага комплексу.

Праз 11 гадоў тут быў, нарэшце, пасьля руплівае рэстаўрацыйнае работы адкрыты колішні кальвінскі збор, у якім выгодна разьмясьціўся музэй. Падчас адкрыцьця ў 1978 г. музэй рамёстваў і народных промыслаў Беларусі ў Заслаўі быў першым музэем такога тыпу ў Беларусі. Вялікая роля ў стварэньні арыгінальнага аблічча экспазыцыі заслаўскага музэю тады належала славутаму мастаку Эдуарду Агуновічу. Асобныя разьдзелы экспазыцыі афармоўвалі самыя кваліфікаваныя адмыслоўцы, апантаныя сваёй справаю. Сярод іншых быў славуты этнограф і мастацтвазнаўца Міхась Раманюк. Не пашкадаваў тады ўнікальных экспанатаў і Дзяржаўны музэй Беларусі: зь яго фондаў у заслаўскую экспазыцыю былі перададзеныя хрэстаматыйныя шэдэўры народнага мастацтва, шырока вядомыя па энцыкляпэдыях, падручніках і даведніках: абразы XVII — XVIII ст., шыкоўныя слуцкія паясы XVIII ст., старажытныя шахматы XII ст., урэцкае й налібоцкае мастацкае шкло, унікальныя здабыткі нашага дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва XVI — XIX ст... Дзякуючы сваёй мастацкай і гістарычнай адметнасьці экспазыцыя стала апірышчам нацыянальнага абуджэньня Беларусі. Ужо ў 1978 г. горад наведала прыкладна 12 тыс. турыстаў. Калі неўзабаве сюды пачало завозіць плянавыя групы бюро падарожжаў, колькасьць наведнікаў павялічылася да 60 тыс. у год, а потым нават да 100 тыс. з усіх старон! Цягам дзесяцігодзьдзя ён быў філіяй Дзяржаўнага музэю й даваў траціну(!) ягонага прыбытку.

Дзякуючы інтэнсіўным раскопкам ужо бачылася аднаўленьне Заслаўскага замку зь дзьвюма манумэнтальнымі брамамі. Распрацоўваліся праекты ўзнаўленьня тут аб'ёмаў былога дамініканскага кляштару і палацу Глябовічаў. Задумляліся ахоўныя захады па зьберажэньні адной з найбуйнейшых у Эўропе курганнай групы, музэіфікацыі самага старажытнага ў Беларусі гарадзішча «Замэчэк». Прадугледжвалася й адраджэньне палацава-паркавага комплексу XVIII — XIX ст. Пшэзьдзецкіх.

Распрацоўваліся ўнікальныя канцэпцыі стварэньня «жывога» музэю з млыном, кузьняю, ганчарнай майстэрняю. Тут, у Заслаўі, патрыятычнай моладзьдзю былі адроджаныя традыцыі Гуканьня вясны, Калядаў, Купальляў. Загулі тут выставы й мастацкія кірмашы. Праводзіліся славутыя навуковыя «Заслаўскія чытаньні»...

Але... Ці ня з самых першых крокаў музэйшчыкі, рэстаўратары і археолягі сутыкнуліся з варожым стаўленьнем мясцовага начальства. Выгадаваныя за Машэравым у духу калгаснага мэркантылізму, дробныя й найдрабнейшыя чыноўнікі рабілі ці ня ўсё, каб зашкодзіць інтэлігентам-летуценьнікам. Хоць Дзяржаўны запаведнік «Заслаўе» быў створаны рашэньнем Саўміну БССР яшчэ ў 1967 г., ахоўныя зоны вакол помнікаў працягвалі забудоўваць, бо не было ўласнай архітэктурнай службы. Не былі вызначаныя межы запаведніку, не былі зацьверджаныя навуковыя канцэпцыі праектаў.

Паводле ўсіх ідэяў навукоўцаў і музэйных супрацоўнікаў, вялікая ўвага надавалася найперш ляндшафтам, што нясуць самастойны эстэтычны сэнс. Ба-



ГЛЕБ ЛАБАДЗЕНКА

лазе пляніроўка Заслаўя тады яшчэ захоўвала рысы, закладзеныя ў XI ст.!

У межы запаведніка павінна ўваходзіць уся гістарычная частка гораду — такая была галоўная думка аўтараў канцэпцыяў. І менавіта яна выклікала й выклікае супраціў гарвыканкаму. У «Звяздзе» ў сярэдзіне 1980-х друкавалася «аўтарытэтнае» меркаваньне галоўнага архітэктара Заслаўя, нейкага Сяргея Палякова: «Тое, што патрабуюць гісторыкі, складае тэрыторыю ў 110 га. ...Нерэальна! Наколькі гэта зацягнецца?» Далей — болей: «Каштоўнасьць уяўляе толькі пляніроўка вуліц цэнтру, а не будынкі. Што зь імі рабіць? Хіба што зьдзерці шыфэр, пакрыць саломай, і будзе гістарычная «экзотыка». І калі чалавек будзе жыць у запаведніку, са сваімі патрэбамі ён пойдзе не ў тутэйшую дырэкцыю, а да нас, бо мы — гарадзкая ўлада!» То бок заслаўская «ўлада» радавался таму, што ў рэстаўратараў і ў музэі бракуе сілаў і сродкаў!

З году ў год наступ на гістарычны ляндшафт не спыняўся: шчыльна забудоўвалася ўся тэрыторыя вакол гарадзішча «Замэчэк», зьнішчаліся адзін за адным курганы, у цэнтры гораду зьяўлялася ўсё болей бэтонных і сылікатных спарудаў. На злосьць рупліўцам старасьвеччыны была пабудаваная ў цэнтры мястэчка эстрадная пляцоўка з бэтону, а на месцы толькі знойдзенай археолягамі Малой брамы замку была абсталяваная... грамадзкая прыбіральня.

Але найбольшы ўдар музэю-запаведніку быў нанесены, калі былы кальвінскі збор XVI ст. (які пазьней, да 1863 г., быў касьцёлам) без усялякіх дыскусіяў і ўзгадненьняў быў аддадзены пад царкву. У выніку ўнікальная музэйная экспазыцыя, што стваралася рупнасьцю энтузіястаў, мастакоў і навукоўцаў, была разабраная па фондах сталічных музэяў. Былі зьнішчаныя элеганцкія краты мастацкага каваньня, скрозь якія зь вежы можна было сузіраць заслаўскія разлогі. Былі брутальна заквэцаныя пад тынк фрэскавыя картушы з гербамі магнатаў-фундатараў. З крыпты былі выкінутыя й самі іхныя труны. Адчуваючы беспакаранасьць, зь лёхаў сьвятыні цяпер наважыліся павыкідаць парэшткі айцоў-дамініканаў...

Адной з апошніх стратаў стала зьнішчэньне яшчэ аднаго курганнага комплексу, з каменным Хведзькавым крыжам, што апынуўся засыпаным у выніку пашырэньня дарогі.

Натуральна, што зьніжэньне статусу гістарычнага Заслаўя зь дзяржаўнага да раённага зьвядзе горад і юрыдычна ў прамысловае прадмесьце Менску з хаатычнай прыватнай забудоваю.

Сорак гадоў існаваньня Заслаўскага запаведніка — гэта гісторыя несупыннага змаганьня, непапраўных стратаў і нескарыстаных магчымасьцяў. Калі сорак гадоў таму гэтаму гарадку пад Менскам усур'ёз прарочылі лёс літоўскіх Трокаў ці польскага Казімежа-Дольнага, то сёньня... гэта тыповае беларускае мястэчка. У найноўшым лёсе Заслаўя, як у кроплі вады, адлюстраваліся ўсе праблемы, беды й перадвызначанасьці, што датычаць любой гістарычнай мясьціны Беларусі. Неўзабаве можа стацца так, што чароўны Заслаўскі краявід мяжы XX і XXI стагодзьдзя мы зможам сабе ўявіць толькі паводле палотнаў Віктара Маркаўца.

**Сяргей Харэўскі**

# Чатырнаццаць стагодзьдзяў нянавісьці,

або Чаму Ірак ня стаў Японіяй. Піша **Сяргей Богдан**.

Сёньняшні Ірак у полымі грамадзянскай вайны ператвараецца ў ідэальную монакультурную дзяржаву. *The New York Times* гэтымі днямі піша пра абыякавае і нават варожае стаўленьне багдадзкага ўраду да новай амэрыканскай стратэгіі ўсталяваньня ў краіне міру ды бясьпекі. Амэрыканскае кіраўніцтва мела грандыёзны праект ператварэньня Іраку ў дэмакратычны ўзор для Блізкага Ўсходу, але аказалася, што іракская кіраўнічая эліта мае ўласны праект і гатовая ажыцьцявіць яго коштам любой крыві.

Новыя ўладары Багдаду ў гвалце грамадзянскай вайны спрабуюць стварыць з Іраку свой ідэал — моцную зьяднаную краіну. Але ня шляхам усеагульнага аб’яднаньня, а шляхам вынішчэньня «іншых», нешытаў. Іх задача спрашчаецца дзякуючы выразнай дыфэрэнцыяцыі «сваіх» і «чужых» (ня толькі паводле веравызнаньня) ды наяўнасьці ўжо гатовага патэнцыялу варожасьці да «іншых». Лініі падзелу паміж групамі насельніцтва і іх узаемная нянавісьць у Іраку, як і ў кожным традыцыйным грамадстве, мелі адвечны і навечны характар. І вось сёньня, ва ўмовах ваеннай уседазволенасьці, у тых, хто ўчора ціха ненавідзеў адзін аднаго проста «па традыцыі», зьявілася магчымасьць адпомсьціць «па-сучаснаму» з выкарыстаньнем мадэрнай зброі. Кіруючыся і ідэйнымі, і побытавымі меркаваньнямі.





AP

У фізыцы і хіміі ёсьць дакладны закон захаваньня энэргіі, якая не зьнікае, а толькі перамяшчаецца і трансфармуецца. Вывесьці падобны закон у сфэры культуры і палітыкі амаль немагчыма. Разуменьне таго, як мінулыя дзеяньні, думкі і крыўды чалавецтва адбіваюцца на наступных пакаленьнях, ёсьць толькі спэкуляцыяй. Міфы шыіцкай крыўды і суніцкай прававернасьці, на якіх будуецца прапаганда вайны ў цяперашнім Іраку, маюць за сабой чатырнаццаць стагодзьдзяў. Менавіта столькі цягнецца гісторыя суніцка-шыіцкага супрацьстаяньня ў ісламе. Яно пачалося з выбараў халіфа, праведзеных адным бокам (сунітамі) і непрызнаных другім (шыітамі) у VII ст.

Тая шыіцкая апазыцыя магла б згаснуць, як і мноства іншых ерасяў, каб ня стала ў належны момант ідэалёгіяй супраціву карэннага неарабскага насельніцтва арабскай паноўнай эліце Халіфату. Тубыльцы-неарабы пасьля арабскага заваяваньня страцілі магчымасьць вызнаваць свае ранейшыя веравучэньні, і, спрабуючы процістаяць фанабэрыстым арабам дый адрозьнівацца ад тых, яны зьвярнуліся да шыіцкай апазыцыі, паджыўляючы яе і людзкой сілай, і ідэямі зусім неісламскага зьместу.

Сёньняшняя міжрэлігійная разьня ў Іраку ўвасабляе сабой крывавую помсту і вяртаньне да ўлады ва ўласнай краіне колішняга арабізаванага карэннага насельніцтва, што далучылася да шызму. Іракскія шыіты — арабы хіба толькі паводле назвы. У момант арабскага заваяваньня сёньняшні Ірак належаў зараастрыйскай Пэрсыдзкай імпэрыі, і насялялі яго перадусім сэміцкія, але не арабскія народнасьці, што размаўлялі збольшага па-арамейску (як Ісус). Ваяўнічыя арабскія плямёны, якія заваявалі паўсьвету, не вылучаліся, аднак, шматлікасьцю, і нават сёньня большасьць людзей, што называюць сябе арабамі, фактычна ёсьць арабізаванымі прадстаўнікамі розных народаў. Праўдзівыя арабы жывуць хіба толькі на гістарычнай прарадзіме — Арабійскай паўвыспе і, з пэўнымі агаворкамі, у Сырыі ды тых самых няшчасных суніцкіх раёнах Іраку.

У сваёй амбітнасьці энтузіясты вялікаарабскай справы ад Марока да Іраку ігнаруюць усе гэтыя адрозьненьні паміж «арабамі», прыкладам, называючы цэлыя мовы гаворкамі арабшчыны. Сёньняшнюю грамадзянскую вайну ў Іраку яны падаюць як прыкрую міжусобіцу. Але насамрэч амэрыканскае ўварваньне ўпершыню за апошнія чатырнаццаць стагодзьдзяў дало шыітам — фактычна карэннаму насельніцтву (і нашчадкам нявольнікаў, прывезеных арабамі зь іншых краінаў) — магчымасьць узяць крывавы рэванш.

Сапраўды, адзіныя арабы ў Іраку — гэта суніты, і перасяліліся яны туды пасьля арабскага заваяваньня. Яны і сёньня захавалі сваю маналітнасьць у раёнах каланізацыі — тым самым суніцкім «трохкутніку». Ірак ніколі ня быў інтэграваным, а ягоныя насельнікі не адчувалі ніякай прывязанасьці да сваіх суседзяў. Гэта добра відаць па тым

факце, што нязначнае зьмяшэньне паміж сунітамі і шытамі мела месца толькі ў найноўшы час дый адбывалася хутчэй у выніку страты мадэрнізаванымі і вэстэрнізаванымі іракцамі сваіх каранёў, чымся сапраўднага братаньня. Адкуль быць зьмяшэньню, калі ці не найлепшым відам шлюбу ўважаецца шлюб ня проста ўнутры сваёй супольнасьці, а ўнутры сваёй сям'і — са стрыечнымі братамі й сёстрамі? Расізм і ксэнафобія іракцкага грамадзтва шмат трывалейшыя за эўрапейскія адпаведнікі, бо будуюцца не на спэкуляцыях інтэлектуалаў і прыватных антыпатыях плебсу, а на крэўных сувязях, кланавых і племянных структурах. Таму яны часам не такія відочныя для эўрапейскага вока і нават сёньня застаюцца дыхтоўна прыхаванымі пад псэўдарэлігійнай абалонкай.

Няпраўда, што раней іракцы заўжды жылі ў міры міжсобку, а міжрэлігійная калатнеча ёсьць фэномэнам чатырохгадовай даўніны. Існаваньне Іраку ад самага пачатку было заснаванае на прыгнёце меншасьцю (рэлігійнай, культурнай, этнічнай) большасьці пры дапамозе разбудаванага апарату гвалту і рэгулярнага праліцьця крыві. Суніцкія ўладары Халіфатаў, цюрскія султаны-суніты, суніцкая Асманская імпэрыя, урэшце, суніцкія ўладары Іраку ў XX ст. душылі і рэзалі цягам чатырнаццаці вякоў шыіцкую большасьць. Навонкі гэта нават у XX ст. моцна не выходзіла, дзякуючы адсутнасьці адпаведных каналаў камунікацыі, а таму дазваляла ствараць ілюзію міру. Каб Галакост адбыўся ў Іраку, мы, відаць, пра яго б і не пачулі ці, самае большае, ведалі б па зносцы ў падручніку. Вось гэтым і быў той самы, сапраўдны іракцкі мір — забойствамі за зачыненымі кардонамі пры адсутнасьці балбатлівых замежных сьведкаў і камэраў Сі-Эн-Эн.

# Падарунак гісторыкам ад улады

Новая кніга Юр'я Туронка «Людзі СБМ» распрадалася за адзін месяц. Піша **Алег Гардзіенка**.


АРЦЁМ ЛЯВА

Кніга выдадзена ў Вільні — кіраўнікі менскіх недзяржаўных друкарняў, пабачыўшы толькі назву, катэгарычна адмаўляліся друкаваць манаграфію.

Працу над кнігай доктар гісторыі Юры Туронак скончыў пры канцы верасьня 2006 г. Нягледзячы на перанесены ўлетку інсульт і наступствы, ён давёў яе да канца.

Дасьледчыка ня любяць афіцыйныя гісторыкі, што займаюцца пытаньнямі Другой сусьветнай. Найперш за тое, што сп.Туронак здольны глядзець на беларускую мінуўшчыну без ідэалягічнай заангажаванасьці. Таму зь ягонымі тэзамі заўсёды складана спрачацца.

У кнізе спадар Юры раскладае па палічках усю гісторыю Саюзу беларускай моладзі і моцна крытыкуе як афіцыйных гісторыкаў, так і дасьледчыкаў з ура-патрыятычнага лягеру. І тыя, і другія фальшавалі гісторыю СБМ, падладжваючыся пад палітычны кантэкст. Усё было куды больш празаічна і трагічна.

Аўтар расказвае пра пачаткі стварэньня арганізацыі, падрабязна апісвае кіраўнічыя кадры (у тэксьце зьмешчаныя каля 40 біяграмаў), аналізуе статыстыку, дзейнасьць Працоўнай групы СБМ у Нямеччыне ды прасочвае паваенны лёс юнакоў і юначак. А гэты лёс быў незайдросны: «Усіх гэтых юнакоў, акрамя перабежчыкаў да Андэрса, чакаў адзін лёс — палон, фільтрацыя, а даваенных савецкіх грамадзян — прымусовая рэпатрыяцыя або адмаўленьне ад свайго імя, паходжаньня і мінулага, што адкрывала пэрспэктыву маральна непаўнавартнага кансьпіратыўнага бытаваньня на чужыне».

У кнізе зьмешчаны дакумэнты СБМ, вершы і песьні, напісаныя пад уплывам патрыятычнага ўздыму ўдзельнікамі ці для ўдзельнікаў арганізацыі. Сярод іх аўтараў і шараговыя СБМаўцы, і Натальля Арсеньнева ды Міхась Кавыль.

Мала хто ведае, што аўтар знакамітага эміграцкага маршу «Сьпі пад курганам герояў», які выконваўся падчас пахаваньняў, — кіраўнік СБМ Міхась Ганько. Але памяць пра яго вытручвалі ня толькі ў Савецкай Беларусі, але й на эміграцыі. Нават прыпісвалі аўтарства верша Янку Купалу.

Кніга — выдатны падарунак для тых, хто цікавіцца гісторыяй, і для пазасталых у жывых былых эсбээмаўцаў. Разам з тым гэта і «падарунак» для гісторыкаў ад улады. У іх кніга выкліча толькі злосьць, як ужо было зь «Беларусьсю пад нямецкай акупацыяй».

Шукайце кнігу ў незалежных распаўсюднікаў і праз «Кнігі-поштай» — надзея знайсьці яе пакуль яшчэ ёсьць.




**Юры Туронак. Людзі СБМ. — Вільня: «Gudas», 2006**

# Гісторыя беларускіх грошай

Роўна 300 гадоў таму была адбітая апошняя манэта Вялікага Княства Літоўскага. Да гэтай даты выйшаў даведнік «Манэта Беларусі». Зь яго стваральнікам **Зьмітром Гулецкім** гутарыць **Руслан Равяка**.

Пабачыў сьвет даведнік «Манэты Беларусі да 1707 году», створаны Зьмітром Гулецкім, Аляксандрам Грамыкам і Аляксандрам Крываручкам. Як пішуць аўтары, выхад кнігі дастасаваны да 300-годзьдзя выбіцьця апошняй манэты Вялікага Княства Літоўскага. Выданьне мае шматлікія цікавыя ілюстрацыі ды падрабязнае апісаньне грашовых адзінак, падзел па ўладарах ВКЛ і Кароны.

**Зьміцер Гулецкі:** Ідэя ўзьнікла яшчэ паўтара году таму. Адразу паўстала пытаньне пра фармат кнігі. Нягледзячы на тое, што людзі звычайна праяўляюць жывы інтарэс да старажытных манэтаў (бадай, любоў да грошай увайшла ў прыроду чалавека), найсучасьнейшыя веды ў галіне беларускае нумізматыкі дарасейскага пэрыяду застаюцца цяжка даступнымі нават для адмыслоўцаў. Таму мы абралі варыянт папулярнага выданьня — зь вялікімі якаснымі здымкамі, з калекцыянэрскімі цэнамі, вялікай колькасьцю дапаможнае інфармацыі, у цьвёрдай вокладцы і на добрай паперы. Кніга мусіць быць карысная ўсім, хто цікавіцца айчыннай гісторыяй. Але ёсьць і разьдзел, разьлічаны на навукоўцаў. Думаю, віцебскаму дасьледніку раньняе нумізматыкі і геральдыкі ВКЛ Аляксандру Грамыку ў супрацы з намі ўдалося стварыць грунтоўную канцэпцыю вывучэньня самых першых манэтаў Вялікага Княства. Ягоная рэканструкцыя мынцарства ВКЛ другое паловы XIV — пачатку XV ст. цалкам самабытная і добра падмацаваная гістарычнымі фактамі. Другі мой суаўтар, Аляксандар Крываручка, адказваў за дакладнасьць калекцыянэрскіх цэнаў на манэты ў даведніку.

**«НН»: Што новага зьмешчана ў кнізе? У параўнаньні, напрыклад, з празванай сярод беларускіх нумізматаў «бібліяй» Рабцэвіча «Нумізматыка Беларусі»?**

**ЗГ:** Гэта зусім розныя кнігі. «Біблія» Рабцэвіча — аповед у навукова-папулярным стылі, я ж імкнуўся зрабіць практычны падручнік па вывучэньні і зьбіраньні манэтаў. Нашая кніга не падсумоўвае вынікаў — яна адлюстроўвае



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

дынаміку разьвіцьця беларускае нумізматыкі.

Безумоўна, я азіраўся ў сваёй працы на Рабцэвічаву кнігу. Яна была і застаецца найбольш поўнай крыніцай зьвестак пра хаджэньне манэтаў на Беларусі на сёньня. Але, нягледзячы на бясспрэчна высокі ўзровень напісаньня «Нумізматыкі Беларусі», яна, на маё меркаваньне, уяўляе зь сябе пэўнага кшталту пагляд збоку, не зь Беларусі. Яна не выхоўвае ў чытачоў пачуцьце свайго, чагосьці, што трэба берагчы, — нібы большая частка нашае нумізматыкі ёсьць вынікам волі іншых народаў. На мой пагляд, са сталеньнем сучаснае беларускае дзяржавы перад дасьледнікамі пачынаюць паўставаць якасна новыя задачы. Няма гэткага сапраўды сувэрэннага гаспадарства, якое б ня мела і сваёй айчыннай нумізматыкі, найлепш распрацаванай зь мясцовага, а не ўсясьветнага ці перыфэрыйна-суседзкага гледзішча.





**Трохграшовік. ВКЛ. Срэбра. 1563 г.**

**«НН»: У 2005 г. ужо быў выдадзены каталёг Віктара Какарэкі і Ільлі Шталянкова «Монеты Великого княжества Литовского 1492 — 1707». Ці не дублюе яе вашая кніга?**

**ЗГ:** Натуральна, не. Як і ў выпадку з кнігай Рабцэвіча, нашыя задачы былі зусім іншыя. Да прыкладу, як было не распавесьці чытачу пра сярэднявечныя манэты ВКЛ (да 1492 г.), вывучэньне якіх у наш час ідзе. Дагэтуль амаль нідзе, апроч як у артыкулах літоўскіх дасьледнікаў, ня можна было знайсьці больш-менш поўных і новых зьвестак пра тыя манэты. Такім чынам, нашая кніга ахоплівае ня толькі большы пэрыяд, але і падае больш падрабязнай і разнастайнай інфармацыі. У даведнік укладзеныя зьвесткі пра фальшэрствы і спосабы іх выкрыцьця, апісаная старадаўняя тэхніка выбіцьця манэтаў.





**Залатая манэта вартасьцю дзесяць дукатаў. XVI ст.**

**«НН»: Ці жывая беларуская нумізматычная супольнасьць? Ці існуе яна наагул?**

**ЗГ:** Яна ажывае. Штогод зьяўляюцца новыя маладыя дасьледнікі, якія пачынаюць працаваць над сур'ёзнымі праектамі, накшталт манаграфіяў, дысэртацыяў, кнігаў, прысьвечаных нумізматыцы. Пройдзе колькі гадоў, і яны нас зьдзівяць.

Палякі зрабілі першыя крокі ў нумізматыцы Вялікага Княства ў XIX — п.п. XX ст., але вывучэньне літоўскіх манэтаў заставалася ў іх увесь час у пэўным сэнсе на маргінэсе ўвагі. У д.п. XX ст. ініцыятыву ў асэнсаваньні нумізматычнае спадчыны ВКЛ перахапілі дасьледнікі зь Літвы. Літоўская нумізматыка і цяпер разьвіваецца дынамічна, маючы на чале 2 — 3 сур'ёзных навукоўцаў-лідэраў. Беларуская ж нумізматыка робіць толькі першыя крокі. Стаць знакавай постацьцю, шанаванай у сьвеце, здолеў пакуль толькі Валянцін Рабцэвіч. Але сытуацыя мяняецца ў лепшы бок.

Я кажу тут толькі пра нумізматыку Вялікага Княства таму, што яна складае 95% самастойных манэтных эмісіяў беларусаў у гісторыі. Гэтак здарылася, што існуе замала зьвестак пра мынцарскую актыўнасьць продкаў беларусаў у далітоўскі пэрыяд, і, безумоўна, яна была мінімальнай. Новыя ж эмісіі адносяцца ўжо да канца XX ст.

**Дукат часоў вялікага князя Жыгімонта Аўгуста 1562 г.**



Што тычыцца калекцыянэрскага рынку і каталёгаў з цэнамі, нам пакуль цяжка бароцца з Польшчай. Аб'ектыўна больш палякаў цікавіцца нумізматыкай, і кола актыўных удзельнікаў нумізматычнага жыцьця цяжка параўнаць. Калі ж параўноўваць зь іншым нашым суседам, зь якім мы дзелім спадчыну Вялікага Княства, мы знаходзімся ня ў горшым стане. Да прыкладу, колькасьць і якасьць беларускіх інтэрнэт-рэсурсаў перавышае літоўскія.

**«НН»: Ці плянуецца ангельская вэрсія кнігі? Літоўцы выдаюць свае знакавыя каталёгі (такія, як Іванаўскаса ці Саяўскаса) па-ангельску, адкрываючы гэтым перад сусьветнаю супольнасьцю спадчыну ВКЛ праз сваю прызму.**

**ЗГ:** Канкрэтна гэтая кніга разьлічаная перадусім на беларускага спажыўца. Яна ня ёсьць «канцавым прадуктам», а мусіць выклікаць ажыўленьне інтарэсу, дыскусію, новыя ідэі. Калі справа ў мяне дойдзе да выданьня каталёгу, безумоўна, ён будзе мець ангельскамоўную вэрсію.

**«НН»: Як не спытаць пра вашыя асабістыя пляны на будучыню.**

**ЗГ:** Я пляную і далей працягваць дасьледаваньні розных аспэктаў нумізматыкі ВКЛ, а перадусім — саміх манэтаў. Хацелася б падрыхтаваць шэраг публікацыяў аб зборах манэтаў Вялікага Княства ў замежных музэях. Але на гэта трэба час і сродкі на выезды, бо музэі рэдка жадаюць супрацоўнічаць праз Інтэрнэт.

**«НН»: Напрыканцы распавядзеце, калі ласка, дзе можна набыць кнігу?**

**ЗГ:** Мы зьбіраемся распаўсюджваць кнігу праз прыватных распаўсюднікаў. На нумізматычных парталах яна ўжо зьявілася (www.belcoins.com і www.magduclit.com). Неўзабаве кнігу можна будзе знайсьці і праз сайт «Кнігі поштай» (www.knihi.net), а таксама ў шэрагу менскіх кнігарняў.

**Гутарыў Руслан Равяка**

**Працяг са старонкі 29.**

най ідэалягічнай машыны.

Рухавік магутнай савецкай прапаганды быў запушчаны адразу, але казкі аб шчасьлівым жыцьці ў «краіне Саветаў» не суадносіліся з рэчаіснасьцю. Практычна з самага пачатку «шчасьлівага ўзьяднаньня» распачаліся рэпрэсіі супраць нядобранадзейных элемэнтаў — прадстаўнікоў адміністрацыі, афіцэраў, інтэлігенцыі. Абыякавасьць да новых улад у тутэйшых жыхароў зьмянілася страхам.

Напярэдадні выбараў у Вярхоўныя Саветы БССР і СССР, прызначаных на сакавік 1940 г. да раніцы 11 лютага таго ж году, у адпаведнасьці з сакрэтнай пастановай СНК СССР аб высяленьні з заходніх вобласьцяў Украіны і Беларусі асаднікаў і работнікаў лясной аховы з тэрыторыі Ашмянскага павету, у які ўваходзіў і Астравецкі раён, былі выселеныя 146 сем'яў асаднікаў (824 чалавекі) і 56 сем'яў работнікаў лясной аховы (253 чалавекі). Яны абвяшчаліся «ворагамі савецкай улады і народу», а таму падлягалі зьнішчэньню. Высяленьне мела «вялікае палітычнае значэньне», а таму яго неабходна было правесьці «бяз шуму і панікі». Для ажыцьцяўленьня дэпартацыі прыцягваліся партыйныя і камсамольскія актывісты Астравецкага раёну, яны падвозілі чальцоў апэратыўных троек да мейсца і апісвалі маёмасьць асаднікаў.

Аблічча новай улады стала відавочнае. І усё, што рабілася потым, сустракала недавер ці абурэньне. Часьцей за усё маўкліваe.

Адкрыты супраціў выклікала толькі канфіскацыя зямлі ў калгасы. Новы від гаспадараньня распаўсюджваўся марудна: да канца 1940 г. у Астравецкім раёне было створана толькі пяць калгасаў.

«Я меў кусок хлеба і баюся яго згубіць у калгасе», — гэтыя словы селяніна Курылы зь вёскі Ігнацова адлюстроўваюць стаўленьне жыхароў Астравеччыны да калектыўнай гаспадаркі. Яны цытуюцца ў дакладной запісцы інструктара ЦК КП(б)Б І.Качуры «Аб стане калгасаў і далейшай калектывізацыі ў Астравецкім і Пастаўскім раёнах Вялейскай вобласьці» загадчыку сельгасаддзелу ЦК КП(б)Б С.Гласаву ў сьнежні 1940 г.

Канчаткова ўсе вёскі былі калектывізаваныя ўжо пасьля Другой сусьветнай вайны, толькі ў 1949—1951 гг. Страх непасільных падаткаў ці, яшчэ горш, раскулачваньня быў галоўнай прычынай пасьпяховага завяршэньня калектывізацыі.

Людзі да апошняга абаранялі сваю ўласную зямлю. Калі ў вёску Маркуны, дзе жылі мае бабуля і дзядуля, з раёну прыгналі тэхніку для канчатковага аб'яднаньня гаспадарак у калгас, жанчыны ўкленчылі на дарозе і сталі маліцца. І не зварухнуліся зь мейсца, як ім ні пагражалі. Трактары і грузавікі былі вымушаныя разьвярнуцца, а ўтварэньне калгасу ненадоўга адтэрмінавалі.

Новая ўлада ўспрымалася як непазьбежнасьць, але ўнутрана яна бескампрамісна адпрэчвалася. Як палякі, так і беларусы з Заходняй Беларусі скарыстоўвалі любую магчымасьць для таго, каб выехаць у Польшчу. Людзі зьяжджалі сем'ямі, забіралі з сабой усё, што маглі, гналі нават буйную рагатую жывёлу.

Аднойчы выправілася ў шлях сям'я дзядзькі маёй бабулі Юзэфы. Яны клікалі яе з сабой, але дзед Браніслаў быў у ад'езьдзе, і бабуля вырашыла застацца. Дзядуля потым сказаў, што трэба было ехаць: ён бы абавязкова адшукаў яе ў Польшчы... Затое цяпер на Каляды і Вялікдзень мы заўсёды атрымліваем ад польскіх сваякоў сьвяточныя паштоўкі (вядома, на польскай мове). І гэта зусім звыклая зьява на нашых Астравецкіх прасторах. Сярод маіх знаёмцаў, карэнных астраўчан, прынамсі, няма нікога, у каго б не было нейкіх сваякоў у Польшчы.

Тыя ж, хто застаўся, былі і ёсьць страшэннымі «антысаветчыкамі». Мой дзядуля аб падзеях у сьвеце заўсёды даведваўся выключна з «варожых» радыёстанцый. Бабка шакавала маю піянэрскую сьвядомасьць заявамі, што Ленін — душагуб і крывапійца.

Да моманту зьяўленьня ў нашым раёне ў канцы 1980-х перасяленцаў з Чарнобыльскай зоны праваслаўных на Астравеччыне не было: на мяжы зь Літвой была толькі Траецкая царква старавераў, а так усе парафіі — каталіцкія. І службы адпаведна на польскай мове, тым больш, што ксяндзы былі ў асноўным з Польшчы.

Нягледзячы на ўсе пагрозы, людзі «хадзілі да касьцёлу», і пры савецкай уладзе духоўнае жыцьцё набывала пэўную падпольную афарбоўку. Бралі шлюб, хрысьцілі дзяцей, ішлі да першай камуніі звычайна не ў сваёй вёсцы, каб, барані Божа, не даведаліся дзе-небудзь «пры начальстве». Таямнічасьці сакральным падзеям надавала і польская мова — зь цягам часу ўсё менш зразумелая новым пакаленьням, але тым ня непахісная ў касьцельных пазыцыях. Каб палегчыць дзецям вывучэньне Катэхізісу, існавалі своеасаблівыя «раздрукоўкі» — надрукаваныя на машынцы малітвы: польскія словы рускімі літарамі. Дарэчы, Касьцёл і цяпер выдае падобныя зборнікі, толькі на больш высокім паліграфічным узроўні.

У астравецкіх касьцёлах дагэтуль аддаецца перавага польскай мове. Некалькі гадоў таму малады ксёндз Мікалай распачаў справу беларусізацыі каталіцкай службы і пасьпеў зрабіць шмат. Але людзям няёмка зьвяртацца да Ўсявышняга на «простай» мове. Тое, што яна родная, Богам нам дадзеная, у якасьці аргумэнту не спрацоўвае. «Сьвядомыя» парафіяне зьвярнуліся да біскупа са скаргай і просьбай вярнуць звыклы парадак рэчаў. У выніку Мікалая з Астраўца перавялі ў іншае месца.

З ад'ездам ксяндза Мікалая зьнікла і беларуская мова з астравецкіх касьцёлаў. Новыя сьвятары хоць і зь мясцовых, і вучыліся на Беларусі, але дэманструюць сваю выключную адданасьць каштоўнасьцям польскага Каталіцкага Касьцёлу.

Гэтым становішчам максымальна задаволеная абсалютная большасьць парафіян, а гэта ня толькі 80-гадовыя бабулькі, якія скончылі свой час чатыры клясы польскай школы. Аднойчы ў адказ на сваё абурэньне я пачула наступнае: «А мне так падабаецца. У дзяцінстве я вывучыла ўсё па-польску, і мне так прасьцей. А па-беларуску я не магу», — сказала адукаваная 20-гадовая дзяўчына, што вучылася ў Менску.

«Польскі дух» у нашых краях досыць выразны, нягледзячы на зьяўленьне на сусьветнай карце незалежнай Беларусі, беларусізацыю, а потым русіфікацыю і г.д. Чаму?..

Для кожнай складанай праблемы існуе простае рашэньне і тлумачэньне. У дадзеным выпадку спрошчаны адказ будзе выглядаць наступным чынам: так склалася толькі таму, што беларусы сябе ня любяць, а таму не жадаюць быць беларусамі. Цяпер найбольш папулярна ператварацца ў расейцаў. Спэцыфіка ж Заходняй Беларусі ў тым, што тут больш папулярны вобраз паляка. Гэта парадаксальна, калі памятаць, якое стаўленьне да беларусаў было падчас польскай акупацыі. Але ў той час прыналежнасьць да польскай нацыі гарантавала грамадзянскія правы і больш высокі ўзровень матэрыяльнага і культурнага жыцьця. А значыць, каб зьмяніць жыцьцё ў лепшы бок, трэ было стаць палякам.

Праз пакаленьні перадаецца ня толькі мудрасьць продкаў. Памылковыя ўяўленьні таксама надзіва жыцьцяздольныя, а калі падмуркам іх ёсьць страх быць сабой і інэрцыя сьвядомасьці, то зьяўляецца рызыка ў пошуках лепшай долі ніколі не знайсьці свайго адзінага сапраўднага шляху.


АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

# Неабмежаваныя «абмежаваныя магчымасьці»

У кожнага чалавека свой шлях на зямлі, свае цяжкасьці і выпрабаваньні, але, калі здараецца чарговая «чорная» палаcа і зьяўляецца на парозе спадарыня дэпрэсія, варта ўспомніць пра тых, каму цяжэй. Мы часта не шануем таго, што маем: сваіх блізкіх, сяброў, здароўя... Магчымасьць хадзіць, самастойна перамяшчацца ў прасторы, не падаецца нам чымсьці незвычайным, але ёсьць людзі, для якіх такая магчымасьць страчана назаўсёды. У Беларусі сёньня жыве больш за 504 тыс. інвалідаў, што каля 5,2 % ад агульнай колькасьці насельніцтва. Тысячы лёсаў і характараў, і кожны зь іх непаўторны. І трэба вырашаць для сябе, як жыць далей, хто мацнейшы — ты сам ці ўсё ж — хвароба. Весьці актыўны лад жыцьця на вазку ўдаецца далёка ня ўсім. На жаль. Кожны робіць свой выбар... Алькаголь? Наркотыкі? Дэпрэсія? Ня факт — можна расфарбаваць сваё жыцьцё і жыцьцё сваіх блізкіх у тысячы колераў вясёлкі: абмежаваныя фізычныя магчымасьці не азначаюць абмежаваньня магчымасьцяў інтэлектуальных, мастацкіх, маральных. І вось вам дзьве гісторыі на гэтую тэму.

## Гісторыя першая. Галіна

Галіна Касьпяровіч... Ці шмат вы ведаеце беларусаў, якія заўсёды размаўляюць пабеларуску? Інвалідаў-вазочнікаў, што атрымалі вышэйшую адукацыю? Нарэшце, хоць аднаго інваліда-вазочніка, які працуе ў школе? Упэўнена — не. Хачу расказаць пра адно такое цікавае «выключэньне» ў выглядзе маладой і прыгожай дзяўчыны. Знаёмцеся — Галіна Касьпяровіч, настаўніца беларускай мовы і літаратуры Крывошынскай сярэдняй школы, што ў Ляхавіцкім раёне Берасьцейскай вобласьці.

Звычайная беларуская дзяўчынка. Трынаццаць год. Аўтамабільная аварыя. Пералом хрыбта. Шпіталь. Апэрацыя. І несуцяшальны дыягназ: ты ніколі ня будзеш хадзіць. Так хутка і трагічна жыцьцё зьмянілася на сто восемдзесят градусаў, разьдзялілася на пэрыяд «да траўмы» і «пасьля». Але яно не спынілася (а так, на жаль, здараецца з многімі вазочнікамі), проста пайшло другім кірункам — кірункам перашкод, якія трэба пераадольваць штодзень, «тут і цяпер», пачынаючы ад бар'ераў матэрыяльных, кшталту прыступак, і заканчваючы маральнымі. Дзе мой шлях? Што я магу і павінна зрабіць, а пра што варта забыцца назаўжды?

Школа ўдома — настаўнікі, любімыя і нелюбімыя, як у кожнай школьніцы, і кнігі, якія сталі вернымі сябрамі на ўсё жыцьцё. Тут варта зрабіць прыпынак: расказваючы пра філёляга, наагул немагчыма не ўлічваць літаратуры. Уладзімер Караткевіч... Галя сьцьвярджае, што да Беларусі, да беларускай мовы яна прыйшла менавіта дзякуючы Караткевічу, у нейкай ступені гэта быў шлях да самой сябе, сябе сучаснай. На нейкім этапе дапамог самавызначыцца Рэспубліканскі цэнтар рэабілітацыі інвалідаў-вазочнікаў у Калодзішчах, дзе навучылі «жыць» на вазку і весьці пры гэтым актыўны лад жыцьця.

Працяг на старонцы 47.

# Пошта з Трэблінкі

**Фэлікс Акерман** праехаў апошнім шляхам гарадзенскіх габрэяў. Праехаў, бо ня хоча быць немцам.

Ведаючы, што вялікую частку гарадзенскіх габрэяў замардавалі ў Трэблінцы, я даўно адчуваў патрэбу паехаць сьледам іхняга апошняга шляху, які ішоў з гета №1 у старым габрэйскім квартале праз мост у бок Беластоку. Вагоны чакалі на таварнай станцыі ў Ласосьне. Хто ня трапіў раней у лягер у блізкім Кілбасіне ці на цягнік у Аўшвіц, мусіў быў праехаць гэтай апошняй дарогай. Так хацелі немцы, якія плянавалі выравшыць «габрэйскае пытаньне канчаткова». Яны не былі асабіста маімі продкамі, але яны былі немцы і рабілі гэта ў імя маёй нацыі.

Цяжка быць немцам пасьля ўсяго таго, што здарылася. Непрыемна тлумачыць сабе: чаму? І проста быць немцам, які ня хоча быць немцам. Ніхто з маіх сяброў, знаёмцаў, настаўнікаў ці блізкіх сёньня не ганарыцца тым, што ён немец. Наадварот: з задавальненьнем мы б хацелі быць амэрыканцамі, французамі.

У маім выпадку я калісьці хацеў быць палякам, цяпер ёсьць пэўныя надзеі стаць беларусам — калі на вуліцы размаўляю па-беларуску, людзі гатовыя паверыць на слова.

Сёньняшняя рэакцыя немцаў на мінуўшчыну — гэта неабмежаваная любоў да нашых габрэяў. Тых, каго раней забівалі нашыя дзяды, сёньня мы любім бязь межаў. Таму ў нас зьявіўся прафэсійны падыход да пытаньняў памяці таталітарызму. Немцам наагул здаецца, што яны (мы...) ужо расправіліся з уласнай мінуўшчынай, таму мы гатовыя дапамагчы, напрыклад, бедным беларусам ці расейцам, якія яшчэ не зусім расправіліся з уласнай мінуўшчынай...

> У маім выпадку я калісьці хацеў быць палякам, цяпер ёсьць пэўныя надзеі стаць беларусам.

У тым сэнсе я звычайны немец, які лічыць абавязковай паездку ў Трэблінку. І як прафэсійнага немца мяне абурае, што ў Беластоку ніхто ня ведае, як туды трапіць. Палякам не да таго. Можна сказаць, што наагул ім не шкада сваіх габрэяў, бо Беласток — гэта да вайны габрэйскі горад. А таксама ім не да таго, што пасьля вайны дамы і вуліцы (з тых, што засталіся) яны занялі пасьля габрэяў. Але гэтая думка палітычна не карэктная, таму я стараюся знайсьці свой шлях у Трэблінку без палякаў, якім не да таго. З роварам сядаю ў цягнік на Варшаву і праз гадзіну высаджваюся ў Малкіне. Калі адыходзілі апошнія саставы з габрэямі, тыя ўжо ведалі, што цягнікі едуць сюды. Пра Трэблінку не маглі ведаць, бо адтуль, акрамя ўцекачоў-паўстанцаў, амаль ніхто жывым у сьвет жывых не вярнуўся. Трэблінка тады ўжо была месцам у зоне сьмерці.

Сёньня ў Малкіне мястэчковы фэст. З блізкага берагу Бугу пахне кілбаскамі, людзі ўжо напіліся піва і ня толькі. Таму ніхто ня ў сілах паказаць мне дарогу на Трэблінку. Зь іншага боку, справа выглядае дастаткова проста: ад галоўнай чыгуначнай станцыі толькі адзін шлях вядзе ўбок. Аказваецца, што чыгуначны шлях у Трэблінку існаваў увесь час. Уздоўж яго можна ехаць роварам. Колькі год таму польская чыгунка гэты шлях закрыла, але на знак памяці пра габрэяў ён існуе і вядзе праз Буг уздоўж лесу празь вёску, якая называецца Трэблінка. Тут карова ступае па вуліцы, пад каапэратыўнай крамай мужчыны жлукцяць піва.

За два кілямэтры адсюль з 1942 г. чыгунку вывелі ў лес. Цяпер гранітныя слупы сьведчаць пра межы лягеру сьмерці. На паркінгу шапік, дзе можна набыць квіток, брашуры і паштоўкі. Побач паштовая скрынка — на той выпадак, калі б камусь захацелася выслаць адсюль паштоўку. У нядзелю папоўдні тут анікога. Я пакідаю ровар і сам шпацырую па тэрыто-



Фэлікс Акерман: аўтапартрэт на фоне Горадні.

**Фэлікс Акерман**

Дасьледчык культуры Ўсходняй Эўропы. Доўгі час жыў у Горадні. Вядзе ўласны блог у Інтэрнэце, які напачатку быў прысьвечаны выключна Горадні. Піша па-беларуску.



**Габрэі-ўдзельнікі камуны-кібуцу Га Халуц пад Горадняй.**



**Нэхама Хаш (Nechama Chasz), габрэйская балерына з Горадні.**

рыі лягеру. Мяне зьдзіўляе вось гэтая ў нейкім сэнсе сьціплая краіна памяці, якая без канкрэтных падказак нагадвае пра тое, што ўявіць і так немагчыма. Камень на месцы газавых камэр адпіхвае мяне сваім патасам. Але далей сярод надпісаў я знаходжу і Горадню, і Крынкі, Індуру і шмат іншых паблізкіх мястэчак, у якіх сёньня існуе КСУП ці аграгарадок.

Зеляніна, самота і свабода мысьлі робяць гэтае месца асаблівым, спакойным і мэлянхалічным, бяз гвалту, які адбываецца на гасьцях у іншых былых лягерах сьмерці. Зь іншага боку, не хапае імёнаў, фатаграфіяў і лёсаў людзей, якія тут скончылі сваё жыцьцё, — на тысячы гарадзенскіх габрэяў застаўся адзін сымбалічны камень. Значыцца, калі мы ня ведаем, хто яны былі, як жылі, які быў іхні апошні шлях, дык мы тут нічога ня знойдзем, акрамя паляны, на якой іх замардавалі.

І зноў жа пачаўся нямецкі сындром. Мы ня толькі забілі амаль што ўсіх габрэяў Эўропы, але яшчэ захацелі вызначаць тое, як успамінаць пра іх. Таму я сьціпла ўпішуся ў кнігу «водгукаў і прапановаў» і пашлю гэтыя радкі поштай ў Беларусь. Няхай самі беларусы — так, як палякі, — вызначаюць, як успамінаць сваіх габрэяў, але памяць пра іх мусіць быць жывая. Не для нямецкага пакаяньня, але для памяці самой Беларусі, якая без сваіх габрэяў гэтак зьбяднела.

Я зьдзіўлены, чаму ў Горадні на месцы вялікіх могілак, дзе неўзабаве маюць адкрыць спартовую арэну ў сучасным постсавецкім стылі, няма мэмарыяльнай дошкі. Дзіўна, што ў музэі пакуль што няма згадак і пра тое, што горад калісьці быў і габрэйскі. Цяжка было шукаць месца лягеру ў Кілбасіне — амаль ніхто ў Горадні ня ведае, дзе гэтае месца знаходзіцца. А там не напісана ні слова пра тое, што савецкія грамадзяне, якія там загінулі, збольшага былі габрэйскай нацыянальнасьці.

У Трэблінцы, дзе шлях шматлікіх гарадзенцаў скончыўся назаўжды, я адчую сучаснасьць і чалавечнасьць, толькі калі ўбачу гурбінку камянёў, што прывезьлі школьнікі з Ізраілю — напісалі на іх імёны сваіх продкаў і пакінулі ў лесе. Для мяне гэта і ёсьць знакам жыцьця ў месцы, дзе калісьці валадарыла сьмерць.



**Рэбэ Нохум, «гарадзенскі сьвяты».**



**Дзяўчаты з Габрэйскага спартовага клюбу дэманструюць гімнастычную кампазыцыю.**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**28 студзеня адзначаецца як Дзень памяці Галакосту.**




**Трэблінка. Частка мэмарыялу.**

# Радавы Лябёдушкін стаў дзяўчынай

З такога пераўвасабленьня пачынаецца спэктакль «Матылёк» Мікалая Пінігіна, пастаўлены лідэрам беларускай сцэны ў Тэатры юнага гледача.

Палкоўніку гарбата пойдзе ня ў тое горла, і ён згубіць голас. Перапытае некалькі разоў і не паверыць. Радавы Коля Лябёдушкін з пятай роты стаў дзяўчынай. З такога пераўвасабленьня пачынаецца спэктакль «Матылёк» Мікалая Пінігіна, пастаўлены лідэрам беларускай сцэны ў Тэатры юнага гледача.

Дзяўчына Лябёдушкін, якую грае Ганна Хітрык, распавядае, што адчувае ў сабе геній і жыць ня можа без тэатру, палкоўнік намераны перарабіць яе назад у радавога, заля сьмяецца. Вось толькія пераўвасабленьні на гэтым не сканчаюцца, і не палкоўнік вяртае радавога ў шэраг, а наадварот. У клюбе вайсковай часьці граюць уначы Шэксьпіра, палкоўнік і шараговец шыюць зь фіранак касцюмы, запарваюць каву.

Мікалай Пінігін: «Гэта спэктакль пра тое, як адна жывая душа запаліла другую душу, нежывую, і зрабіла яе жывой. Адна душа запаліла другую, аддала ёй сваё сьвятло і памерла. Вось і ўся простая формула. Чалавек, які мае рэлігійную сьвядомасьць, унёс сьвятло ў душу іншага чалавека, які кажа ў пачатку спэктаклю: «Там холадна, і пуста, і нічога ня будзе — за труною», а ў канцы спэктаклю проста разумее, што зь целам душа не памірае. Гэта нямала».

Рэжысэр кажа, што паставіў гэтую п’есу для Ганны Хітрык. Раней, калі ён ставіў «Матылька» ў Пецярбургу, на першым пляне была роля палкоўніка. Ён тлумачыць гэта не сваёй задумай, а тым, што Ганны Хітрык у Пецярбургу не было.

У Мікалая Пінігіна, на жаль, няма свайго тэатру. Таму глядзіце прэм’еру «Матылька» ў менскім Тэатры юнага гледача 6 і 8 лютага.

**Паводле «Эўрапейскага радыё для Беларусі»**



**Мікалай Пінігін**

ужо 8 гадоў працуе ў Пецярбургу, у Вялікім драматычным тэатры імя Таўстаногава. Ягоныя спэктаклі «Тутэйшыя», «Ідылія», «Сымон–музыка» (тэатар імя Янкі Купалы) сталі клясыкай беларускай сцэны.




**«Свабодны тэатар» 27 студзеня ўручыў прэміі пераможцам аднайменнага конкурсу сучаснай драматургіі. На фота: Мікалай Халезін прэзэнтуе монаспэктакль «Пакаленьне Jeans».**

# Дні габрэйскай кнігі і фатаграфіі




Выстаўка «Дні габрэйскай кнігі» і экспазыцыя ізраільскіх фатографаў праходзяць з 30 студзеня па 4 лютага ў Нацыянальнай бібліятэцы. Гэтыя імпрэзы будуць імпульсам для актывізацыі кантактаў між Беларусьсю і Ізраілем. Такую думку выказаў пасол Ізраілю ў Беларусі Зееў Бен-Ар'е.

**Керэт Э. Кіроўца аўтобуса, які хацеў стаць богам.** З мовы іўрыт пераклаў Павал Касьцюкевіч. — Менск: Логвінаў, 2007.

У кніжнай выстаўцы бяруць удзел 20 ізраільскіх выдавецтваў, якія выпускаюць кнігі на габрэйскай і на расейскай мовах.

У рамках дзён 31 студзеня і 1 лютага прэзэнтавалася кніга Этгара Керэта ў перакладах на беларускую нашаніўца Паўла Касьцюкевіча клясычным правапісам. Імпрэзы прайшлі ў Нацыянальнай бібліятэцы і ў Габрэйскім культурным цэнтры.

**МБ**

## Кнігі самай беларускамоўнай супрацоўніцы Нацбібліятэкі і самага габрэйскага беларускага пісьменьніка

Кніга складаецца зь некалькіх частак. Друкуецца маніфэст трансьлінгвізму і псыхадэлічнага літаратуразнаўства «Крышталёвы сад».

Другая частка — «Літаратурныя партрэты». Тут — пра Надзею Артымовіч і Алега Бембеля, Юр'я Гуменюка і Ігара Бабкова, Юрку Голуба і Уладзімера Дубоўку, Яўгенію Пфляўмбаўм і Вольгу Седакову.

Трэцяя частка зьмяшчае рэцэнзіі на кнігі Пётры Васючэнкі, Уладзімера Арлова, Леры Сом, а таксама фільм «2001 Касьмічная адысэя» Стэнлі Кубрыка.

Друкуюцца мініятуркі-абразкі «Запісы за кухоннай фользе», інтэрвію, дадзенае часопісу «Першацьвет» ды інш.

Шукайце ў незалежных распаўсюднікаў.

**Сільнова Людка. Крышталёвы сад: Кніга крытыкі.** Менск: Выдавец І.Логвінаў, 2006. — 144 с. (Другі фронт мастацтваў).




**Бядуля Зьмітрок. Выбраныя творы.** Менск: Кнігазбор, 2006. — 496 с.



У кнізе зьмешчаныя вершы, аповесьці «Салавей», «У дрымучых лясах», некалькі апавяданьняў уключна з хрэстаматыйнымі «Пяцьцю лыжкамі заціркі». Друкуецца публіцыстыка 1917—1919 г., у ліку знакамітыя «Жыды на Беларусі». Укладаньне, прадмова і камэнтары Уладзімера Казьберука.

Гэтую кнігу шукайце ў кнігарнях.

**АГ**

### Фэстываль праваслаўных сьпеваў

Калектывы зь Беларусі, Расеі, Польшчы і Латвіі бяруць удзел у VI фэстывалі праваслаўных сьпеваў Гарадзенскай япархіі 1—3 лютага. Журы ўзначальвае сьвятар Каложы, сябар Беларускага саюзу кампазытараў, ляўрэат Дзяржаўнай прэміі Андрэй Бандарэнка.

**МБ**

### КАЛЯНДАР

## Люты

**2** — Грамніцы ў каталікоў.

**2** — 125 гадоў з дня нараджэньня ірляндзкага пісьменьніка Джэймса Джойса, ляўрэата Нобэлеўскай прэміі (1882 — 1941).

**11** — 200 гадоў таму (1807) нарадзіўся Напалеон Орда, мастак, пэдагог, пісьменьнік кампазытар, удзельнік паўстаньня 1830—1831 гадоў.

**14** — Дзень Сьвятога Валянціна. Сусьветны Дзень закаханых.

**14** — 100 гадоў з дня нараджэньня Алеся Звонака, паэта, перакладчыка, крытыка (1907 — 1996).

**15** — Грамніцы ў праваслаўных.

**16** — 250 гадоў таму (1757) нарадзіўся Юльян Урсын Нямцэвіч, пісьменьнік, гісторык, ад'ютант і сакратар Тадэвуша Касьцюшкі.

**21** — Папяльцовая серада ў каталікоў.

**23** — 100 гадоў таму (1907) нарадзіўся Станіслаў Станкевіч, беларускі літаратуразнаўца, буйны грамадзкі дзеяч ў Заходняй Беларусі й на эміграцыі, рэдактар часопісу «Рух», газэтаў «Бацькаўшчына» й «Беларус».

**24** — 200 гадоў з дня нараджэньня амэрыканскага паэта і перакладчыка Генры Лангфэла (1807 — 1882).

**25** — 50 гадоў з дня нараджэньня паэта Алеся Пісьмянкова (1957 — 2004).

**26** — у Менску пачала выдавацца грамадзка-палітычная і літаратурна-мастацкая газэта «Літаратура і мастацтва» (1932).

## ЮРАСЬ ПАЦЮПА

КРАСУНІ, ШЧОДРАЙ НА АБЯЦАНКІ

Кахаць цябе — дарыць сабе букеты.
Ляцець? Паўзьці? Бяз сэнсу і бяз мэты.

Ці спаць з табой, з карцінай Фраганара,
купацца ў моры, што намалявана?

Згарэць ў агні халоднага фантану,
героем стацца ўласнага раману,

купацца ў славе, што сабе прыдумаў...
Хаджу абняты ўвесь празрыстым сумам —

чым заплачу за ноч, якой ня будзе?
Ці ж марыў я аб чыстым такім цудзе.

Ты з мужам сьпіш, але, маўляў, зь імною,
і я плачу той самаю цаною:

там месяц, бачыш, зьзяе на паўсьвету?
Ён твой. Хутчэй, лаві даляр паэта!

## КАСТУСЬ СЕВЯРЫНЕЦ

БЕЛАРУСАЧЦЫ

*Тэлефонны экспромт на №7.......*

Ажно да самага сьвітанку
Дождж лашчыць восень каля ганку,
Са мной гуляецца ў маўчанку…
Я ж зранку маю спадзяванку,
Што вып'ю кавы філіжанку,
Пачую Насту Палажанку,
Скажу ёй:
— Наста! З добрым ранкам!
Дождж лашчыць восень каля ганку,
Са мной гуляецца ў маўчанку!
А ты?..

## ВІКТАР ЖЫБУЛЬ

КАЛЯДНАЯ МІСТЭРЫЯ

Да нас прыходзіў малады
прыгожы мужычок.
Ён прысабачыў правады
і ўсталяваў жучок.

Мы мужычка пачаставаць
сьпяшаліся вінцом,
казалі:
— Файна! Так трымаць!
Выдатна! Малайцом!

— Ня варта... — шэптам гаварыў
зачараваны госьць, —
я сёньня для сябе адкрыў,
што сэнс у працы ёсьць.

Яе раблю я для душы
штоночы і штодня.
Мне не патрэбны барышы.
Матэрыя — фігня!

Мы заківалі мужыку,
расчуленыя ўшчэнт,
яму паціснулі руку
і налілі яшчэ.

Мы за жучка яму аддаць
маглі б усё: бяры!
Зь дзяцінства нас цягнула да
вусатай жамяры!

Зірнулі на гадзіньнік мы:
21.05.
— Цямнее рана ў час зімы,
застанься начаваць!

Але мужык перамахнуў
цераз парог нагу:
— Я добра ў вас ужо бухнуў,
а болей не магу...

Даруйце... Выбачайце... Я ж
да іншых палячу.
Цягну я поўны сакваяж,
пасьпець да ўсіх хачу!
Нясе дабро мая рука.
Я — штатны Дзед Мароз...”

...Мы абдымалі мужыка
і цалавалі ў нос.
І разьвітаўся назаўжды
забаўны мужычок.
Ён нам у спадчыну сьляды
пакінуў і жучок.

15 сьнежня 2006 г.


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

СЬЦЯПАН ДЗІНЬ-ДЗІЛЕВІЧ,
МАКАЎКА



# Як Дзед Мароз новае сьвята прыдумаў

Жыў-быў дзед. І гэта быў ня проста дзед, а Дзед Мароз. І жыў ён не абы-дзе, а ў нас, у Беларусі. Некаторыя кажуць, што ён жыве дзесьці ў Ляпляндыі, але гэта няпраўда. Паглядзеце, як ён апрануты — ва ўсё бел-чырвона-белае. Так што ніякіх сумневаў быць ня можа — Дзед Мароз жыў і жыве ў Беларусі. У Менску, беларускай сталіцы, славутаму заводу лядоўняў далі імя Дзеда Мароза. У Белавескай пушчы збудавалі яму лецішча. А яшчэ трэба сказаць, што Мароз — гэта прозьвішча нашага дзеда. А імя ягонае — Зюзя. Імя гэта старажытнае, і памятаюць яго толькі блізкія сябры Дзеда Мароза.



Гэты Дзед Мароз — вялікі чараўнік і работнік, робіць многа цудаў і ўсякай складанай работы. Трэба яму лядовыя масты масьціць на рэках і азёрах. Трэба сьнегавым покрывам усю зямлю ўсьцілаць.Трэба праветрываць усю краіну сьцюдзёнымі вятрамі, каб людзі маглі дыхаць сьвежым вольным паветрам. Часам любіць пажартаваць. То возьме, схавае ўвесь сьнег — і не дапросісься, і не дакупісься, як гэтай зімой. То возьме вясною сыпане сьнегавыя завеі, віхуры і завірухі, як летась у сакавіку.

Ведама, старэюць людзі і дзяцінянца, дык і наш Дзед Мароз, крышку прыдзяцінеўшы, часам любіў, як тыя дзеці, кінуць сьнежку ў плечы ці каўзануць так, каб чалавек паказаў бы цырк на лёдзе. Жарты жартамі, але работу сваю рабіў ён спраўна. А самай улюбёнай ягонай справай было ладзіць сьвяты. Акрамя ўсім вядомых Калядаў і Новага Году, былі яшчэ такія харошыя сьвяты: Сьвята Першага Непатаптанага Сьнегу, Сьвята Хрумсьценьня Першым Лёдам На Лужынах, Конкурс Прыгажосьці Сьнегавых Бабаў, Рэстаўрацыя Вежаў Крэўскага Замку Са Сьнегу І Лёду, Гонкі Лыжнёю, Пратаптанаю прэзыдэнтам Рэспублікі Беларусь. Вось колькі многа сьвятаў, і ўсё

трэба спраўна арганізаваць і падарункі пераможцам падарыць.

А зрабіўшы работу, любіў Дзед Мароз пахадзіць-пагуляць па сваёй краіне. І вось, гуляючы па Менску і другіх гарадох пасьля Новага Году, заўважыў ён такую прыкрую рэч. Валяюцца на вуліцы сьвяточныя елачкі, нікому ўжо не патрэбныя. Іголачкі абсыпаліся, дзе-нідзе прычапіліся абрывачкі папяровых гірляндаў і залацістага доджджыку. Яшчэ зусім нядаўна каля іх так радасна сьпявалі, скакалі, карагоды вадзілі, а вось цяпер — куча сьмецьця. Крыўдна стала Дзеду Марозу, і вырашыў ён





нешта прыдумаць.

Думаў-думаў і прыдумаў ён новае сьвята. А каб людзі пра гэта даведаліся, напісаў ён ім ліст. Вядома, Дзеду Марозу, каб напісаць ліст, ня трэба ні паперы, ні алоўка. Ён дзьмухне сьцюдзёна — і на шыбах вокнаў зьявяцца ледзяныя пісьмёны. Прыгожыя такія, кожная літарка вымаляваная. І вось чытаюць назаўтра людзі такі ліст:



«Добры дзень, мае даражэнькія землякі! Дасылаю вам сьцюдзёныя і бліскучыя прывітаньні. Як заўсёды, зычу вам здароўя і бадзёрага духу. І хачу з вамі пагаварыць пра такую сур’ёзную, неадкладную справу. Надта мне стала шкода, як на Каляды і Новы Год марнуецца многа жывых елачак. І прыдумаў я, каб ставіць у кватэрах не жывыя, алэ цацачныя елкі. А каб было весялей, на гэтыя цацачныя елкі чапляць ня цацкі, а сапраўдныя прысмакі: мандарынкі, яблычкі, арэшкі ў залатой фользе, цукеркі ў каларовых фанціках, пернічкі і печыўцы. І хто так зробіць, той будзе мець яшчэ адно сьвята, ня толькі Сьвята Упрыгожваньня Елкі, але і Сьвята Смакаваньня Елачных Цацак. Але ж вы скажаце, што маеце вялікія наборы елачных цацак — куды іх дзяваць? Адказваю — калі ў хаце ёсьць фікусы-кактусы, можна цацкі пачапіць туды. Люстраныя балёнікі можна вывесіць у зручным месцы і потым глядзецца ў іх, як у люстэрка. Пабачыце, якія ў вас прыгожыя вушы, чубы, насы і языкі. На гэтым з вамі разьвітваюся, бывайце здаровенькія і прыгожанькія. Вясёлых вам сьвятаў!

Ваш Зюзя Мароз».

І з таго часу пачалі людзі ставіць у сваіх кватэрах цацачныя елачкі. Песеньку «В лесу радилась ёлачка...» ніхто больш не сьпяваў. Цяпер сьпявалі «Нарадзілася елачка ў Кітаі...» Надта былі задаволеныя падмятайлы, што пасьля зімовых сьвятаў вуліцы засталіся чыстыя. А самыя радыя былі дзеці, якія палюбілі новае сьвята — Сьвята Смакаваньня Елачных Цацак.

*Вільня, 2006.*



**Малюнкі Сяргея Харэўскага**



PHOTO.BYMEDIA.NET

## ІМПРЭЗЫ

**Твары герояў**

На Варвашэні, 8 працуе выстава мастака Алеся Цыркунова — першая з трыяды заплянаваных экспазыцыяў, прысьвечаных вызвольнаму руху Беларусі апошняга стагодзьдзя. На карцінах — Вацлаў Іваноўскі, браты Луцкевічы, Браніслаў Тарашкевіч, Вінцэнт Гадлеўскі, Васіль Быкаў, Міхась Ткачоў, Зянон Пазьняк, Уладзіслаў Чарняўскі…

**Напалеон Орда**

3 лютага ў філіяле «Дом Ваньковічаў» адбудзецца сустрэча «Напалеон Орда. Мастак. Музыка. Змагар», прысьвечаная 200-годзьдзю з народзінаў нашага знакамітага суайчыньніка. Пачатак а 13-й.

**Музычная гасьцёўня**

Музычная гасьцёўня Дому Ваньковічаў запрашае на канцэрт «З шэдэўраў сусьветнай вакальнай клясыкі» міжнароднага праекту «Маладыя галасы». Канцэрт пачнецца 3 лютага а 16-й гадзіне.

## ТЭАТРЫ

**Опэра**

*На сцэне Цэнтральнага Дому афіцэраў*

**3 (сб)** — «Кармэн».
**4 (ндз)** — «Кот у ботах».
**4 (ндз)** — «Іяланта».
**7 (ср)** — «Травіята».
**9 (пт)** — «Трубадур».
**10 (сб)** — «Сэвільскі цырульнік».
**11 (ндз)** — «Церам-церамок».

**Купалаўскі тэатар**

**2 (пт)** — «Сымон-музыка».
**7 (ср), 8 (чц)** — «Ідылія».
**9 (пт)** — «Макбэт».

*Ранішнія спэктаклі*

**4 (ндз)** — «Паўлінка».
**11 (ндз)** — «Сьнежная каралева».

*Малая сцэна Купалаўскага*

**4 (ндз)** — «Беларусь у фантастычных апавяданьнях».
**11 (ндз)** — «Апельсінавае віно».

**Тэатар юнага гледача**

**9 (пт)** — «Маленькі лорд Фаўнтлерой».

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# Фокус бяз цуду

**Прэстыж** (Prestige)

Вялікабрытанія — ЗША, 2006, каляровы, 128 хв.

**Рэжысэр:** Крыстафэр Нолан

**Ролі выконваюць:** Г'ю Джэкман, Крыстыян Бэйл, Майкл Кейн, Рэбэка Хол, Скарлет Ёхансан, Дэвід Боўі.

**Жанр:** Ілюзіяністцкая драма.

**Адзнака:** 5,5 (з 10).

Пры канцы XIX ст. два лёнданскія ілюзіяністы (Г'ю Джэкман і Крыстыян Бэйл) вядуць зацятую барацьбу. У здарэньні гіне жонка аднаго зь іх, і цяпер магі зрываюць выступы адзін аднаму, крадуць асабістыя дзёньнікі і выведваюць сакрэты чароўнай тэлепартацыі.

Груваcткія дэкарацыі, эпоха тэхнікі і кацялкоў, тэатральная публіка, прагная да відовішчаў, дзяўчына-тапеліца ў кубе з вадою, электрычнасьць, эротыка...

Менскія гледачы ўжо бачылі стужку «Ілюзіяніст» — пра закаханага мага на зломе стагодзьдзяў. «Прэстыж», пры ўсёй павазе да Крыстафэра Нолана — «Ілюзіяністу» саступае.

У сур'ёзных дэкарацыях «Прэстыжу» зьнікае чароўная атмасфэра, губляецца цуд, а пачуцьці барацьбы й нянавісьці халодныя й амаль разьлічаныя. Г'ю Джэкман і Скарлет Ёхансан, якія складаюць дуэт у алэнаўскай «Сэнсацыі», адбываюць «электрычны» нумар, дасканалы, выкшталцоны, празьмерны — відовішчны.

Крыстафэр Нолан бярэ загадкамі й электратэхнікай. І галоўная загадка электратэхнікі — Дэвід Боўі ў ролі тэхнамістыка Нікала Тэслы — зь індуктарамі й маланкамі. Зроблены Тэслай прыбор гарантуе цуды без усялякіх магічных фокусаў.

Вынікам тэхнацудаў стаецца агаломшаны глядач. Тайна «Прэстыжу» нечаканая, сур'ёзная і вельмі важная.

Але не пакідае ўражаньне, што гэта ***мэханічнае*** памнажэньне чараўнікоў.

**Андрэй Расінскі**

# Неабмежаваныя «абмежаваныя магчымасьці»

Працяг са старонкі 37.

Потым быў Пэдагагічны унівэрсытэт імя М.Танка з агромністай колькасьцю прыступак і прыступачак ды поўнай адсутнасьцю пандусаў, але там сустрэліся цудоўныя людзі, выкладчыкі і аднакурсьнікі, якія падтрымлівалі і падтрымліваюць. Кожны прыезд на сэсію (аўтобус — цягнік — вакзал — інтэрнат) — агромністая праблема, якая, тым ня менш, пасьпяхова вырашалася на працягу пяці год. Чаго гэта каштавала Галіне і яе бацькам — тэма асобная. Нарэшце, дыплём, уручэньня якога студэнты-завочнікі аддзяленьня беларускай мовы і літаратуры амаль дзьве гадзіны чакалі пад дзьвярыма аўдыторыі, дзе праходзіла нейкая важная канфэрэнцыя па псыхалёгіі з удзелам замежных дэлегатаў... Дыплём атрыманы, і ўжо распачаўся трэці год працы ў роднай Крывошынскай сярэдняй школе. Васьміклясьнікі чакаюць Галіну Фёдараўну на ўрокі роднай мовы і літаратуры, а яшчэ ж ёсьць і школьны літаратурна-этнаграфічны музэй. Першыя гады ў школе заўжды складаныя: маленькі заробак, праблемы з жыльлём і, галоўнае, дзеці, зь якімі трэба наладзіць кантакт. Тут патрэбныя жалезныя нэрвы. Спадзяюся, у Галіны ўсё атрымаецца.

## Гісторыя другая. Надзея

Мне шанцуе на цікавыя знаёмствы... Адно зь іх адбылося падчас адпачынку ў санаторыі «Вяжуці» на Маладачаншчыне. Мясьціны тут цудоўныя, санаторыя разьмешчаная ў сасновым бары, на самым беразе ракі Вяльля... Мы пазнаёміліся ў першы ж дзень адпачынку. Сымпатычная і ўсьмешлівая жанчына на вазку адразу заварожвала сваёй жыцьцярадаснасьцю і аптымізмам! Ёсьць меркаваньне, што імя чалавека вызначае яго лёс... У такім выпадку Надзея — самы адказ на ўсе пытаньні. Траўма (пералом хрыбта) здарылася амаль дваццаць гадоў таму, падчас спуску з гары Эрцог (раён Дамбаю). Не згубіць надзеі, напэўна, было складана. Актыўны і таварыскі чалавек, яна (ужо на вазку) шмат падарожнічала, пабывала на Каўказе, у Прыбалтыцы, Крыме... Падарожнічае і цяпер, хоць магчымасьць адпачыць (на жаль, толькі раз у два гады!) абмяжоўваецца санаторыяй «Вяжуці». Гэта практычна адзіная санаторыя ў Беларусі, дзе маюцца шматлікія пандусы і ліфты — жыцьцёва неабходная рэч для вазочніка.

Менск не адпускае надоўга... Тут родныя, сябры. Раней была праца ў часопісе «Акно», дзе Надзя, матэматык паводле адукацыі, займалася вёрсткай. Часопіс прыпыніў выхад празь фінансавыя праблемы (заснавальнік — «Беларускае таварыства інвалідаў»). Мае Надзя і тыпова матэматычнае, падпарадкаванае лёгіцы, хобі — крыжаванкі , якія ахвотна друкуюць многія спэцыялізаваныя выданьні. Тут спалучаецца дакладная навука (матэматыка) і словы. Тэлефонны званок. Надзін прыемны голас. Як маецеся? Усё добра, Надзя, як Вы?..

Сытуацыя з правамі інвалідаў-вазочнікаў пачала выпраўляцца. Гэтай справай займаецца такая грамадзкая арганізацыя, як ГА «Рэспубліканская асацыяцыя інвалідаў-вазочнікаў» (уключае 700 чалавек і 12 рэгіянальных арганізацый, кіраўнік — Сяргей Драздоўскі). Яна штогод праводзіць так званыя «швэдзкія зборы» — летнік на базе санаторыі «Беразіно» (Барысаў), дзе інваліды маюць шанец атрымаць вазок актыўнага тыпу «Гепард» (пры ўдзеле Міністэрства сацыяльнай абароны) і навучыцца ім карыстацца — пераадольваць бар'еры рознага кшталту. Лесьвічныя прыступкі — толькі першы крок.



На фота: «Быць Гаральдам Пінтэрам». Новы спэктакль «Свабоднага тэатру» складаецца з урыўкаў п'есаў Нобэлеўскага ляўрэата Пінтэра і лістоў беларускіх палітвязьняў.

PHOTO.BYMEDIA.NET

# пра-бел / пра-сьвет

Эсэістыка • Крытыка • Рэфлексіі


Аляксей Лявончык. У пекле Азіі ..... 27

Натальля Мяшкова. Польскі выбар беларусаў ..... 29

Сяргей Харэўскі. Рагнеда раённага падпарадкаваньня ..... 30

Сяргей Богдан. Чатырнаццаць стагодзьдзяў нянавісьці ..... 32

Алег Гардзіенка. Падарунак гісторыкам ад улады ..... 33

Гісторыя беларускіх грошай. Гутарка са Зьмітром Гулецкім 34

Дар’я Ліс. Неабмежаваныя «абмежаваныя магчымасьці» ..... 37

Фэлікс Акерман. Пошта з Трэблінкі ..... 38




## год паэзіі


Юрась Пацюпа.
Красуні, шчодрай на абяцанкі ..... 39

Віктар Жыбуль.
Калядная містэрыя ..... 39

Кастусь Севярынец.
Беларусачцы ..... 39


## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

У маленькім Чарнагорскім царстве скупшчына (дума) адмяніла навекі кару сьмерці. Народ радуецца.

**«НН». №5. 1907**






**Удакладненьне.** Аўтар крыжаванкі ў № 2, Вольф Рубінчык, шчыра перапрашае тых, хто ня змог разьвязаць заданьні 17, 19 і 20 па вэртыкалі. Трэба памяняць месцамі нумары: 17 — на 19, 19 — на 20, 20 — на 17. Тады ўсё сыдзецца.


Выказваем спачуваньні Казыры Дар’і Дзьмітрыеўне ў сувязі са сьмерцю маці — Сакаловай Іны Уладзімераўны. Ліцэісты, бацькі, настаўнікі


## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ


### ПРАЦА

**Шукаем няню** для беларускамоўнага хлопчыка (2 гады). Поўны працоўны дзень. Добрая аплата. Т.: 661-64-40

**Якасна выканаю пісьмовыя працы** па беларускай гісторыі, літаратуры, мове. Зьвяртацца загадзя. Т.: 101-03-24. Юрась

### КАНТАКТЫ

**Артур Фінькевіч!** Бяз Бога людзі не памога. Яна 14:1!!! Брат

### КНІГІ

**Прапаную кнігі:** Тарашкевіч «Беларуская граматыка» 1929, факсім., «Наша Доля» 1906, факсім., «Наша Ніва» 1906–1908, факсім., «Беларускі кнігазбор»: Каліноўскі, Баршчэўскі, Філяматы і філярэты», «Энцыкляпэдыя гісторыі Беларусі» т.1, 2, 5, Гётэ «Фаўст» ды іншае, багаты выбар, усе напрамкі беларусістыкі. Т.: 753-70-05

### ПАДАРОЖЖЫ

**Зьміцер Касьпяровіч** і Антось Астаповіч запрашаюць у падарожжа 4 лютага (нядзеля) «Гістарычная Мастоўшчына»: Мікелеўшчына—Дубна—Пескі—Белавічы—Пацавічы—Самуйлавічы Дольныя—Вялікая Рагозьніца—Крамяніца. 10—11 лютага: Вільня—Коўна—Кейданы. Т.: 292-54-58, 029-622-57-20, 029-509-12-16, 110-19-28, 029-573-88-17


# А ты падпішыся!




**Каб рэгулярна атрымліваць «Нашу Ніву»,** проста паведаміце ў Рэдакцыю свой адрас. Адначасова Рэдакцыя зьвяртаецца з просьбай ахвяраваць на выданьне. Дэталі — **старонка 25.**

Наступны нумар газэты выйдзе **16 лютага** з тэхналячных прычынаў. Перапрашаем. Чакайце нас.


Газэта «Наша Ніва» шукае добраахвотных распаўсюднікаў

зьвяртацца па т.: (017) 284-73-29, (029) 618-54-84, (029) 260-78-32

e-mail: dastauka@tut.by



**Наша Ніва**

незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
фотарэдактар — Арцём Лява
галоўны рэдактар — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
выдавец і заснавальнік — Мясцовы фонд выданьня газэты «Наша ніва»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**



© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.



12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220030, г. Менск, вул. Калектарная, 20а-112. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 2371. Газэта выдаецца 48 разоў на год.

Нумар падпісаны ў друк 23.00 31.01.2007.

Замова № .

Рэдакцыйны адрас: Калектарная, 20а-112.